Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 28 (2867)
15 ліпеня 1977 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

цана 8 кап.
Выдаецца з 1932 г.

Развітанне з морам.

Фота А. ГЛІНСКАГА.

ТВОРЧЫЯ РАБОТНІКІ—ВЁСЦЫ

Калегія Міністэрства культуры БССР, прэзідыум БРК прафсаюза работнікаў культуры, сакратарыяты праўленняў Саюза пісьменнікаў БССР, Саюза мастакоў БССР, праўленне Саюза кампазітараў БССР, прэзідыумы праўленняў Саюза кінематаграфістаў БССР і Беларускага тэатральнага аб'яднання прынялі пастанову «Аб далейшым паляпшэнні культурна-шэфскай работы на вёсцы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС».

У ёй адзначаецца, што работнікі культуры і мастацтва рэспублікі, выконваючы рашэнні XXV з'езда КПСС, праводзяць пэўную работу па ўдасканаленню культурна-шэфскай работы на вёсцы.

У ходзе рэспубліканскага этапу Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных работнікі мастацтва аказвалі дапамогу самадзейным артыстам і калектывам у стварэнні і падборы рэпертуару, правялі семінары для кіраўнікоў сельскіх культасветустаноў, ажыццяўлялі індывідуальнае шэфства над народнымі тэатрамі.

У 1976 годзе было арганізавана звыш 10 тысяч выступленняў пісьменнікаў і паэтаў на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі.

У сельскія раёны рэспублікі выязджалі творчыя групы мастакоў, якія аказвалі шэфскую дапамогу: афармлялі клубныя ўстановы, праводзілі справаздачныя выстаўкі, а таксама збіралі матэрыялы для стварэння новых мастацкіх твораў.

Павялічылася колькасць творчых сустрэч дзеячаў кіно з працаўнікамі сельскай гаспадаркі, аглядаў фільмаў на сельскагаспадарчую тэматыку.

За лепшыя паказчыкі ў культурна-шэфскай рабоце на вёсцы за апошнія шэсць гадоў 6 калектываў узнагароджаны Чырвонымі сцягамі ВЦСПС і Міністэрства культуры СССР, 6 вымпеламі і 51 дыпломамі Міністэрства культуры СССР, ЦК прафсаюза работнікаў культуры і ЦК прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі, 123 актывісты культурнага шэфства ўзнагароджаны знакам «Выдатнік культурнага шэфства над вёскай».

Зацверджаны сумесныя мерапрыемствы Міністэрства культуры БССР, Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры і творчых саюзаў, накіраваныя на паляпшэнне дзейнасці работы творчай інтэлігенцыі на вёсцы. У прыватнасці, прадугледжана:

Увесці комплекснае планаванне культурнага абслугоўвання сельскага насельніцтва тэатрамі, канцэртнымі арганізацыямі і творчымі саюзамі.

Праводзіць тыдні выяўленчага, тэатральнага і музычнага мастацтваў пад дэвізам «Майстры мастацтваў — працаўнікам вёскі»; агляды сельскай мастацкай самадзейнасці, раённыя і міжраённыя святы песні, фестывалі духавой, народнай і эстраднай музыкі, танца.

Стварыць у 1—2 буйных сельскіх гаспадарках кожнага раёна рэспублікі філіялы філармоній, дзе на падставе дагавораў арганізоўваць правядзенне пастаянных Дзён музычнага мастацтва.

Перазаключыць дагаворы сацсадружнасці з прамысловымі прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі, узмацніць іх дзейнасць у справе палітычнай і працоўнай актывізацыі працоўных, мабілізацыі намаганняў на паспяховае выкананне заданняў пяцігодкі.

Увесці ў практыку індывідуальнае шэфства работнікаў мастацтваў, членаў творчых саюзаў над сельскімі ўстановамі культуры і калектывамі мастацкай самадзейнасці, звярнуўшы асаблівую ўвагу на ўцягненне ў гэтую работу творчай моладзі.

Праводзіць стажыроўку рэжысёраў сельскіх народных тэатраў у прафесіянальных тэатрах рэспублікі.

Аказваць метадычную дапамогу ў правядзенні семінараў для кіраўнікоў сельскай мастацкай самадзейнасці, наладжваць шырокія абмеркаванні створаных імі спектакляў і канцэртных праграм.

Правесці рэспубліканскі семінар для вядучых (канферансье) канцэртных праграм калектываў мастацкай самадзейнасці.

Накіроўваць комплексныя брыгады майстроў мастацтваў, пісьменнікаў, кампазітараў, перасоўныя выстаўкі выяўленчага мастацтва і кніг у сельскія раёны рэспублікі.

Стварыць у 2—3 сельскіх раёнах рэспублікі карцінныя галерэі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў на грамадскіх пачатках.

Накіроўваць мастакоў на буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы, новабудоўлі, у калгасы, саўгасы для стварэння новых твораў выяўленчага мастацтва і аказання практычнай дапамогі ў афармленні сельскіх клубаў і дамоў культуры рэспублікі.

Прадоўжыць заняткі музычнага лекторыя для працаўнікоў вёскі Мінскай вобласці, пашырыць яго тэматыку за кошт стварэння спецыяльных цыклаў лекцый для сельскіх школьнікаў.

Праводзіць штогод у адной з абласцей рэспублікі для працаўнікоў сельскай гаспадаркі фестывалі новых мастацкіх і дакументальных фільмаў, якія не прайшлі праз кінапракат.

Арганізаваць у месцах здымак новых кінафільмаў творчыя сустрэчы з работнікамі кіно, гутаркі аб савецкім кінамастацтве, паказ прэм'ер новых кінафільмаў.

60 З КАСТРЫЧНІКАМ У СЭРЦЫ

КРОКІ ДЗЯРЖАВЫ—ГЭТА І МАЕ КРОКІ

Памяць кіруецца на паўстагоддзя назад, калі я ўжо быў піянерам, адным з васьмі юных ленінцаў на ўвесь Прылепскі сельсавет. Гэта былі тыя першыя вытокі, з якіх пачыналіся мае жыццёвыя крокі, што выяваліся хадою Кастрычніка.

У той год, калі залп «Аўроры» абвясціў усяму свету пра нараджэнне Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі, я зрабіў першыя свае крокі.

Спачатку было, вядома, толькі сузіранне. Сузіранне новага, вірлівага жыцця, якое ўладарна ступіла і на вёску. А ў сям'і вясковых настаўнікаў яно адчувалася найперш і найвыразней. Да каго як не да настаўніка прыходзілі сяляне, бо тут былі кнігі, былі газеты, былі апошнія навіны.

Калі я падрос, бацька даваў мне ў рукі колькі газет і адпраўляў да кузні, дзе заўсёды было людна. Там, на вытраляваных бярвеннях, сядзелі дзядзькі, пыхкаючы люлькамі і цыгаркамі ды мяркуючы, як яно што будзе далей. Да іх падсаджваўся я і чытаў ім навіны з газет. Хто ведае, можа, тады і зарунілася ў душы тое неспакойнае зерне любві да роднага слова, якое прывяло мяне пазней на радыё, а з цягам часу і ў літаратуру.

Далучэнне да вялікіх і малых спраў, якімі заняты былі бацькі, непрыкметна ўводзіла нас, настаўнікавых дзяцей, у абсяг жыццёвых турбот, звязаных з усталяваннем новага ладу, новай савецкай культуры, якая пачыналася для дарослых з навучання іх грамаце, як тады казалі, з лікбезу. Памятаю, як на мне ляжаў, здаецца, дробны абавязак — тры разы на тыдзень, калі ў школу па вечарах збіраліся сяляне і сялянкі з навакольных вёсак, трэба было загадзя падрыхтаваць дзве вялізныя трыццацілінейныя лямпы, каб свяцілі яны зырка, каб і падслепаватаму, ужо ў гадах чалавеку, лягчэй давалася азбучная навука.

І калі цяпер у праекце Канстытуцыі Саюза ССР чытаеш у артыкуле 45-м пра ўсеагульную адукацыю моладзі як абавязковы, гарантаваны дзяржавай мінімум, дык міжволі пераносішся ў думках на пяцьдзесят гадоў назад, калі такім дзяржаўным мінімумам былі толькі ліквідацыя непісьменнасці дарослых і пераход да пачатковай адукацыі ўсіх дзяцей.

За шэсць дзесяцігоддзяў Краіна Саветаў, а ў яе складзе і наша родная Беларусь, дасягла небывалага эканамічнага росту і духоўнага ўзвышэння. Пачынала з крокаў аршынавых, потым ішла сажнёвымі, нарэшце, кіламетровымі, каб сёння шыбаваць касмічнымі хуткасцямі «да Сонца, да зораў», здзіўляючы народы свету ўсё новымі і новымі адкрыццямі, а галоўнае, непахіснасцю свайго міралюбства, сваёй дружбы з краінамі сацыялізму, спагады да народаў, якія развіваюцца, скінуўшы нарэшце путы каланіялізму.

Усё, што збудавана на савецкай зямлі, што здабыта ў касмічных высях разняволенай Кастрычнікам волатнай энергіяй мільёнаў свабодных працаўнікоў, асветлена дараванай Леніным перспектывай перамогі камунізму. Гэта ўсё — вынік не толькі нечуванага матэрыяльнага набытку першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, але і аснова духоўнага ўзбагачэння дзесяткаў вялікіх і малых народаў, абуджаных Кастрычнікам да стваральнай дзейнасці.

Так сталася, што вось ужо 45 гадоў і я дзень пры дні працую на ніве сацыялістычнай культуры беларускага народа. А калі супастаўляеш тое, што было на пачатку гэтай маёй працоўнай дарогі, з тым, што ёсць сёння, нельга не здзівіцца, нават калі ты спакушаны касмічнымі маштабамі. Будучы нядаўна ў Магілёве і наведаўшы там зусім малады яшчэ навуковы асяродак—філіял Інстытута фізікі АН БССР, які месціцца ў адным будынку з філіялам Фізіка-тэхнічнага інстытута той жа акадэміі, я ўвачавідкі пераканаўся, як далёка сягае навука Савецкай Беларусі, калі здольна выносіць свае фарпосты на пярэдні край барацьбы за навукова-тэхнічны прагрэс.

У лабараторыі оптыка-электронных прыстасаванняў, якой кіруе кандыдат фізіка-матэматычных навук Усевалад Пятровіч Радзько, нядаўні яшчэ жыхар Шклова, я назіраў будучыню, зусім недалёкую ўжо, калі металічныя кабелі ў сувязі будуць заменены валакністымі шклянымі светлаводамі. Некалькі тысяч патокаў самай разнастайнай інфармацыі можна перадаць адным такім светлаводам. Грашовае вымярэнне эфектыўнасці цяжка нават і ўявіць пакуль. Але, калі чуеш на свае вушы слова, сказанае у адным кутку лабараторыі і імгненна перанесенае святлом у другі куток, дзіву не даешся.

Дзіва ўжо стала явай, дзякуючы таму, што, як запісана ў артыкуле 26 праекта Канстытуцыі СССР, «у адпаведнасці з патрэбамі грамадства дзяржава забяспечвае планамернае развіццё навукі і падрыхтоўку навуковых кадраў, арганізуе ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у народную гаспадарку і іншыя сферы жыцця». Дзейнасць навуковага цэнтра ў Магілёве, дзе працуе вядомае вытворчае аб'яднанне «Хімвалакно» імя У. І. Леніна ды і іншыя буйныя прадпрыемствы, яскравае таму сведчанне. Сведчанне канкрэтнай рэалізацыі магчымасцей кожнага грамадзяніна найбольш поўна выяўляць свае творчыя сілы, здольнасці і талент.

У багатым арсенале сродкаў духоўнага ўзвышэння савецкіх людзей, побач з адукацыяй, навукай, не апошняе месца належыць і літаратуры, мастацтву — рэвалюцыйнай культуры рэвалюцыйнага грамадства. Народжаная і ўзгадаваная Кастрычнікам, беларуская савецкая літаратура даўно ўжо набыла належны разгон, каб ісці нага ў нагу з жыццём народа. І калі сёй-той з пісьменнікаў альбо тая ці іншая галіна літаратурнай творчасці запавольваюць сваю хаду, адстаючы ад патрабаванняў часу, у нас ёсць кіроўваючая сіла — Камуністычная партыя, каб вярнуць іх у суладны строй творцаў, што жывуць адным клопатам, аднымі думкамі і спадзяваннямі са сваім народам, з яго авангардам — камуністамі-ленінцамі.

Для мяне, як і для ўсіх, хто прайшоў ужо ладны кавалак жыццёвай дарогі пад сцягам Вялікага Кастрычніка, гадавіна рэвалюцыі і мая глыбока асабістая гадавіна. Кіруючыся вядомым выслоўем Уладзіміра Ільіча пра яго стаўленне да розных юбілеяў, было б карысна кожнаму з нас, усёй нашай творчай арганізацыі часцей засяроджваць увагу на нядзейсненым яшчэ, на тым, чаго патрабуе ад літаратуры развітое сацыялістычнае грамадства як заканамерны этап на шляху да камунізму — высокамастацкіх твораў пра сучаснасць і яе праблемы.

Уладзімір ЮРЭВІЧ.

СЯРОД ЗЕМЛЯКОЎ

Некалькі дзён гасціў на Салігоршчыне ў сваіх землякоў паэт Максім Лужанін. Ён наведаў Чапляёўскі народны краязнаўчы музей, дзе пазнаёміўся са шматлікімі яго экспазіцыямі. Паэт перадаў музею рэдкія экземпляры плаката «Разгазім фашысцкую гадзіну», газеты «Звязда» ваенных часоў, фотаздымкі, кнігі і іншыя экспанаты.

М. Лужанін сустрэўся з выпускнікамі Чапляёўскай сярэдняй школы. Вучні і іх бацькі горача віталі свайго земляка, паднеслі букеты кветак, сфатаграфаваліся разам на памяць аб сустрэчы.

Затым паэт пабываў у роднай вёсцы Прусы і перадаў вучням Прускай васьмігадовай школы вялікую частку сваёй уласнай бібліятэкі.

Цёпла сустракалі свайго земляка рабочыя саўгаса «Новае Палессе», які вырас нядаўна на асушаных балотах, і будаўнікі новага саўгаса «Прагрэс». Рабочыя расказалі паэту аб сваіх планах, аб сацыялістычным спаборніцтве, што разгаркулася ў гонар 60-годдзя Савецкай улады.

Дарагога госця шчыра віталі і ў горадзе беларускіх шахцёраў. Адбылася сустрэча паэта ў Салігорскім райкоме КПБ і ў рэдакцыі аб'яднанай газеты «Шахцёр». Першы сакратар райкома партыі, Герой Сацыялістычнай Працы А. Дубоўскі і рэдактар газеты «Шахцёр» Ф. Скрыган расказалі аб дасягненнях сельскай гаспадаркі, аб перспектывах развіцця раёна і горада. У сваю чаргу паэт падзяліўся сваімі творчымі планамі і задумамі.

Л. ШЫРЫН.

ШАХЦЁРСКУЮ КАСКУ—ПАЭТУ...

Шахцёрскую каску і лямпу паэту ўручыла намеснік сакратара парткома «Беларуськалія» Т. Сцятая.

На гэты раз у Палацы культуры горада беларускіх шахцёраў Салігорска ўвесь вечар гучала паэзія. Тут адбыўся творчы вечар вядомага беларускага паэта Петруся Макаля.

Аб творчым шляху паэта расказаў ва ўступным слове старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, народны паэт рэспублікі Максім Танк. Паэт і перакладчык Браніслаў Спрынчан, заслужаная артыстка БССР Ганна Рыжкова пазнаёмілі аматараў паэзіі з творамі Петруся Макаля.

Дзе паэзія, там і музыка. Кампазітар, народны артыст БССР Яўген Глебаў выканаў музычныя творы, напісаныя па матывах творчасці П. Макаля; у выкананні артысткі Галіны Раеўскай прагучалі песні на словы паэта.

Вёў вечар сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Чыгрынаў.

На вечары Петрусю Макалю былі ўручаны сувеніры — шахцёрская каска і лямпа.

ПРАЎДА ГІСТОРЫІ

Удзельнікі X Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю пазнаёміліся з дзеюма часткамі новага фільма-эпапеі «Салдаты свабоды» вядомага рэжысёра Ю. Озерава— стваральніка шырока папулярнай карціны «Вызваленне». Гэты твор раскрывае векапомныя старонкі гісторыі супраціўлення народаў Еўропы гітлерызму, змагання за свабоду і незалежнасць, якое ўзначальвалі лепшыя сыны працоўнага люду— камуністы. Сярод персанажаў фільма—выдатныя дзеячы міжнароднага рабочага руху, кіраўнікі падполля і партызанскай дзейнасці. Выканаўцамі роляў выступаюць артысты многіх краін сацыялістычнай садружнасці. Вобраз легендарнага партызанскага важака Югаславіі, загартаванага ў баях камуніста Іосіпа Броз Ціта стварае народны артыст Беларускай ССР Міхалай Яроменка.

Аўтары фільма прысвячаюць стужку 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

КУПАЛАВА СВЯТА ПАЭЗІІ І ПРАЦЫ

РЭПАРТАЖ З ВЯЗЫНКІ

НЕВЫКАЗНА прыгожыя краявіды ў ваколіцах Вязынкі, асабліва цяпер, у росквіце лета: на пагорках і ўзвышшах, абрамляючы ўраллівыя палеткі саўгаса імя Янкі Купалы, цямнее, асвежаная дажджом, зеляніна лесу; на вялікіх абшарах палёў буйна калосяцца жыта, ячмень, пшаніца, убіраецца ў сілу бульба, цягнецца да сонца сінявокі лён, на пашах ходзяць укормленыя пародзістыя статкі...

Паўнакроўным жыццём сучасніка, у натхнёнай, стваральнай працы, заможна і шчасліва, вялікай верай у будучыню жывуць землякі вялікага паэта зямлі беларускай, і проста цяжка паверыць, што ўсё было іначай, што тут праходзіла яго дзяцінства ў горы і нядолі. Але так было, так жылі яго бацька, маці, так жыў увесь народ, абрабаваны і заняволены. Сведкам таму — хата Луцэвічаў, у якой зараз філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы з мемарыяльным пакоем, дзе захаваны несамавітыя рэчы хатняга ўжытку той пары. Бедна, цяжка жылося чалавеку... Адсюль будучы пясняр выйшаў у свет і, адчуўшы ў палёце моц крылаў, паклікаў за сабой людзей — паклікаў на барацьбу за права людзьмі звацца. За тое сэрцы людскія поўныя любові і павагі да яго, за тое людзі будуць удзячныя яму заўсёды.

...Раніца 10 ліпеня. У купалаўскім мемарыяльным комплексе і запаведніку рыхтуюцца сустракаць далёкіх і блізкіх гасцей. На маляўнічых палянах рэпеціруюць харавыя і танцавальныя калектывы, іграюць аркестры, разгортваюцца кніжныя лаўкі.

Гаспадары — дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы Аляксей Кулакоўскі і загадчык філіяла Леанід Хадкевіч—крыху непакояцца: з раніцы церушыць дробны дождж, каб не сапсаваў свята...

А людзей тым часам прыбывае ўсё больш і больш. Пад'язджаюць на легкавушках, на аўтобусах — ужо цесна на стаянцы. Валам валіць народ з электрычкі. На дарозе — дзве сустрэчныя плыні: хто накіроўваецца ў Дом-музей, а хто, пабываўшы там, спяшаецца заняць месца ля эстрады, дзе хутка пачнецца ўрачыстая частка.

На двух аўтобусах прыехала вялікая група беларускіх пісьменнікаў разам з прадстаўнікамі братніх рэспублік. Шчырай вітальнай песняй іх сустракае самадзейны хор, на мосце цераз Вязынку дарагім госцям дзяўчаты падносяць хлеб-соль. Настае хвалюючы момант ускладання жывых кветак да помніка паэту, на пастаменце якога золатам гараць прарочыя, акрыленыя словы, што на нашых вачах становяцца цудоўнай явай:

З Масквы, з Крамля хадою
ўдумнай,
Усенароднай, чалавечай,
Праз поле, поплавы, буруны
Ідзе, таварышы, камуна
На свеце шчасце
ўпекавечыць!

— Свята паэзіі і працы на радзіме Янкі Купалы стала добрай традыцыяй, — гаворыць, адкрываючы ўрачыстасць, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, народны паэт Беларусі Максім Танк. — А сёлета яно мае асабліва глыбокі сэнс, бо праходзіць напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, у дні, калі абмяркоўваецца праект новай нашай Канстытуцыі, якая падводзіць вынікі велічных здзяйсненняў і дасягненняў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі, культуры нашай краіны і паказвае яскравы прыклад усім народам у барацьбе за светлае заўтра, за шчаслівае жыццё.

Паэзія і праца заўсёды ішлі поруч, падкрэслівае ў сваім уступным слове М. Танк. А паэзія Янкі Купалы прасякнута вялікім аптымізмам, верай у чалавека працы, пафасам Кастрычніцкай рэвалюцыі і новага жыцця. Нездарма яна ўвайшла ў залаты фонд не толькі беларускай, але і ўсёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Яна заўсёды была і назаўсёды застанецца на ўзбраенні нашага народа.

Свята паэзіі і працы на радзіме Янкі Купалы абвяшчаецца адкрытым. Урачыста гучаць гімны Савецкага Саюза і Савецкай Беларусі. Свята працягваецца.

А дождж-назола не перастае. Прэзідыум на эстрадзе вымушаны прыкрывацца парасонамі. Парасонамі расквечаны лаўкі перад эстрадай і ўся паляна, на якой сабраліся тысячы людзей. Агульны настрой і гасцей, і ўсіх удзельнікаў свята выказаў маскоўскі паэт Марк Максімаў, даўні друг многіх беларускіх пісьменнікаў, лёс якога звязаны з беларускай зямлёй яшчэ ад гадоў вайны, калі яму давялося ў шэрагах беларускіх партызан змагацца з ворагам. Ён сказаў:

— Нашу братэрскую дружбу, як і нашу любоў да Купалы, да яго паэзіі — ніякай вадой не разліць!..

Шчырую любоў да беларускай зямлі, што ўзгадавала і дала свету вялікага народнага паэта-інтэрнацыяналіста, пачуцці братняй дружбы да беларускага народа-працаўніка выказваюць у сваіх выступленнях госці з Украіны — паэты Раман Лубкіўскі і Сцяпан Літвін, літоўскі паэт Генрыкус Чыгрэус і старшыня Укмергскага райвыканкома Літвы А. Пярэдніс.

Натхнёная творчая праца савецкага чалавека нараджае паэзію, паэзія адухаўляе, акрыляе чалавека, кліча яго на новыя працоўныя подзвігі. Такая дыялектычная сувязь між паэзіяй і жыццём сёння, на гэтым вялікім святкаванні з выпадку 95-годдзя з дня нараджэння паэта, асабліва яскрава прасвечваецца ў творчасці Янкі Купалы, у адносінах да яе і да памяці паэта яго землякоў.

— Купала пакінуў нам у спадчыну мастацкі летапіс дзвюх эпох, — гаворыць старшыня калгаса «Светлы шлях», Герой Сацыялістычнай Працы У. Калачык. — Гэта два розныя светы, як ноч і дзень. Дакастрычніцкі час старым людзям успамінаецца як далёкі цяжкі сон. Цяпер жа ў «Светлым шляху» вольная праца хлебароба дае багаты плён, якому не мог бы не парадавацца паэт, каб дажыў да нашых дзён, — па 45 цэнтнераў збожжа збіраюць у «Светлым шляху» з гектара, не тое, што 45 пудоў, як калісьці ў гады паэтавага дзяцінства, калі селяніну ўжо з восені не хапала хлеба.

Пра вялікія змены, што адбыліся за гады Савецкай улады на радзіме Янкі Купалы, з гонарам гаворыць рабочая Радашковіцкага прамкамбіната Таццяна Шынкарэнка. Ідучы на работу, яе таварышы праходзяць каля помніка песняру, і кожны дзень нібы сустракаюцца з ім, і ён для іх нібы жывы, бо жыве ў іх сэрцах. Таму і працуюць яны па-ўдарнаму, і заўсёды ля падножжа яго помніка ляжаць жывыя кветкі.

Нібы працягваючы думку сваіх землякоў, нашчадкаў вялікага Купалы, брыгадзір вытворчага ўчастка саўгаса імя Янкі Купалы, Герой Сацыялістычнай Працы Ф. Комар падкрэслівае, што іначай і не можа быць, што зямлю гэтую трэба любіць і шанаваць ужо за тое, што яна дала свету вялікага песняра, выказніка самых запаветных думак і пачуццяў народа.

Выступаюць беларускія паэты, песняры нашага часу, прадстаўнікі ўсіх пакаленняў, што нясуць Купалаву эстафету, Купалава слова, якое служыць вялікай справе пабудовы камунізму ў нашай краіне. Вершы, прысвечаныя Купалу, Радзіме, нашай сённяшняй светлай яве, партыі, рэвалюцыі, чытаюць Д. Бічэль-Загнетава, А. Вярцінскі, П. Макаль, Я. Янішчыц, Р. Барадулін, С. Шушкевіч, Р. Баравікова, А. Грачанікаў, У. Скарынкін.

Сувязь паэзіі і працы на свяце была падкрэслена і тым, што тут былі падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва сярод калектываў працаўнікоў сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту і гандлю Маладзечанскага раёна. Ва ўрачыстай абстаноўцы пераможцам былі ўручаны пераходныя Чырвоныя сцягі.

Пасля ўрачыстай часткі эстрадай завалодалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Мінска, Маладзечна і Маладзечанскага раёна, Латвійскай ССР.

Закончыць гэты рэпартаж хочацца словамі Якуба Коласа, сказанымі пра Купалу:

«Яго песні будуць пераходзіць з пакалення ў пакаленне. Яго вершы будуць узорамі для новых песняроў беларускага народа. Яны будуць абуджаць у сэрцы людзей лепшае пачуццё і лепшыя чалавечыя імкненні да ясных сонечных дзён, аб якіх часта пісаў паэт і дзе заўсёды будуць праўда і справядлівасць».

У. АНІСКОВІЧ.



Хлеб-соль народнаму паэту рэспублікі Максіму Танку ад імя землякоў песняра ўручае дырэктар саўгаса імя Янкі Купалы А. Гоман.

Выступае Данута Бічэль-Загнетага.



Кветкі да помніка песняру.

Аўтограф дае чытачу паэт Анатоль Вярцінскі.

Выступае харавая група ансамбля песні і танца з Маладзечна.



1947 год. Будуецца Мінскі трактарны завод.



1947 год. Старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна К. П. Арлоўскі праводзіць нараду брыгадзіраў-паляводаў.

1949 год. Палявыя работы ў адным з калгасаў Барысаўскага раёна.

1950 год. Калгасніца, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кіраўнік хору калгаса імя Леніна Рэчыцкага раёна Т. К. Лапаціна з групай удзельніц хору.

Фота прапанавана радзіцы Тамарай Чарнуха, супрацоўніцай Беларускага дзяржаўнага архіва кіна-фота- і фонадакументаў.

КРОКІ КАСТРЫЧНІКА

ГОД 1946 — ГОД 1950

Каменціруе Эдуард Аляксандравіч КАРНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава.

Ідзе паважна пераможац—
Бывалы, стрэлены салдат,
І думкі ў мірным падарожжы
Настроіў ён на мірны лад.
...Салдат глядзіць навокал строга—
Што натварылі чужакі!
Сляды разрухі, папялішчы,
Сады папалены, лясы.
Салдат у мыслях прыкідае—
Есць што і ёсць з чым параўнаць,
Краіна наша маладая
Крах усе можа перагнаць.

Людзі віталі салдата-пераможцу, які вяртаўся да мірнай працы. Вітаў сваім вершам і Якуб Колас, радкі з якога мы працытавалі вышэй. Руіны і папялішчы бачыў ён на роднай зямлі. Фашысцкія захопнікі нанеслі гаспадарцы і культуры рэспублікі вялікія страты.

Раны, нанесеныя вайной, трэба залечваць. І як мага хутчэй. Такую задачу паставіла на чацвертую пяцігодку ў сакавіку 1946 года сесія Вярхоўнага Савета СССР. Гэтая задача заключалася ў тым, каб «аднавіць пацярпеўшыя раёны краіны, аднавіць даваенны ўзровень прамысловасці і сельскай гаспадаркі і потым пераўзысці гэты ўзровень у значных памерах».

У Беларусі прадугледжвалася побач з аднаўленнем старых, стварэнне новых галін прамысловасці, у тым ліку трактарнай, аўтамабільнай, дарожнага машынабудавання, домабудаўніцтва.

З вялікім энтузіязмам прыступалі людзі да працы. На фабрыках і заводах рэспублікі шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва, масавым стаў рух перадавікоў вытворчасці за датэрміновае выкананне плана.

Па закліку мінскіх трактарабудаўнікоў наладжвалася шэфская дапамога калгаснікам у правядзенні палявых работ, будаўніцтве пасёлкаў і вёсак.

Беларусы пастаянна адчувалі сяброўскае плячо падтрымкі іншых савецкіх народаў. З усходу краіны няспынным патокам ішлі да нас эшалоны са станкамі і абсталяваннем.

Тытанічная работа партыі, братэрская ўзаемадапамога, гераічная праца народа зрабілі магчымым, здавалася, немагчымае: у 1948 годзе аб'ём прамысловай вытворчасці ў СССР пераўзышоў даваенны ўзровень.

У сярэдзіне лютага прадстаўнікі 110-тысячнай арміі камуністаў сабраліся на XIX з'езд Кампартыі Беларусі. На ім абмяркоўваўся ход аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі.

З'езд адзначыў, што прамысловасць аднаўляецца паспяхова. Дасягнуты значныя зрухі ў развіцці тарфяной, дрэваапрацоўчай, лёгкай, тэкстыльнай, харчовай і іншых галін прамысловасці. У рэспубліцы створаны новыя яе галіны: трактарная, аўтамабільная, дарожнага машынабудавання.

Глыбока абмяркоўваліся на з'ездзе пытанні развіцця сельскай гаспадаркі, павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных.

Рашэнні з'езда сталі канкрэтнай праграмай далейшага поступу наперад.

Заданні чацвёртай пяцігодкі былі выкананы за чатыры гады і тры месяцы. З руін падняліся Мінскі, Віцебскі, Гомельскі станкабудаўнічыя заводы, Магілёўскі трубаліцейны завод. На Ўкраіне Мінска былі ўзведзены карпусы гігантаў беларускай індустрыі—аўтамабільнага і трактарнага заводаў. У Оршы быў пабудаваны завод швейных машын, у Магілёве—лакамабільны завод, у Віцебску — дывановы камбінат, у Гродна—тонкасуконны камбінат, у Скідалі—цукровы завод.

Прамысловасць рэспублікі прайшла за гэты час шлях, які раўняўся 13 даваенным гадам.

Ўздымаліся з руін гарады і вёскі. Тысячы жыхароў перабраліся з зямлянак і баракаў у добраўпарадкаваныя дамы.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны, усенароднай барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, праблемы пасляваеннага аднаўлення народнай гаспадаркі былі галоўнымі ў творчасці пісьменнікаў, мастакоў і драматургаў. У гэты час выйшлі ў свет і атрымалі шырокае прызнанне чытачоў паэмы «Новае рэчышча» і «Толькі ўперад» А. Куляшова, «Хлеб» і «Родныя берагі» П. Броўкі, кніга вершаў «Каб ведалі» М. Танка, раман «Глыбокая плынь» І. Шамякіна, творы М. Лынькова, П. Глебкі, Я. Маўра, П. Панчанкі, І. Мележа, Я. Брыля, М. Паслядовіча, Т. Хадкевіча.

Буйнай падзеяй у літаратурным жыцці з'явілася апублікаванне ў 1947 годзе паэмы Якуба Коласа «Рыбакова хата».

У 1949 годзе адбыўся Другі з'езд пісьменнікаў БССР. Ён падвёў вынікі развіцця нашай літаратуры, акрэсліў задачы на будучае. У гэтым жа годзе ў Маскве была праведзена Дэкада беларускай літаратуры, якая з'явілася аглядам творчых сіл пісьменнікаў і адыграла важную ролю ў павышэнні іх мастацкага майстэрства.

У скарбонку савецкага мастацтва за гады чацвёртай пяцігодкі ўнеслі свой уклад кампазітары і музыканты, артысты і мастакі, архітэктары і скульптары. На кінаэкранах з поспехам дэманстраваліся такія беларускія фільмы, як «Вызваленне Беларусі», «Суд народа», «Канстанцін Заслонаў», «Дзеці партызана».

Масавы характар набыла мастацкая самадзейнасць.

Паспяхова выканаўшы заданні чацвёртай пяцігодкі, беларускі народ аднавіў народную гаспадарку рэспублікі, у асноўным пераадолеў цяжкія вынікі нямецка-фашысцкай акупацыі. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, дзякуючы братняй дапамозе працоўных іншых саюзных рэспублік, з руін і папялішчаў падняліся гарады і вёскі, былі адноўлены і пабудаваны тысячы прадпрыемстваў, значных поспехаў дасягнула сельская гаспадарка.

Па аб'ёму вытворчасці індустрыя рэспублікі пераўзышла даваенны ўзровень.

Чацвёртая пяцігодка — гістарычны рубеж, пераадолеўшы які наша рэспубліка стала больш моцнай. Беларускі народ рыхтаваўся да новых здзяйсненняў. І, як пісаў у той час Якуб Колас,

Краіна Саветаў,
Паўстала над светам,
Як новае сонца зямлі.
Ні громы, ні буры,
Ні грозы-віхуры
Адолець яе не змаглі.
У постаці гордай
Стаіць яна цвёрда,
Як волат, як міру снага.

У АДКАЗ НА КЛОПАТЫ

ГАДОЎ колькі назад я, тады студэнт-практыкант універсітэта, па заданню рэдакцыі прыехаў у вёску Луцкаўляны Гродзенскага раёна. Вёска як вёска і людзі самыя звычайныя. У той раз расказалі і паказалі мне, чым багаты калгас, пазнаёмілі з планамі на бліжэйшыя гады.

Планы прывабілі больш. Але цяпер, шчыра прызнаюся, — цяжка мне было ў іх тады паверыць.

І вось праз колькі гадоў я зноў наведаў тыя мясціны, пабачыў знаёмых людзей, пагаварыў са старшынёй калгаса, цяпер Героем Сацыялістычнай Працы, Пятром Іосіфавічам Дзеньшчыковым. І што найбольш уразіла — не пазнаў я ранейшых Луцкаўлянаў. Акуратныя, двухпавярховыя домікі-катэджы з балконамі, з кветкамі, з газонамі пад вокнамі. Жывуць у іх калгасныя спецыялісты: механізатары, жывёлаводы. Ярка гарэлі казачныя пеўні на вітражы дзіцячага садзіка-ясляў.

«За няпоўных трыццаць гадоў калгас «Авангард» дасягнуў такіх поспехаў, пра якія нават і не марылі нашы старажылы», — гаварыў мне заслужаны ветэран калгаса, пенсіянер Антон Антонавіч Рукша.

І Антон Антонавіч Рукша, і многія іншыя калгаснікі, разважаючы пра свой сённяшні лёс, найперш казалі цёплыя словы аб Савецкай уладзе, якая прынесла ім вызваленне ад белапольскіх акупантаў у памятны верасень 1939 года.

Ужо тады асноўны закон жыцця — Канстытуцыя СССР 1936 года — карэнным чынам змяніў лёс кожнага тутэйшага селяніна. Узяць бы таго ж Пятра Іосіфавіча Дзеньшчыкова — цяперашняга старшыню. Не маючы сваёй зямлі, батрачыў ён некалі на панскіх надзелах.

Сёння Пятра Іосіфавіча Дзеньшчыкова ведаюць ва ўсіх кутках Беларусі як гаспадарлівага чалавека, які вывеў калгас у перадавыя, зрабіў яго мільянерам. Ведаюць яго і за межамі рэспублікі: у Расіі, на Украіне, у Літве. Ён, колішні батрак, удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы, колькі гадоў запар выбіраўся дэпутатам у вышэйшы кіруючы орган краіны — Вярхоўны Савет СССР.

Ці не паказальны факт сапраўднай савецкай дэмакратыі.

Думаючы аб праекце новай Канстытуцыі СССР, мне, мабыць, нездарма прыгадалася гэта апошняя паездка ў «Авангард», бо там убачылася сённяшняя ява вясковага жыцця.

І вельмі правільна сказана ў праекце Канстытуцыі СССР: **«Вытокамі росту грамадскіх багацціяў, дабрабыту народа і кожнага савецкага чалавека з'яўляецца свабодная праца людзей».**

Мне здаецца, што артыкул 60 праекта новай Канстытуцыі, дзе сказана, што **«грамадзяне СССР маюць права на працу»** варта б дапоўніць словамі: **«Ухіленне ад грамадска-карыснай працы расцэньваецца як антыграмадскі ўчынак, які патрабуе суровага асуджэння».**

На Захадзе апошнім часам ідэолагамі антыкамунізму раздзімаецца шуміха наконт так званай абмежаванасці правоў у нашай краіне і ў краінах сацыялістычнай садружнасці. Як усё гэта падобна на пускание мыльных бурбалак, што непазбежна лопаюцца пры судакрананні з рэальнай сапраўднасцю.

Але звернемся, напрыклад, да Канстытуцыі Злучаных Штатаў Амерыкі. У ёй няма ні слова аб правах чалавека на працу, на адпачынак, на адукацыю, на медыцынскую дапамогу. З усіх 15 паправак, што былі ўнесены ў яе з 1791 па 1976 год (амаль за два стагоддзі), ні адна папраўка не датычыла эканамічных правоў. Ды хіба толькі эканамічных?

Мне прыгадваюцца сустрэчы прадстаўнікоў творчай моладзі нашай рэспублікі з маладзёжнымі дэлегацыямі некаторых буржуазных краін. Такія сустрэчы часта наладжвае ЦК ЛКСМ Беларусі. Нам заўсёды нязвыкла было бачыць здзіўленне гасцей перад самымі звычайнымі фактамі нашага жыцця, якія для нас, савецкіх грамадзян, самыя што ні ёсць натуральныя, звычайныя.

І яшчэ ў думках я звяртаюся да 27 артыкула праекта Канстытуцыі. Там сказана: **«Дзяржава клапоціцца аб ахове і памнажэнні духоўных каштоўнасцей грамадства, шырокім іх выкарыстанні для павышэння культурнага ўзроўню савецкіх людзей.**

У СССР усебакова заахвочваецца развіццё прафесійнага мастацтва і народнай мастацкай творчасці».

Пра клопаты нашай дзяржавы аб развіцці літаратуры і мастацтва гавораць шматлікія факты. Мяне, як маладога літаратара, асабліва радуе, што гэту ўвагу да нашай творчасці мы, работнікі літаратуры і мастацтва, будзем адчуваць і далей.

Сёння радасна ўсведамляць, што ў праекце новай Канстытуцыі ёсць пункт, прасякнуты клопатам аб развіцці савецкага шматнацыянальнага мастацтва. І мы, маладыя літаратары, як і ўвесь савецкі народ, адчуваючы пастаянны клопат аб сабе з боку Радзімы, з боку партыі і ўрада, будзем стараццa адказаць на яго поспехамі ў сваёй працы. А гэта значыць, добрымі, высокамастацкімі творамі.

Мне молада сёння,
мне сілы стае,
дык як жа
Радзіму
уславіць?!
...Буду сумленныя
словы
свае
з крывіначак
горача плавіць...

Г. ПАШКОЎ.

СТАРОНКА КУЛЬТАСВЕТНІКА

НЕ КОЛЬКАСЦІЮ, А ЎМЕННЕМ...

Гаворка аб павышэнні эфектыўнасці культасветработы на вёсцы, аб сацыяльнай, грамадскай функцыі сельскіх дамоў культуры, распачатая на старонках «Літаратуры і мастацтва», вельмі важная і надзённая. Сапраўды ў гэтай справе ёсць яшчэ шмат нявырашаных праблем.

Як зрабіць, каб сельскі Дом культуры стаў сапраўдным цэнтрам культурна-масавай работы, каб людзей цягнула сюды, каб кожны працаўнік мог знайсці тут занятак па душы?

Стала ўжо традыцыяй на такое пытанне адказваць адназначна: трэба, каб культурны асяродак узначальваў спрактыкаваны чалавек, які любіць сваю справу, адданы ёй. Усё гэта правільна. Канечне, вельмі добра было б, каб на чале кожнага СДК стаяў такі добры культасветнік, як А. Чайкоўскі, дырэктар Мураўскага сельскага Дома культуры Пружанскага раёна (пра сваю работу ён цікава расказаў на старонках аднаго з апошніх нумароў штотыднёвіка). Але будзем глядзець праўдзе ў вочы: пакуль што ў нас адчуваецца востры дэфіцыт вопытных кадраў культработнікаў. Дык што—сядзець і чакаць, пакуль іх стане зашмат? А клуб, Дом культуры —на замок?

Я думаю, што і пры наяўнай колькасці культасветнікаў можна рабіць куды больш, чым робіцца сёння. Справа ў тым, што арганізацыя работы нашых сельскіх дамоў культуры, сельскіх клубаў у многім патрабуе перагляду.

Я з вялікай цікавасцю прачытаў у штотыднёвіку артыкул начальніка ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкома У. Еўсяевіча «Ідзе эксперымент», дзе расказваецца аб цэнтралізацыі ў некаторых раёнах Міншчыны ўстаноў культуры, аб стварэнні так званых культурных комплексаў. Думаю, што гэта правільны шлях.

Узяць, да прыкладу, нашу Піншчыну. У раёне ёсць 22 сельскія дамы культуры і 58 сельскіх клубаў. Нямала, праўда? Гэта — з пункту гледжання колькасці. А калі паглядзець на эфектыўнасць? Пачаць з таго, што 27 сельскіх клубаў знаходзяцца ў вёсках неперспектыўных, дзе з кожным годам менее насельніцтва. Скажам, у вёсцы Трушава Ласіцкага сельскага Савета. Тут ёсць сельскі клуб, ёсць культработнік, які ў ім працуе. Не, фактычна не працуе, бо няма з кім. Такі ж малюнак у вёсках Шаломіцы, Грыўкавічы, Вешкі і многіх іншых. Такім чынам, некалькі дзесяткаў культработнікаў у нас, па сутнасці, не займаюцца сваёй канкрэтнай справай. У выніку людзі гэтыя, аддадзеныя самі сабе, проста дыскваліфікуюцца, забываюць усё, чаму іх некалі вучылі.

Дзе ж выйсце? Думаю, што праблему ў многім можа вырашыць стварэнне культурных комплексаў. Мы прыступілі ўжо да гэтай работы ў Хойнаўскім сельсавеце, дзе ёсць сельскі Дом культуры і некалькі сельскіх клубаў. Па якому шляху мы пайшлі? Пры СДК стварылі савет, у які ўвейшлі 9 лепшых культработнікаў зоны на чале з бібліятэкарам Верай Пазоўскай. Разам яны плануюць усю культурна-масавую работу на квартал: дэталёва, па чыслах, у якім клубе якое будзе праведзена мерапрыемства. Такім чынам, загадчык сельскага клуба ўжо не адчувае сябе «сіратою», які мог разлічваць толькі на ўласныя сілы і магчымасці. Кожнае мерапрыемства — канцэрт мастацкай самадзейнасці, провады ў Савецкую Армію, тэматычны вечар, прысвечаны лепшым працаўнікам,— рыхтуецца разам. Сёння, скажам, мастацкая брыгада выступае ў СДК, заўтра ў адным сельскім клубе, паслязаўтра— у другім і г. д. Але гэтага мала. Кожны загадчык клуба час ад часу робіць справаздачу перад саветам, члены якога перад гэтым выязджаюць на месца і правяраюць, як гэты асяродак культуры працуе.

Прайшло зусім нямнога часу, як быў пачаты гэты эксперымент, а вынікі ўжо ёсць. Ажывілася работа не толькі сельскага Дома культуры, але і ўсіх сельскіх клубаў. І людзі пацягнуліся сюды, бо стала ім цікава. Яшчэ і цяпер тут успамінаюць арганізаванае культасветнікамі свята провадаў зімы, вельмі ўдалы сцэнарый якога быў напісаны членамі савета.

Я думаю, што вопыт гэты трэба распаўсюджваць.

СЕЛЬСКІ ДОМ КУЛЬТУРЫ: ПРАКТЫКА, ПОШУК

Цяпер спынюся яшчэ на адным аспекце арганізацыі культурнай работы на вёсцы. Я думаю, што нам трэба мець больш сельскіх дамоў культуры. Каб былі яны ў кожным калгасе, а не толькі сельсавеце, як цяпер. Скажу больш, у нас на Піншчыне, напрыклад, многія СДК размяшчаюцца ў будынках куды горшых, чым сельскія клубы. Напрыклад, у калгасе «Дружба народаў» у вёсцы Вулька пабудаваны выдатны клуб з глядзельнай залай на 220 месцаў, з пакоямі для гурткавай работы. А працуе тут толькі адзін чалавек — загадчык. У той жа час за дванаццаць кіламетраў адсюль у цэнтры Гарадзішчанскага сельсавета ёсць сельскі Дом культуры, будынак якога куды горшы за Вулькаўскі сельскі клуб. Працуюць тут тры культасветнікі. У першым выпадку — выдатная матэрыяльная база, але няма каму працаваць, у другім—усё наадварот.

Такі ж самы малюнак і ў калгасе імя Кірава, дзе памяшканне сельскага клуба куды лепшае, чым сельскага Дома культуры, які знаходзіцца ў другой вёсцы. Можна прывесці яшчэ некалькі аналагічных прыкладаў. Могуць спытаць, дык што ж перашкаджае выправіць становішча? Ёсць розныя перашкоды. Скажам, той альбо іншы кіраўнік у вёсцы выступае супраць таго, каб СДК перадыслацыраваўся ў іншае месца. Яму выгадней мець культработнікаў «пад рукой», каб ім можна было ў любы момант даручыць нейкае сваё заданне. Пра гэта, дарэчы, вельмі правільна пісаў у сваім артыкуле А. Чайкоўскі.

Вышэй я гаварыў аб тым, як важна ўцягнуць у арбіту сельскага Дома культуры сельскія клубы. Але ж вельмі важна, каб і СДК таксама не «варыліся», як кажуць, ва ўласным саку, каб яны ведалі, чым жывуць суседзі, пераймалі лепшае ў іх.

Наш раённы аддзел культуры вырашыў правесці 7-8 паказальных вечароў, прысвечаных рознай тэматыцы, з такім разлікам, каб кожны сельскі Дом культуры мог потым арганізаваць іх у сябе.

Зрабілі гэта наступным чынам. Сіламі раённага актыву — работнікаў раённага і гарадскога дамоў культуры, настаўнікаў—былі напісаны сцэнарыі тэматычных вечароў. Кожны з гэтых вечароў рыхтаваўся пэўным сельскім Домам культуры пры нашай дапамозе. Напрыклад, Загарадскі СДК падрыхтаваў вечар «Этапы вялікага шляху», Барычоўскі— «Героі сярод нас», Сошненскі—«Юнацтва, апаленае вайной» і г. д.

На кожны з гэтых вечароў мы запрасілі ўсіх дырэктараў сельскіх дамоў культуры раёна, якія пасля прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні сцэнарыяў, іх пастаноўкі на сцэне і г. д. Мерапрыемства гэта мы зрабілі, вядома, не дзеля «галачкі». Усе вечары-узоры былі пасля праведзены ў большасці сельскіх дамоў культуры іх уласнымі сіламі.

Я прывёў гэты прыклад, каб паказаць, як раённы аддзел культуры шукае больш эфектыўныя метады кіраўніцтва сельскімі дамамі культуры, імкнецца лепш ім дапамагчы. Магчыма, што ў маіх калег — загадчыкаў раённых аддзелаў культуры — назапашаны ў гэтай справе больш цікавы вопыт, добра было б, каб яны падзяліліся ім на старонках штотыднёвіка.

І ў заключэнне хачу зрабіць адну заўвагу, якая быццам і не мае прамых адносін да работы сельскіх дамоў культуры, але тычыцца арганізацыі ўсёй культурна-масавай работы ў раёне. Фактычна за яе стан адказвае раённы аддзел культуры. Ён павінен быць штабам, ад якога б цягнуліся прыводныя рамяні ў кожны асяродак культуры. Але ж у штабе гэтым працуюць фактычна толькі два чалавекі — загадчык ды інспектар, які звычайна заняты чыста канцылярскай работай: складаннем розных справаздач, даведак, а часам выступае проста ў ролі машыністкі.

Не, я не скарджуся, не дамагаюся новых штатных адзінак. Але адзін аспект ва ўсёй гэтай справе прымушае здзіўляцца. Чаму загадчыкі аддзелаў культуры розных раёнаў пастаўлены ў розныя ўмовы? Напрыклад, на Піншчыне 190 устаноў культуры. Прыкладна столькі ж, скажам, у Баранавіцкім, Пружанскім і некаторых іншых раёнах. Але ёсць раёны, дзе клубаў, дамоў культуры і бібліятэк удвая меней, а штаты раённага аддзела культуры і РДК такія ж, як і ў нас (і зарплата таксама). Я думаю, што тут павінен быць нейкі дыферэнцыраваны падыход. Ад гэтага справа толькі б выйграла. Скажам, у калгасах колькасць адміністрацыйнага саставу і яго аплата пастаўлены ў залежнасць ад плошчы зямельных угоддзяў.

На гэтым я і пастаўлю кропку ў сваім лісце ў рэдакцыю.

Д. ЛЕМЯШЭЎСКІ,
загадчык аддзела культуры Пінскага райвыканкома.

МАГЧЫМАСЦІ ПАЭТЫКІ І ПРАЎДА ПЕРАЖЫТАГА

Аб творчасці Еўдакіі Лось

Гэты артыкул быў падрыхтаваны, калі прыйшла сумная вестка аб раптоўнай смерці вядомай беларускай паэтэсы Еўдакіі Лось. У ім аўтар паказвае адметнасць таленту пісьменніцы, прасочвае яе вялікі творчы шлях. Мы і друкуем яго так, як ён быў напісаны, як быў падрыхтаваны ў друк яшчэ пры жыцці Еўдакіі Лось.

НЕПАЎТОРНАСЦЬ... З гэтым паняццем, з гэтай якасцю, з гэтай праблемай мы абавязкова сустракаемся, калі гаворка заходзіць пра сапраўдную паэзію, пра сапраўдны талент.

Чым найперш прывабіў нас талент Еўдакіі Лось? Думаецца, не памылюся, калі скажу: сваёй арганічнай народнасцю, шчырасцю і непасрэднасцю — эстэтычна вельмі ёмістымі, глыбока насычанымі праўдай перажытага. Гэта паэтэса — сапраўды народная. Чытаючы яе кнігі, мы ўсё больш і больш у гэтым пераконваемся.

Асабіста ў маю свядомасць яна ўвайшла першым сваім зборнікам «Сакавік» — было гэта амаль дваццаць год назад, у 1958-м. Па ўзросту і духоўнай прыналежнасці яна з таго пакалення, дзяцінства якога адабрала вайна і якое мужнела ў цяжкія пасляваенныя гады. Пра гэта расказвалі вершы: суровае дзяцінства, трагедыя вайны, цяжкасці пасляваеннай пары...

І якой толькі ў свеце бяды
Не спазнала я ў тыя гады!..

Што такое бяздом'е сцюжнае,
Што такое бяссонне мужнае,
Што такое, як есці хочацца,
Што такое, як раны сочацца...

Былі іншыя матывы — мірныя, светлыя...

Над Звонню — звон, ля Звонні — сінь:
Званочкі ладзяць карагоды...
Пад Звонню шапку ў грэчку кінь —
І шапка ўраз прапахне мёдам!

Шчырасць, асабовасць, аўтабіяграфічнасць — тэматычныя і стылявыя рысы многіх, найбольш удалых вершаў паэтэсы — складалі жыццёвую сілу і моц яе таленту. Нездарма ж ёй асабліва, на маю думку, удаюцца вершы, прысвечаныя сыну, родным — «сынок, сынок, бялюткі бацянок» (кніга «Перавал»).

Першая кніга называлася «Сакавік» — у месяцы сакавіку паэтэса нарадзілася, нават у гэтай акалічнасці, у гэтым супадзенні адбілася ўнутраная, душэўная ўстаноўка на непрыдуманае, перажытае, сваё.

На гэта яе натхніў і Пётр Усцінавіч Броўка, калі ў канцы саракавых, ці не ў сорак восьмым нават, наведаў Глыбокае, дзе, сустракаючыся з выбаршчыкамі, спаткаў маладую паэтэсу — студэнтку Глыбоцкага педвучылішча Еўдакію Лось, паслухаў яе вершы, паверыў у яе творчыя сілы і падтрымаў.

Адзіная тэма, адзіны прадмет паэзіі (лірычнай у асаблівасці) — чалавек, ягонае ўнутранае жыццё ў яго агульным значэнні для ўсіх. Сакрэт поспеху «Сакавіка», наступных кніг быў просты: аўтарка даверылася свайму ўнутранаму жыццю, пісала аб асабіста перажытым, адчутым. За радком стаяла праўда.

Разам з тым яе паэзія не стала вузкім самавыражэннем аўтара. Душэўны свет паэтэсы быў раскрыты для чалавечых радасцей і трывог, для ўсяго, што адбывалася навакол.

У творах сапраўднага мастака не можа не адлюстравацца яго час, лёс пакалення, гісторыя, усё, чым жыве народ. У гэтым дыялектыка творчасці. І тое, што паэтэса адразу вырашыла — як яна сама дакляравала — быць сама сабой, і што гэта ёй шмат у чым удалося, — добра. Грамадзянская шчырасць без натугі паядноўвалася з асабістым, прыватным, чужое са сваім, агульнае з інтымным. Гэта стала добрым грунтам развіцця, разгортвання таленту.

Таму, пэўна, голас яе не загубіўся ў хоры маладых, свежых галасоў пасляваеннага пакалення паэтаў — П. Макаля, У. Нядзведскага, М. Арочкі, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, Д. Бічэль-Загнетавай, А. Вярцінскага, С. Гаўрусёва, А. Лойкі, Я. Сіпакова, У. Караткевіча і многіх іншых. Бачыце, колькі цікавых, розных, таленавітых паэтаў з сур'ёзнай жыццёвай школай і загартоўкай дало гэта пакаленне (а я ж не сказаў аб празаіках, драматургах, публіцыстах, крытыках — іх таксама багата) — пакаленне, якое добра запомніла словы Л. Талстога: «У мастацтве самае галоўнае — сказаць нешта сваё...»

Яны з самага пачатку праявілі значную грамадскую, творчую, эстэтычную актыўнасць. Гэта былі гады казахстанскай цаліны, шматлікіх новабудоўляў, асваення космасу, творчасці, росту народнай ініцыятывы, дынамічнага духоўнага жыцця. Е. Лось была адной з выказніц свайго пакалення.

З натруджаным добра крыллем...
Яму не было ля чаго пагрэцца —
Бо коміны не дымілі...
А ўсё-такі раслі, прыгажэлі на дзіва!

Калі не было і хлеба,
Вершы пісалі пра дзень шчаслівы...
Напэўна, гэтак і трэба...
Загартаванае наша натхненне,
Яно адгарыць няскора!
Кажуць, шчаслівае пакаленне
Тое, што зведала гора.

У далейшым паэтэса яшчэ не раз будзе звяртацца — у вершах, паэмах — да тэмы лёсу свайго пакалення, аналізаваць яго ўклад у грамадскае жыццё, яго шматгранную стваральную дзейнасць.

Паэзія 60-х гадоў жыла вялікім творчым неспакоем. Яна ўсюды хацела пабываць, усюды паспець, да ўсяго дакрануцца.

У кожным імгненні паэзія ёсць,
У кожным здзяйсненні —
Яе прыгажосць.
У кожнай істоце — яе хада,
У кожнай бядоце — яе бяда.

Адкрыццё хараства жыцця ў адзінстве маральнага і эстэтычнага, праўды і прыгажосці стала галоўнай творчай патрэбай паэтэсы. Яна ўмела за асобным фактам, падзеяй, справай разгледзець веліч рэчаіснасці, стваральны характар жыцця.

Здаралася, не ўтоім, часам і так, што паэтэса абмяжоўвалася адлюстраваннем знешніх прыкмет жыцця сваіх герояў (асабліва ў некаторых так званых партрэтных вершах), не заўсёды выходзіла на значную думку, абагульненні.

Вярнуўшыся з дарогі, паэтэса гаворыць:

І клопат мой пасля дарогі ўвесь —
Забыла на спружынавым сядзенні
Пірог пшанічны, што далі мне дзесь!

Пасля гэтага думаеш: ці варта было ехаць? Так, думка прадставала часам драбнаватай—і не толькі ў яе адной. Але побач з гэтым нельга было не заўважаць другога: крытыка ў артыкулах пра Е. Лось адзначала, што «яе лепшыя творы... народжаны сапраўдным натхненнем і кранаюць сэрца арганічным спалучэннем маляўнічасці, шчырасці і музычнасці» (С. Гаўрусёў). Сапраўды, паэзія Е. Лось усё больш насычалася сацыяльнымі, маральна-этычнымі праблемамі, грамадзянскай страсцю, што бачна і ў «Палачанцы» (1962), і ў такіх кнігах, як «Людзі добрыя» (1963), «Хараство» (1965), «Галінка з яблыкам» (1974) і іншых, у тым ліку самай свежай, сёлетняй — «Лірыка ліпеня», адзначаных тым лірычным пачуццём, якое праўду жыцця ўзнімае да ўзроўню сэрца. Паэтэса ўмее пісаць буйнымі мазкамі, эмацыянальна:

Ах, Беларусь, мая ты доля,
Мая сляза і пацалунак,
Маё ў бярозках белых поле,
Мой песнямі набіты клунак!..

Тэма Радзімы—скразная ў творчасці паэтэсы. Трывалая повязь злучае яе з роднай зямлёй, продкамі, народным бытам і культурай.

Паэтыка Е. Лось ў многім была традыцыйнай. Такой, у значнай ступені, яна застаецца да сённяшняга дня.

Характэрная ёй задушэўнасць інтанацыі ўвасаблялася ў вершы напеўным, разлічаным на непасрэднае эмацыянальнае ўздзеянне, звычайным, часцей за ўсё з канкрэтным вобразам, рэалістычнай дэталлю. Той жа С. Гаўрусёў пісаў, што Е. Лось—«паэтэса мяккіх фарбаў, і прыгажосць душэўнага аблічча нашага сучасніка ёй лепш за ўсё ўдаецца перадаць у лірычным плане, без непатрэбных перавелічэнняў і перабольшванняў». Паэтэса імкнулася даказаць, якімі значнымі магчымасцямі валодае гэты плаўны, напеўны верш, здольны выразіць розныя інтанацыі.

Разам з тым, у радзе выпадкаў, ён выявіў пэўную эстэтычную «недастатковасць». Памылкай было б спрашчаць творчы шлях паэтэсы, уяўляць яго роўным і гладкім—ад перамогі да перамогі. Чытаючы паасобныя вершы пачатку 60-х гадоў, заўважаеш, як напеўнасць, задушэўнасць паэтыкі здрабняе думку, не садзейнічае яе выразнасці. Відаць, недзе ў сярэдзіне 60-х гадоў яна і сама гэта адчула і, не пакідаючы паэзіі, паспрабавала звярнуцца да іншых жанраў, да прозы.

З'яўляюцца кнігі апавяданняў, навел «Пацеркі» (1966), «Травіца брат-сястрыца» (1971), шматлікія кнігі для дзяцей.

Проза Е. Лось—проза паэтэсы, вельмі лірычная і асаблівая па сваёй стылістыцы, з рысамі «інтыму» і той своеасаблівай тонкасці ў пачуццях, якая сагравае творы, робіць іх адметна шчырымі і прывабнымі. Мне добра запомнілася апавяданне «Яська».

У Яські—так называлі ў вёсцы сямейнага чалавека Івана Казіміравіча—здарылася бяда: памерла жонка, пакінуўшы яму чатырох дзяцей—адно другога, як кажуць, не падпіме: «Стасі — дзесяць, Галюсі—шэсць, Юзіку—пяць гадкоў, а маладшай Ірэнцы ўсяго два з хвосцікам». І сам бацька нямоглы: «Пасля смерці жонкі аслабеў Яська на вочы. Прачнецца раніцай—і аж галавой круціць, як певень: левым вокам ці правым глядзіць на рэч, каб разабрацца, што перад табой—кашуля ці парткі, чапяла ці качарга. З дзецьмі цяжка. Паспрабуй, спраўся з імі ледзь не сляпы: апрані ранічкай, навары есці і накармі, памый пялёнкі, соску зрабі». Тым-сім памагалі суседзі. Пісьменніца нібыта правярае характар свайго героя, меру яго чалавечых магчымасцей, наколькі ён «чалавечны», гэта значыць, наколькі ён адчувае сваю адказнасць за сябе і за іншых.

Яська не аддае малых на выхаванне ў дзетдом. Ён добра разумее, што пры дзецях ніхто яго не можа замяніць, што бацька ў дзяцей адзін.

У гэтым героі адлюстраваліся ўяўленні пісьменніцы пра чалавечнасць, пра хараство чалавека.

Так, яе мастацтва сагрэта актыўнай любоўю да чалавека. Мне і цяпер добра помніцца яе верш «Косы»—пра жанчын, дзяўчат, што не дачакаліся з вайны сваіх мужоў і каханых:

Вясновы дым
Над горадам малым...
Кіно—дзядам,
Дзіцячы сад—малым...
А што сярэднім—з косамі, як лён,
І нагат пасівелымі з тых дзён,
Калі каналі ў полымі сады
І за вінтоўку браўся малады?
«Сярэдніх» пашкадуйце, салаўі...
Ні шчасця ў іх, ні людскае сям'і,
Ні паратунку ад таемных слёз,
Ні радасці ад кос,
цудоўных кос.
Бо тыя, для каго яны раслі,
Ляжаць, непакароныя, у зямлі.

Подзвіг народа, гераічнае мінулае, Айчынная вайна не перастаюць хваляваць паэтэсу. «Па ваенную тэму пачала пісаць куды раней, чым на ўсе іншыя»,— гаворыць яна ў артыкуле «На магіле брата». Старэйшы брат Еўдакіі Якаўлеўны Сяргей загінуў на фронце пад Кіевам, у Фаставе. «Імкнуся сказаць, — прызнаецца яна,—не толькі пра свайго брата, а і пра ўсіх братоў і бацькоў, што ваявалі на фронце і ў партызанах, цаной сваіх жыццяў здабылі перамогу, абаранілі ўладу Саветаў. Так была напісана брэсцкая рэч—«Гавораць бессмяротныя», і фастаўскі вянок, і паэма пра Хатынь, і партызанскія рэчы, і маналог пра Сотую дывізію...»

Да вайны ва Ушацкім раёне было 54 тысячы жыхароў, пасля вайны засталося 20 тысяч,—паведамляе яна ў эпіграфе да аднаго з вершаў. Услаўленню народнага подзвігу паэтэса аддала шмат сіл. Хто не памятае яе вершаў «Абеліскі», «На магіле бацькі Міная», «Вёскі, якія не ўсталі», «Беларускія хлопчыкі», «Пісьмо ў Фастаў» або «Дзяўчаты мінулай вайны»?!

Праўда жыцця, праўда перажытага, што шырокай плынню ўвайшла ў творчасць Е. Лось, рэзка павялічыла магчымасці яе паэтыкі і інтанацыі.

Даўно з поўным правам можна гаварыць пра сталую творчую індывідуальнасць паэтэсы, багаты жыццёвы вопыт, вастрыню паэтычнага ўспрыняцця, узросшы ўзровень майстэрства.

Ужо ў самых першых сваіх кнігах Е. Лось спрабуе сілы ў больш маштабным жанры—паэме. «Гавораць бессмяротныя»—гэтая паэма, напісаная ў 1961—62 гадах, прысвечана абаронцам Брэсцкай крэпасці. Аўтар у дыялогах з абаронцамі хоча раскрыць іх мужнасць, ідэйны і маральны змест подзвігу.

«Вянок», «Мая Хатынь», «Слова пра вечныя зоркі», «Мінчанка», «Высакосні год», «Мой свет», «Матчына трывога»—такія здабыткі Е. Лось у галіне паэтычнага эпасу. Паэма—адзін з самых тонкіх і складаных жанраў, які патрабуе не толькі майстэрства. Сёння, трэба сказаць, ён перажывае не самы плённы перыяд у сваім развіцці.

Паэмы Е. Лось наскрозь лірычныя, спавядальныя. Сюжэтна-апісальны элемент у іх амаль адсутнічае. Гэта шчырая размова з сучаснікам пра набалелае, мінулае і будучыню, пра тыя духоўныя карані, што лучаць чалавека з народам.

Калі я стала гараджанкай?
Пытаюся ў самой сябе.
Расла рахманай ушачаннай,
Пры ворыве і пры сяўбе.

Так, у паэме «Мінчанка» паэтэса ставіць праблему «каранёў», вытокаў, якія не павінны губляцца альбо забывацца ў наш час.

Паэзіі Е. Лось уласціва вострае адчуванне сучаснасці, клопат аб захаванні і памнажэнні нашых духоўных набыткаў.

Гледзячы на пяперашняе жытнёвае поле, яна раптам засумавала, што «ўжо не жнуць сярпамі жыта»:

Падумаюць: зашкадавала
Ды супраць тэхніні пайшла...
А я таму, што сумна стала,
Што песня з нівы уцякла.

Камбайнер свішча зухаваты,
Валкі нячэсана ляжаць...
Ужо не зведаюць дзяўчаты
Адвечнай асалоды — жаць...

Расце псіхалагічнае майстэрства, майстэрства змястоўнага падтэксту. Вось якую цудоўную мініяцюру прывезла паэтэса нядаўна з братняй Польшчы:

Звіслі ад кропель гольні,
Мокра лістам і пашам...
Шэпча мне дожджык польскі:
«Пшэпрашам, пшэпрашам!»

І я пазіраю ўрачыста
На воблакі дажджавыя,
І сэрца выстуквае чыста:
«Нех жые, нех жые!..»

Уся яго інтанацыя, стылістыка, пачуццё такту, сардэчнасці—у духу непаўторнай творчай індывідуальнасці Е. Лось.

Дні ідуць. Выходзяць новыя кнігі. Цяпер іх у яе творчым актыве, відаць, больш, трыццаці—па-беларуску і ў перакладзе на рускую і іншыя мовы.

Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ.

КАЛІ НАСТАЕ ЧАС ВЫБАРУ

ВІКТАР КАЗЬКО добра знаёмы шырокаму чытачу: яго аповесці друкаваліся ў часопісах «Новый мир», «Неман», выходзілі кнігамі ў выдавецтвах «Мастацкая літаратура» і «Молодая гвардия». Творы гэтыя, цёпла сустрэтыя і чытачом, і крытыкай, засведчылі, што ў яго асобе сучасная проза мае таленавітага пісьменніка выразнай гуманістычнай арыентацыі, са сваім адметным поглядам на свет, пісьменніка, які абвострана ўспрымае рэчаіснасць, схільны да ўзнаўлення глыбока драматычных сітуацый, да аналітычнага даследавання маральна-этычных канфліктаў часу.

Узрадавала і новая сустрэча з пісьменнікам. У кнігу «Две повести» ўвайшлі «Повесть о беспризорной любви» і «Темный лес — тайга густая», якія ўпершыню пабачылі свет на старонках «Нёмана». Новая кніга — адчувальны крок у творчым развіцці празаіка. Яна пазначана высокай культурай пісьма, культурай творчага мыслення. Аўтар выяўляе ўменне непрыкметна настраіваць чытача на хвалю не пасіўнага спачування, сузіральнасці, а зацікаўленага, актыўнага ўдзелу ў лёсе героя. Нягледзячы на тое, што тэма, да якой звярнуўся В. Казько паспяхова распрацоўваецца сучаснай літаратурай, пры знаёмстве з яго аповесцямі не ўзнікае адчування другаснасці матэрыялу.

«Повесть о беспризорной любви» — хвалюючая драматычная гісторыя пра 13-гадовага палескага хлапчука Андрэя Разорку, які ўцякае з роднага горада Клінска, уцякае ад чэрствых, раўнадушных людзей, ад уласных успамінаў пра гады ваеннага ліхалецця, ад здані чорнай нямецкай аўчаркі. Але гэта не толькі твор пра ўкрадзенае вайной маленства, пра цяжкі пасляваенны час, што даўно адышоў у нябыт. Аповесць актыўна падключае чытача да роздуму над вытокамі непераможнасці савецкага чалавека, над праблемамі гуманізму, духоўнага жыцця народа...

Пакуты Андрэя Разоркі, страціўшага ў вайну бацькоў, не ў тым, што яму часта даводзілася класціся спаць галодным. У хаце цёткі Андрэй не адчуваў сябе раўнапраўным членам сям'і. «Что может быть горше, горючее, когда понимаешь: тебя держат только из милости, тебя не кормят, а оказывают тебе милость, подают милостыню... Постель — милостыня, одежда, и солнце, и воздух... Все чужое, и ты всем чужой».

У яго шчырасць, сумленнасць не верылі. Зніклі ў суседкі грошы, атрыманыя за прададзеную карову, а віноватым зрабілі Андрэя: «Соседка с теткой охаживали его в две руки, как в каком-нибудь застенке катовали. Конечно, понять их можно: тетке такой позор, а соседка без коровы — значит, безо всего... Отступились от него только дня через два. Пропажа обнаружилась в том же соломенном матраце соседки. Но что уже было до того Андрею? Он не мог простить ни улице, ни городу, что о нем так думают». Вось ад гэтых людзей і збягае хлопчык на пошукі новага, іншага жыцця.

Высвятляючы матывы ўцёкаў, малюючы блуканні хлопчыка - праўдашукальніка, В. Казько выяўляе сталае майстэрства псіхолага. Дзядзька павучаў пляменніка быць сумленным, а сам не лічыў заганай абдурваць прадстаўнікоў райфо. Максімалісцкія, бескампрамісныя патрабаванні Андрэя ўступалі ў супярэчнасць з рэальным жыццём. Ён не мог яшчэ зразумець драматызм становішча дзядзькі-калгасніка ў пасляваенныя гады. Але выкарыстаць дадзенае яму дарослымі права на несумленныя адносіны да жыцця Андрэй не захацеў. Дзіцячая чысціня не дазволіла яму прад'яўляць свету несправядлівыя патрабаванні. Гэтая думка не дэкларуецца аўтарам, яна выяўлена ў паводзінах і ўчынках героя. У сваім стаўленні да людзей, да дзядзькі і цёткі ён празмерна строгі, але ж і сябе ён судзіць па вялікаму рахунку. Карыслівасць, эгаізм, жаданне ўзяць ад жыцця больш, чым ён мае права, не ўласцівыя Андрэю. У гэтым — крыніца яго маральнай сілы.

У аповесці пра пакуты і блуканні хлопчыка чытач знаходзіць не жаласлівую гісторыю, якая расслабляе волю і пачуцці, а суровую праўду пра чалавека і жыццё. Герой В. Казько, адмаўляючы свет бездухоўнасці, застаецца чулым, спагадлівым да чужога гора. Крыўду, народжаную душэўнай чэрствасцю блізкіх, ён не пераносіць на ўсіх, не становіцца жорсткім, помслівым. Пісьменнік па-мастацку доказна выяўляе арганічнасць развіцця характару героя ў такім менавіта кірунку. Ён знаходзіць удалыя сітуацыі, праз якія сцвярджаецца гэтая думка. Так, у трагічную часіну фашысцкай акупацыі Андрэй добраахвотна пайшоў разам з дарослымі ў канцлагер. Дарослыя праганялі яго, бо ведалі, куды іх вядуць, што іх там чакае. Але хлопчык усё роўна ішоў, толькі каб быць каля людзей. І ў гэтым быў яго паратунак. Застаўшыся адзін, ён загінуў бы галоднай смерцю, скалеў бы. А побач з людзьмі, нават у самых нечалавечых умовах, застаўся жывы. І ў часе сваіх нялёгкіх блуканняў — чыгункай, ад станцыі да станцыі — менавіта сярод людзей знаходзіць ён маральную падтрымку і надзею на будучыню. Адна з такіх спроб далучэння да сапраўднай людской супольнасці адбылася на станцыі «...нск-1». На вакзальнай сцяне Андрэй убачыў намаляваных партызан у шапках з чырвонымі стужкамі. Яны былі, як жывыя. Хлопчык нават рукою пакратаў іх. Пакратаў і ўзрадаваўся, што «и за Клинском есть добрые, настоящие люди. Значит, не пропадет он в этом мире, не затеряется. И пошел он уже по перрону от вокзала с любовью к незнакомому городу и его людям, с любовью к этому миру, с тайной надеждой, что он отыщет, встретит на своем пути не нарисованную масляными красками по каменной стене доброту и силу, а настоящую». І сустрэў! Гэта былі лётчыкі, спатканне з імі, маладымі, прыгожымі, вясёлымі, адагрэла хлопчыка, умацавала веру ў жыццё. Але да сапраўднага адраджэння было яшчэ далёка.

Герой аповесці нясе ў сваёй душы не толькі ўспамін пра дзяцінства, якога не было. Трагічны лёс тых, хто не вярнуўся з вайны, невымерным цяжарам лёг на хлапечае сэрца. «Очень много нужных ему людей исчезло из жизни. И вроде бы с каждым из них исчезал потихоньку он сам». Раскрываючы злавесны вобраз вайны праз успрыманне наіўнага, добрага хлопчыка, спазнаўшага вялікую трагедыю народнага жыцця, перажыўшага смерць родных і блізкіх, В. Казько нідзе не парушыў праўду характару. Чытача не бянтэжыць, калі Андрэй выказвае думкі, якія выходзяць за межы яго ўзросту, таму што жыццёвы вопыт — вось яна трагічная сутнасць вайны! — з узростам не звязаны. Хлопчык, у якога вайна адабрала дзяцінства, глядзеў на жыццё вачамі дарослага чалавека, хоць і заставаўся дзіцём.

У творы ёсць багата эпізодаў, сцэн, якія з поўным правам можна назваць аповесцямі ў мініяцюры. Характэрныя асаблівасці індывідуальнага творчага почырку В. Казько выявіліся ў іх вельмі выразна. Мы знаходзім тут і навізну ў падыходзе да з'яў мінулага, і арыгінальны ракурс паказу падзей вайны, і глыбокі філасофскі падтэкст. Так, напэўна, не знойдзецца чытача, якога пакіне абыякавым гісторыя Карла-Ключніка і Сцёпкі-Сцепаніды. «Немчик был Карло, полунемчик. Мать русская, а отец—немец... Отца скорей всего убили наши, а мать отказалась от сына: выметнулась война из её деревни, начали в деревню возвращаться фронтовики, мать сына за руку и—в детдом. В детдоме его никто не любил. Да и как любить сына немца, когда из-за этих немцев все детдомовцы и стали детдомовцами».

Чытаючы такія вось старонкі, міжвольна думаеш: шмат год яшчэ будзе сплачваць доўг наша літаратура народу! Не, не ўсё яшчэ сказала пра вайну наша мастацтва...

Гісторыя Сцёпкі-Сцепаніды таксама ўражвае сваім драматызмам. Сцёпка доўгі час не бачыў вакол сябе мужчын, вынішчаных карнікамі ў партызанскай зоне, і лічыў сябе жанчынай, гаварыў пра сябе, як і яны: «я пайшла», «я пад'ела», «я стамілася». Сцёпка ў дзіцячым доме «никак не мог пробиться к мужикам. А Карло подружился с ним. И ходили они в обнимку — голопузый веселый немчик, не подозревавший о своем несчастье уродиться от немца, и тихий глазастый русачок, недоумевающий, как и откуда взялись на свете мужики, не понимающий, что он тоже мужик». Якой жа яна была жахлівай, гэтая вайна, калі магчымымі былі і такія трагічныя, неверагодныя здарэнні!

Нямала хвалюючых старонак прысвечана апісанню дзіцячага прытулку, размешчанага ў горадзе паміж турмой і царквою. Гэта сюжэтная лінія — адна з галоўных у сэнсе выяўлення ідэйнай канцэпцыі твора. Менавіта тут, у прытулку, які стаў для многіх падлеткаў родным домам, і разгортваецца нябачны, але такі складаны, супярэчлівы працэс фарміравання характару героя. У сутыкненнях з падобнымі да сябе хлапчукамі, сабранымі з розных куткоў краіны, — з Робем Жукавым, з Ванькам Лісіцыным, з выхавацельніцамі («воспетками») Марыяй Пятроўнай і Віяй Аляксандраўнай і адбываецца духоўнае сталенне Андрэя.

Глыбокай, змястоўнай атрымалася і лінія ўзаемаадносін Андрэя і Тамары. 17-гадовай Тамары Нікашвілі адкрыў у жыцці каханне хлапчук, якому яшчэ і 13-ці не было. Гэта яны, беспрытульныя Рамэа і Джульета цяжкіх пасляваенных год, адкрываюць сталаму чалавеку — начальніку дзіцячага прытулку Гмыру-Павялецкаму вочы на з'явы і рэчы, у якіх ён дрэнна разбіраецца: як паводзіць сябе ў адносінах да закаханых. А яны ведалі: калі наступіў час рашучага выбару — каханне альбо нянавісць — яны выбралі высакароднае пачуццё, якое адраджае іх да новага жыцця.

Асобнай размовы заслугоўвае кампазіцыя аповесці. Падзеі ў творы пададзены ў супастаўленні двух часавых планаў. Чытач сочыць за думкамі героя пад час другога яго ўцёку з дому, за яго разважаннямі, успамінамі пра сваё жыццё ў дзіцячым прытулку і пра першыя ўцёкі. Такі прыём дапамог аўтару глыбей раскрыць драматызм лёсу хлопчыка, вытокі яго канфлікту з навакольным асяроддзем. Пра людзей, ад якіх збег Андрэй, чытач даведваецца праз яго ўспаміны. Паверыўшы герою, чытач верыць і тым ацэнкам, якія ён выносіць дзядзьку, цётцы. Імклівы рух цягніка, на платформе якога хлопчык знайшоў сабе часовы прытулак, — гэта і ёсць набліжэнне яго да сапраўдных людзей, спагадлівых, добрых, чулых да чужога гора. А кожны прыпынак, сустрэча з беспрытульнымі, з міліцыяй, з жыхарамі разбураных гарадоў, з дэмабілізаванымі байцамі — усё гэта выпрабаванне на трываласць характару, маральная праверка. Гісторыя двух уцёкаў — гэта этапы духоўнага сталення героя. Шлях хлапчука да людзей аказаўся не такім і лёгкім, спатрэбілася не адна спроба. Але чытач пераконаны, што трэціх уцёкаў не будзе.

Правёўшы чытача — услед за героем — па спаленых гарадах, пачарнелых ад пажару станцыях, В. Казько паказаў нам людзей і жыццё краіны першых пасляваенных гадоў не з параднага боку, а такім, якім яно было ў сапраўднасці. У гэтым вялікая ідэйна-мастацкая вартасць твора.

З цікавасцю чытаецца і аповесць «Тёмный лес — тайга густая», у цэнтры якой вобраз чалавека, што ўсё жыццё сцвярджаў разумныя адносіны да прыроды, а тым самым і да жыцця.

Міхась МУШЫНСКІ.

В. Казько. Дзве аповесці. На рускай мове. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

Кнігапіс

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР. Хрэстаматыя. Склалі К. Кабашнікаў, А. Ліс, А. Фядосін, І. Цішчанка. Навуковы рэдактар прафесар М. Ларчанка. Выданне другое, дапоўненае. Мінск, «Вышэйшая школа», 1977.

Пад вокладкай гэтай даволі вялікай (52,5 друкаваных аркушаў) і прыгожа афармленай кнігі (мастак У. Савіч, мастацкі рэдактар В. Валянтовіч) сабраны найбольш пашыраныя творы ўсіх жанраў вуснай народнай творчасці — каляндарна-абрадавых, сямейна-абрадавых, вясельных, любоўных, бытавых песень, лепшыя ўзоры прыказак і прымавак, загадак, казак, легенд і паданняў, гераічнага і гістарычнага эпасу. Кніга дае шырокае ўяўленне не толькі пра традыцыйны фальклор беларусаў—у ёй паказаны народны тэатр, у асобныя раздзелы выдзелены дзіцячы фальклор, вусна-паэтычная творчасць рабочых да рэвалюцыі і паэзія змагання, творчасць працоўных мас савецкага часу.

Хрэстаматыя мае багатую тэарэтычную базу—у яе ўключаны выказванні аб фальклоры класікаў марксізму-ленінізму, рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў, многіх вучоных і пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, даецца ў ёй методыка збірання фальклору.

Кніга прызначаецца ў першую чаргу студэнтам-філолагам, але яна можа стаць каштоўным набыткам многіх кнігалюбаў.

А. НІСКОВІЧ.

Г. ВАСІЛЕЎСКАЯ. Дзве дарогі. Дакументальныя аповесці. На рускай мове. Пераклад М. Марушкевіча і В. Шчапоцева. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

Дзве дарогі — гэта два кароткія, але надзвычай яркія жыццёвыя шляхі, адлюстраваныя ў дакументальных аповесцях Галіны Васілеўскай «Маланка ў начы» і «Малюнак на снезе».

Творы гэтыя выходзілі некалькімі выданнямі на беларускай і рускай мове і заслужылі прызнанне — асабліва юнага чытача. Менавіта ў першую чаргу па іх і дзеці, і дарослыя ведаюць пра жыццё і подзвіг Рымы Кунько, дзяўчынкі-падлетка, якая па закліку сэрца ўключылася ў суровую барацьбу супраць захопнікаў і загінула як герой; пра юнага партызана-разведчыка Ціхана Варана, які таксама нароўні з дарослымі змагаўся з фашыстамі і, не пашкадаваўшы дзеля перамогі над імі свайго жыцця, паўтарыў бессмяротны подзвіг Івана Сусаніна.

А. ІГНАЦЬКА.

М. ВЯРШЫНІН. Не сышліся характарамі. Сатыра і гумар. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1977.

Гэта другая кніжка інжынера Мінскага трактарнага завода Міколы Вяршыніна. Сабраны ў ёй вершы пра п'яніц і дабашыраў, а таксама жарты, дзе гэткімі ж недарэчлівымі паўстаюць пуставоны і гультаі. Аўтар не толькі выяўляе тую ці іншую адмоўную з'яву ў жыцці, выносіць яе, як кажуць, на свет божы, а імкнецца ўсяму гэтаму даць прынцыповую ацэнку з выразнай грамадзянскай пазіцыі.

В. САЕНКА.

ПАЛЫМЯНАЕ СЭРЦА. Зборнік успамінаў. На рускай мове. Бібліятэчка часопіса «Пограничник», М., 1977.

У верасні працоўныя Савецкага Саюза, сацыялістычных краін, усё прагрэсіўнае чалавецтва будзе адзначаць 100-годдзе з дня нараджэння няўломнага рэвалюцыянера, вернага леніца, першага старшыні ВЧК Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага. Сёлета ў розных выдавецтвах краіны выходзіць нямала кніг, прысвечаных вернаму рыцару рэвалюцыі, нашаму земляку. Сярод іх асабліва месца займаюць успаміны людзей, што асабіста ведалі Фелікса Эдмундавіча.

Адна з такіх кніг і папоўніла бібліятэчку часопіса «Пограничник». Аўтарамі зборніка «Палымянае сэрца» з'яўляюцца старэйшыя дзеячы рэвалюцыйнага руху, відныя чэкісты.

«Няломны бальшавік» —успаміны аднаго з кіраўнікоў польскага і рускага рэвалюцыйнага руху, выдатнага савецкага дыпламата Я. Ганецкага. Друкуюцца таксама артыкулы В. Мянжынскага «Аб Дзяржынскім», К. Варашылава «Верны саратнік Леніна», А. Луначарскага «Дзяржынскі ў Наркамасвеце» і іншыя.

Цікавыя нататкі «Якім быў Дзяржынскі», напісаныя С. Дзяржынскай, дачкой роднага брата Фелікса Эдмундавіча Уладзіслава, забітага фашыстамі ў 1942 годзе.

З гэтых матэрыялаў паўстае паўнакроўны воблік «жалезнага Фелікса», пра якога член Палітбюро ЦК КПСС Ю. У. Андропаў сказаў: «Ён... быў і застаецца для савецкіх чэкістаў прыкладам мужнасці, беззаветнага служэння справе партыі і народу».

Б. САКОЛЬСКІ.

НОЧ сакратара АБКОМА

Уладзімір КАРПАЎ

АБРАЗОК

НАВАКОЛЛЕ ахінулі цішыня і змрок. Светлым асталося толькі неба. Дый яно пачынала ўжо гусцець, і святло ішло не так ад яго, як ад раскіданых па іх хмарак, якія яшчэ купаліся ў развітальных промнях сонца. Але вось пагаслі і хмаркі, і адразу знерухомелі елкі — яны першыя прынялі на сябе цемру, што як бы ўзнялася з зямлі.

Свет навокал паменшаў, стаў таямнічы. І нельга было ўжо сказаць, што востраў вялікі, лясны, з палянамі, што на большай з іх, расчышчанай і падоўжанай — ажно паўтаракіламетровая пасадачная паласа, а на самай маленькай і пры ёй, пад бокам, — мнагалюдны штабны лагер.

І таму што дыхнула цеплынёй, а востраў клапатліва ўкрыла цемра, ён здаўся Васілю Іванавічу вельмі дарагім, якімі бываюць толькі мясціны, дзе пражыта і перажыта важнае для цябе асабіста.

Каб увесці немцаў у зман, летась за кіламетры чатыры адсюль «зрабілі» яшчэ адзін аэрадром — падманны. Лагер будавалі таксама з выдумкай. Зямлянкі капалі пад кронамі самых разгалістых дрэў, маскіравалі яловай карою, мохам. Для абкомаўскай зямлянкі перавезлі з хутара пяцісценку, урылі яе ў зямлю амаль па дах і, таксама замаскіраваўшы, пасадзілі навокал бярозкі. Над выхадамі ж мудрылі яшчэ больш, прычым па адным з іх, глыбокім, прыкрытым дзёрнам, можна было выйсці ледзь не на бераг вострава. Цяпер бы ўсё гэта рабілі, магчыма, крыху прасцей, але тады ўкладалі ў новую справу больш, чым мог падказаць вопыт.

Васіль Іванавіч успомніў гэта, паслухаў трошкі навакольную цішу і, з усмешкай ківаючы галавой, падаўся ў дом-зямлянку.

Там было цёмна — хоць выкалі вока. Ён чырканув запалкай і, несучы яе перад сабой, падышоў да стала, на якім на драўлянай падстаўцы, каб больш асвятляла наўкол, стаяла дванаццаціпалінейная лямпа з папяровым абажурам, надзетым на шкло. Кнот лямпы абвугліўся, не хацеў загарацца, і давялося сапсаваць яшчэ адну запалку.

Уцягнуўшы пах смажанай фасолі, Васіль Іванавіч павесіў на сцяну аўтамат і задаволена пацёр рукі.

— Толя! — весела паклікаў.

У дзвярах, адкуль цягнула апетытным пахам, з'явіўся апрануты ў ваеннае хлопчык — шчуплы, танкашыі, з вялікімі насцярожанымі вачамі. Выпрастаўшыся, стаў перад Васілём Іванавічам. Той ніколі не песціў яго — лічыў лішнім, дый хлопчык перажыў такое, што нават пяшчотны дотык раніў яго. Але зараз Васіль Іванавіч не стрымаўся і ўзлахмаціў яму валасы.

— Ёсць што новага для мяне, ад'ютант? — спытаўся, жадаючы раскатурхаць яго.

Толік ляпнуў павільгатнелымі лупатымі вачамі. Але тут жа падбадзёрыўся.

— Заходзіў паэт, Васіль Іванавіч, — адказаў слаба пасміхаючыся і круцячы пальцамі валасы на скроні. — Чытаў дзядзьку Бельскаму свае вершы для газеты.

— Ну і як? Спадабаліся?

— Ага. Хоць дзіўна ў іх неяк... Балоты партызанскім асфальтам называюцца, а сцяжынкі ў лесе шашою... Ён нават парад у Мінску збіраецца прымаць.

— Парад? А што ты думаеш! Паэты ўсё могуць. Бельскі дома?

— Не. Пасыльны прыбягаў па яго са штаба.

— Тады давай падсілкуемся. Нясі хутчэй сюды прыхаваную смакату. Люблю я яе, грэшны. Даўно люблю...

Узняўшыся аднекуль з глыбіні, душу яго агарнула цеплыня ўласнага дзяцінства.

Беднасць, калі ты рос у ёй і яна мінулася, таксама бывае дарагой. А вялікая сям'я Васіля Іванавіча, як ён пачаў помніць сябе, спала на палку — упокат, укрываючыся дзяругаю, з-пад якой меншы брат ледзь выбіраўся. Праўда, з васьмі гадоў ён усё-такі пачаў вучыцца ў царкоўнапрыходскай школе, але і гэта навёрстваў тым, што ўлетку пасвіў чужых кароў. Калі ж трохі падрос, грымнула вайна — «германская». Паўз вёску, па Варшаўскім гасцінцы, на захад пацягнуліся воінскія абозы, а ім насустрач — людзі з хатулямі і клункамі. Непадалёк была і чыгунка, і выпала бачыць такую колькасць салдат, мяшэчнікаў, калек і разнамасных коней, што кружылася галава — адкуль яны маглі толькі брацца?!.

А потым прыйшла і пара напаўгалодным, у лапцях, штодзень на золку мясіць гразь да Жлобіна, да вечара біць кіркаю, завіхацца з рыдлёўкай, цягаць баласт, укладваць шпалы, але затое, нягледзячы на свае шаснаццаць гадоў, быць прынятым у арцель на роўных правах з дарослымі...

Паячэраўшы і адправіўшы Толіка спаць, Васіль Іванавіч паволі падняўся з-за стала і, цьмяна адчуваючы неспакой, пацягнуўся да хрусту ў касцях.

«Парад! — зноў усплыло ў галаве. — Гм-м! Парад!..»

Вярнуўся Бельскі. Доўга выціраючы перад дзвярамі ногі, шоргаў імі аб палавічок, звінеў шпорамі.

— Няшчасце, Васіль! — паведаміў з парога. — Спалены Вялікія Гарадзячыцы. Загінула Феня Коканава. Ёсць весткі, што рыхтуюцца буйныя акцыі.

— Пачакай, — як бы прапусціў яго словы міма ўвагі Васіль Іванавіч. — Гэта праверана?

— Апрача апошняга, усё праверана.

— Не ўбераглі, значыцца!

— Як бачыш... Зараз зводку інфармбюро прынясуць. Таксама нярадасная...

Сапраўды, пастукаўшы і атрымаўшы дазвол увайсці, парог пераступіў радыст — чубаты юнак з залацістым пушком на шчоках і ясным, адданым позіркам. Як заўсёды ў такіх выпадках, акуратна папраўіў пінжак, падперазаны шырокім рэменем з кабурай, з якой звісаў бліскучы нямецкі шомпал.

— Яшчэ цёпленькая, таварыш сакратар! — далажыў, падаючы лісток паперы.— Тое ж, што і ўчора. Але па тым, як лютуюць немцы, можна меркаваць,— іх справы горшыя. — І стукнуў абцасамі.

Васіль Іванавіч прагледзеў зводку, патрымаў яе ў руцэ, нібы ўзважваючы, і перадаў Бельскаму.

— Ты чуў, што ён сказаў, Юзік?

— Ага, — ахвотна адказаў Бельскі. Аднак, бачачы, што лоб у Васіля Іванавіча разрэзала глыбокая маршчына і той, мусіць, не здаволены яго тонам, зрабіў выгляд, што нешта ўспомніў, і падаўся ў другі пакой.

Але Бельскі памыліўся: неўсвядомлены клопат пачаў турбаваць Васіля Іванавіча раней і не датычыў яго. Няшчасце ж з гарадзячынцамі і Феняй толькі зрабілі гэты клопат выразнейшым. Феню — слаўнага камсамольскага важака гарадзячынцаў было дужа шкада. Аднак праз адчутае Васілём Іванавічам шкадаванне ўжо яўна прабівалася трывога. Што гэта было так, сведчыла яшчэ адно: калі ён прачытаў зводку, неспакой і трывога яшчэ пабольшалі. Яны ўжо аб нечым папярэджвалі, нечага вымагалі. Значыцца, самі былі аб чымсьці трэцім.

Аб чым?

Узяўшы ў жменю падбародак, Васіль Іванавіч нахмурыўся. Складкі абапал яго рота рэзка азначыліся.

«Аб чым? — сярдзіта падумаў ён. — Ці не аб Мінску?..».

Пасля леташняга правалу падпольны партыйны цэнтр там не аднаўляўся: у горадзе развязаны страшэнны тэрор. Дый нямецкая служба бяспекі дасканала вывучыла структуру падполля, метады падпольшчыкаў, падрыхтавала правакатараў... Разам з гэтым не так ужо далёка ад горада, у партызанскіх зонах, дзейнічалі міжраённыя і раённыя партыйныя камітэты, змагаліся партызанскія атрады, спецгрупы. Непасрэднае кіраўніцтва падполлем стала шмат у чым залежаць ад іх. І трэба сказаць, гэта было нечаканым для гітлераўцаў і нават удыхнула свае сілы ў барацьбу.

Расшпіліўшы каўнер генеральскага кіцеля, да якога ён яшчэ не прывык, Васіль Іванавіч важка, быццам трывожныя думкі леглі яму на плечы, закрочыў па пакоі.

Ён не меў звычаю прыспяшаць натуральную хаду падзей. Не завіхаўся і сам з рашэннямі. Верыў: найважнейшае — угадаць, куды яны хіляцца і быць гатовым да няшчасцяў. Але насуперак усяму трывога ў яго ўсё нарастала і нарастала.

Прыадчыніўшы дзверы ў суседні пакой, Васіль Іванавіч гукнуў як мага спакойней у цемру:

— Юзік, ты спіш?

— А што? — хрыпла азваўся Бельскі. — Хочаш пагаварыць? Заходзь.

— Запалі святло і прачытай, калі ласка, апошні абзац зводкі. Давай абмазгуем разам...

Ён сеў у нагах на пасцель Бельскага і, панурыўшыся, пачаў слухаць, водзячы далоняй па шыі, ключыцах. Слухаў і зноў уяўляў трэцяе: ахоплены агнём Мінск, якім бачыў яго, калі пакідаў два гады назад.

— Мне ўспамінаецца, Юзік, колішняе, — сказаў ён, як толькі той кончыў чытаць. — Успомніўся і Жлобін... У дваццаць першым яго блакіравалі легіянеры Доўбар-Мусніцкага. Але ўзяць не здолелі. І калі адкаціліся, мы з бацькам рушылі ў сваё Заграддзе, якое пабывала ў іхніх руках. Баяліся, што не ўбачым нікога са сваіх. Бацька ж быў старшынёй камбеда. Але не ўгадалі. Маці з малымі перабыла навалу ў лесе... Зразумела, Юзік?

— Даходзіць, — усхвалявана адказаў Бельскі, нечаму радуючыся. — Правільна! Час падумаць і пра гэта. Пры адступленні гітлераўцы пастараюцца, канечне...

— То ж бо то, дыпламат!..

Аставацца ў зямлянцы ён ужо не мог. Захацелася ўбачыць над галавой неба, адчуць свежае паветра.

Ноч як бы абняла яго. Свежасць кранулася рук, грудзей, твару. Ён агледзеўся. На сінім, быццам зыбкім небе мігцелі зоркі і яскрава азначаўся коўш Вялікай Мядзведзіцы. Але над кронамі дрэў неба было нерухомае, без зорак. Выдавала: зорны купал там абрываецца і нешта падсвечвае яго.

«Паляць вогнішчы на падманным, — здагадаўся ён. — І зноў пачаў думаць пра Мінск: — На самай справе, што ты пры патрэбе зробіш там разрозненымі намаганнямі? Як дапаможаш людзям і ўратуеш уцалелае?».

Ён ішоў па жыцці, не збіваючыся з кроку. Адслужыўшы ў арміі, скончыў камвуз, працаваў парторгам ЦК у калгасах, дырэктарам машынна-трактарнай станцыі, першым сакратаром райкома. І заўсёды адчуваў, што значыць для справы адзінае ў сваім імкненні кіраўніцтва. Нагадалася, як незадоўга да вайны прыйшлося выводзіць адстаючы раён у перадавыя і сцягваць хутары — злыбяду, што раз'ядноўвала людзей...

— Хутары... — уголас з агідаю паўтарыў Васіль Іванавіч. — Хутары!..

З паўднёвага захаду набліжаўся перарывісты рокат. Ён набіраў сілу і клінам разразаў перад сабой цемру — уедлівы, ныючы на вастрыні кліна.

«Да нас ці далей? Гэтага яшчэ неставала!» — падумаў Васіль Іванавіч, заўважаючы, што ўзнікае адчуванне — у патыліцу і сшэрхлую спіну дыхае холадам.

А рокат насоўваўся ўжо як навала і, мацнеючы, аж зыбаў паветра. Самалёты яўна ішлі адзін за адным, і таму нейкі час стала падобна на тое, што рокат павіс над галавою, а потым пачаў падаць на зямлю.

Там, дзе святлеў краёчак неба, насустрач рокату ад зямлі ўскінуліся зыркія пошугі і бахнула некалькі разоў узапар. Пасля яшчэ і яшчэ. І кожны раз цемра, нібыта рынуўшыся на пошугі з бакоў, гасіла іх.

Калі яна апошні раз змыкалася над вогненным усплёскам, з хаты - зямлянкі паказаўся Бельскі. Задыханы падбег да Васіля Іванавіча.

— Што гэта? — папраўляючы палявую сумку, якая збілася на жывот, спытаўся ён. — У зямлянцы здавалася, што бамбяць лагер. Я баяўся, у цябе лямпа зваліцца з падстаўкі. Пайду па навіны...

— Пачакай! — папрасіў Васіль Іванавіч, але потым быццам забыўся на яго.

— Табе не кінулася ў вочы, што з Мінска ўсё часцей паступаюць скаргі? — спытаўся праз хвіліну, беручы Бельскага за партупею і гледзячы ў яго поўны твар. — Кожны сувязны прыходзіць са сваімі распараджэннямі. Твае ж пра гэта самае пішуць... А хіба на ўзроўні прапаганды? Га?

Бельскі развёў рукамі:

— Ну, давай, давай...

Ні вачэй, ні выразу твару ў Бельскага відаць не было. Васіль Іванавіч адпусціў партупею і лёганька адштурхнуў яго.

— Ладна, падначвай... Але ўсё роўна прашу, слухай... Па-мойму, во як, — ён чыркануў сябе па шыі, — во як наспела патрэба ў партыйным камітэце і друкаваным органе для Мінска!

— Каб падставіць іх пад абух і ахвяраваць лепшымі? — як бы пакпіў Бельскі.

— А ты хіба не пайшоў бы на ўсё, калі б справа тычылася жыцця людзей? — ужо ўскіпеў ён, не заўважаючы гэтага. — Толькі шчыра прашу!

— Але абыходзіліся ж дасюль.

— Калі прызнацца, мы і так познімся. У такой справе загадзя адмабілізаванымі павінны быць і мы, і іншыя. Без агульнай гатоўнасці тут нічога не атрымаецца.

— А як тады з барацьбой?

— Пры адзіным цэнтры — усё ў сваіх руках. Можна ўзрываць адно і ахоўваць другое... Дыверсіі не перашкодзяць арганізоўваць групы па ахове ўцалелых аб'ектаў і клапаціцца пра маршруты, праваднікоў і месцы, куды выводзіць людзей...

— О, дык у цябе, бадай, цэлая праграма!

— А што, і цяпер «бадай»? — нечакана падабрэў Васіль Іванавіч. — Бачыш, Юзік, новы гарком можа дыслацыравацца ў лесе! Уяўляеш? Пералапаць, калі ласка, мае аргументы і скажы пасля.

— Добра... — згадзіўся Бельскі. — Ды, здаецца, наўрад ці ёсць у гэтым пільная неабходнасць... — дадаў ён, крыху адышоўшы і, мусіць, узняўшы рукі, бо словы «пільная неабходнасць» прагучалі, як выдых.

— І няхай пераправераць там наконт гэтых самых акцый. Чуеш? — кінуў яму ўслед Васіль Іванавіч, па-

Раіса БАРАВІКОВА

Усцешна слізгане над жытам
маркотнай кнігаўкі крыло.
Я не шукаю ў пераж ытым
загубленых надзей святла.
Яшчэ разгублена нямногае,
яшчэ растрачана не ў знак,
хоць і бяжыць мая дарога
не па прамой, а наўскасяк.
Яшчэ душа мая наросхліст,
і, як знаёмую, здалёк
пад бесклапотны ветра посвіст
мяне вітае васілёк.
І не здарма! Я сэрцам рада
і гэтай кветцы, і граку,
што сочыць за маім паглядам,
прысеўшы на сухім суку,
Ах, камячок, жывы і пудкі,
ты зразумей, я тут не госць,
за кожнаю галінкай гнуткай
мая гуляе маладосць!
Я пакланюся сёння долі
ў парыве новым пачуцця,—
вядзе мяне мой лёс па полі,
як маці па жыцці дзіця!

●

Камусьці крыўды спакваля
дарую,
зласліўцу смела ў вочы я гляджу,
душой сваёю ў дабрыні шчырую,
таму так лёгка па зямлі хаджу.

А што злавацца ў годнасці
высокай?
Ёсць асалода ў слове: дараваць!
Хто не займеў душы, як свет
шырокай,
таго патрэбна проста шкадаваць.

Да ластаўкі

Дзён маіх самотных шчабятуха,
ты жалобных песень не спявай.
Крыяцамі не біся ў шыбку глуха,
не заві ў спавіты жалем май.

Быць хачу шчасліваю без меры,
дык ляці ў далёкія палі,
каб змагла я сёння на паперы
песню тваю ў словы пераліць.

Мілая, падслухай адзячоркам
і прышлі з вятрамі мне здалёк
калыханку матчыну з падворку,
дзе цвіце блакітам васілёк.

Любая, не буду я ў дакоры
за тваю вясну, за весялосць,
як узыдуць ў небе хлебазоры,
ты вярні мне з песняй маладосць.

Тую, што без жалю, без
расстанняў,
каб на днях вясёлых варажыць...
Вось хапіла б толькі мне дыхання
маладосць нанова перажыць!

Жывапіс побач

«А і вялікі жэ-ж ты дурэнь, як
пагляджу:
нічогочкі ты такого нясмысліш!
— Не — йшча, нясмыслю...»

М. Мікешын. Надпіс на карціне. XIX ст.

— Нясмыслю йшча,—і позірк
долу
цнатліва хлопец апусціў.

Хто ведае, магчыма, з поля
яна прыйшла, бо позірк цвіў
яе рамонкамі і мятай,
духмянай мятай палявой...
Яму ўцячы б, ды як падмяты
маланкай, стаў ён перад ёй.

Яны ўдваіх стаяць ля студні.
Яна — нястрыманы парыў!
Хоць дзень, здавалася б, і будні.
Ён галаву сваю схіліў,
зацяўся стоенай пружынай...
Яна бярэцца за вядро
і шчокі свецяцца ажынай,
і полымем гарыць нутро.
— Ды ты нічогочкі нясмысліш!—
І шэпт у роспачы аціх,
а ён падумаў: «Што за вішні
ля плоту, пэўна, можна з іх
йшча надавіць багата соку...»
І папярхнуўся, і знямеў...

Яна смяялася здалёку,
а ён зарою палымнеў.

Чаромхавая замяць

Як віхор завейны закружыла,
абвіла, аблашчыла, як хмель,
па табе, адчайная, тужыла,
што ж, сваволь, чаромхавая бель!

Майская, пялёсткавая замяць!
Зноў трывожыш неспакоем сны,
дай-ка я ў адказ табе на памяць
распішуся подыхам вясны.
Бо і я — ў віхурным калаўроце,
хоць юнацтва лёгкі матылёк
сцішыўся на нейкім павароце,
крылцамі памахвае здалёк.

Што рабіць, душа яшчэ смяецца
і бярэ, як некалі, ў палон
маладое, трапяткое сэрца
замяці чаромхавай агонь!

●

На балконе адзячоркам
кветкі ўвішліва палю,
як узыдзе ў небе зорка,
я слязою іх палью.
Ты, сусед, не пасміхайся,
не багата ў нас выгод!
Маёй хаты не цурайся,—
паглядзі, які гарод!
Хоць і кветкі, а расліна,
зацвілі, нібыта мак!
Я сказаць табе павінна;
ты, сусед, усё ж дзівак!
Я цябе рукою гнуткай,
як лазою абаўю...
Дык заходзь, сусед, я хутка
свае кветкі дапалю.
Хоць і ведаю, што хтосьці
будзе ўнізе ноч стаяць



і каменьчыкі са злосці
у гарод, у мой, кідаць.
Не баюся, хай кідае!
Не было б другіх нягод!
Пэўна, нехта забывае,
што высока мой гарод.

●

На адчужэнне, лютая нянавісць
за ўсмешкаю няшчыраю тваёй.
Над горадам дажджоў вясновых
навісь,
а я трывожна гавару з зямлёй.

Чаму ў прыродзе пэўнае
суладдзе:
дажджы абудзяць першае лісцё...
А чалавек жыве, жыве ў разладзе
з тым, хто гатоў ахвяраваць
жыццём!

●

Якая справа да пары
замглёных шыбак на дасвецці,
дзе звонкім смехам лашчыць
вецце
Маленькі прынц Экзюперы.

Якая справа мне да Вас?
Не пазаву, не пашкадую,
яшчэ хвіліна і ўратую
душу сваю ў каторы раз.

Мне поруч з Вамі не ісці,
бо не ўжываецца з паклонам
каханне, што лягло праклёнам
на высмяглым маім жыцці.

Сам-насам з болем і бядой,—
штукарства хітрага выснова!
Не напішу Вам больш ні слова,
ідзіце ўпэўненай хадой.

Ніяк, ні зблізу, ні здаля,
Ваш голас больш я не ўспрымаю,
і позіркам не абдымаю,
і не плыве з-пад ног зямля.

Адно: на ўсе Вашы гады
маладзіковаю каронай
у сэрца, нібы плач стазвона,
кідаю памяць назаўжды.

●

Адгукнуўся смуткам шолах
сакавітых летніх траў.
У душы гуляе сполах
абяцаных мне забаў.

Не гляджу цяпер з тугою,
як бывала, ў цёмны кут,
падзяліла лёс з другою,
падзялю і боль пакут.

Не паверу, што шчаслівы
ты ў агні яе начэй,
зноў сустрэўшы палахлівы
позірк сцішаных вачэй.

●

Іду туды, дзе луг духмяны,
дзе ў сініх рэках — невады,
шукаць твае сляды, каханы,
пакінутыя на гады.

Паходкай лёгкай, лебядзінай
тапчу сухую асаку,
на ўсё жыццё маё адзіны
ты быў і ў сэрцы, і ў радку.

думаўшы — цяжка б давялося яму без Бельскага, гатовага выклікаць агонь і на сябе.

Пацягнула к сталу, да паперы. Васіль Іванавіч, бы на гадзіннік, зірнуў на зорнае неба, што прыкметна ўзнялося вышэй, і, быццам рыхтуючыся апусціцца ў ваду, з запасам удыхнуў у сябе настылае паветра.

«Не, што ні кажы, а тут сапраўды амаль усё «за», — рашуча падсумаваў ён. — Дый каб было не так, усё роўна давялося б прызнаць, што гэта неабходна...»

Хтосьці — Бельскі ці Толя — прыкруціў кнот у лямпе. У пакоі смярдзела перагрэтай газай. Васіль Іванавіч прыбавіў святла і сціснуў далонямі скроні. Аставалася яшчэ падшукаць блізкі ад горада атрад, дзе мог бы разгарнуць сваю дзейнасць гарком, прыкінуць, ці будзе зручна сувязным прабірацца адтуль у горад. Не лішне таксама было намеціць саставу гаркома — няхай і гэта будзе прадумана к бюро.

Выняўшы з палявой сумкі карту, Васіль Іванавіч разаслаў яе на стале, разгладзіў і схіліўся над ёй.

Па звычцы Толік прачнуўся на світанні. Перш чым памыцца, наважыў праверыць, ці ўсё ў парадку ў пакоі «яго генерала». Узяўшы ліхтарык, свецячы ім у падлогу, паціху адчыніў дзверы. Убачыў непагашаную лямпу і схіленага над сталом Васіля Іванавіча. Паклаўшы галаву на рукі, той спаў. Калі рыпнулі дзверы, пацмокаў губамі і аблізаў іх. Наогул ён нярэдка заседжваўся позна — знаёміўся з данясеннямі, думаў, чытаў Леніна. Але Толік ні разу не бачыў, каб сон вось так звалі яго. Наблізіўшыся на пальчыках, хлопчык патушыў лямпу і, не знайшоўшы, што пры такіх акалічнасцях зрабіць яшчэ, шкадуючы Васіля Іванавіча, выйшаў з зямлянкі.

Неба хораша яснела. Гледзячы на яго, прасвятлеў і Толік.

«Ну проста як малы», — думаў ён паблажліва.

Яму, вядома, было няўцям, што Васіль Іванавіч заснуў так недарэчна таму, што скінуў з сябе цяжар і што для гэтага яму спатрэбіўся ўвесь яго жыццёвы вопыт. І, само сабой, не разумеў хлопчык, ды адкуль яму было такое разумець — моцны чалавек няўрымслівы і адзіны ў сваіх праяўленнях, і гэта вялікі яго дар.

У ліку выпускнікоў навучальных устаноў, што сёлета пачынаюць самастойнае творчае жыццё, — выхаванцы кансерваторыі, тэатральна-мастацкага інстытута і інстытута культуры: музыканты і артысты, дойліды і жывапісцы, скульптары і графіні, даследчыкі творчых працэсаў і гісторыкі мастацтва...

Яшчэ ўчора яны называлі сябе студэнтамі; сёння ў іх вуснах пачынае гучаць назва прафесіі, абранай свядома і сур'ёзна, якой прысвячаецца жыццё. Учора яны трымалі экзамен у сценах навучальнай установы; сёння ім даецца першае заданне ўжо самой рэчаіснасцю. Дыплом даў права—шукаць, адкрываць, асэнсоўваць і ўвасабляць задуму ў вобразах, на мове мастацтва; жыццё і толькі жыццё пацвердзіць гэтае права і засведчыць, што выбар не быў выпадковы, што прызванне вядзе чалавека па свядома вызначанаму ім шляху.

Запаўняецца першы радок працоўнай біяграфіі. Малады спецыяліст узыходзіць на канцэртную эстраду, атрымлівае ролю ў спектаклі, прымае кіраўніцтва народным ансамблем... Яму давяраюць. Аб ім клапоцяцца. У яго творчым станаўленні зацікаўлены. У патрабавальнай і добразычлівай атмасферы пачынаецца яго самастойная дзейнасць.

І асаблівым хваляваннем агортвае маладога творцу першы сход, дзе яго калегі па рабоце абмяркоўваюць праект новай Канстытуцыі СССР. Ён удзельнічае ў падрыхтоўцы да святкавання 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. І па яго работах таксама філармонія і тэатр, інстытут і майстэрня, студыя і клуб будуць меркаваць аб ходзе выканання пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце з творчай моладдзю»...

Спалучэнне прафесіянальных абавязкаў з ідэйнай мэтанакіраванасцю — вось задача нашага часу ў выхаванні маладога спецыяліста ў галіне ідэалагічнай дзейнасці. Суладдзе паміж дзелавымі якасцямі і духоўнымі інтарэсамі — вось прыкмета спецыяліста, што атрымлівае пуцёўку ў самастойны працоўны шлях.

На гэтых старонках штотыднёвіка — расказ пра апошні выпуск навучальных устаноў, якія рыхтуюць будучых дзеячаў мастацтва і культуры. Публікуецца таксама творчы партрэт аднаго са старэйшых педагогаў рэспублікі, народнай артысткі РСФСР прафесара Веры Паўлаўны Рэдліх.

МАЖОРНЫЯ ВЫНІКІ

Арыя ў канцэрце—не тое, што на опернай сцэне, дзе дэкарацыі, касцюмы, само дзеянне дапамагаюць спеваку ўвайсці ў адпаведны настрой, стварыць вобраз. І калі, гледзячы на апранутага па-канцэртнаму саліста каля чорнага паліраванага «Стэйнвэя», забываешся і бачыш змучанага душою Алека, закаханага Раберта ці па-д'ябальску прывабнага Мефістофеля, значыць перад залай — шчаслівы ўладальнік дару пераўвасаблення.

Віктар Скарабагатаў выходзіў на сцэну некалькі разоў. Спачатку пад гукі ўрачыстага духавога марша праносіў праз залу кансерваторыі вялікі барвовы сцяг. Потым, як выпускнік, атрымліваў чырвоную кніжачку дыплома з адзнакай. Потым ён, актывіст кансерваторыі, выдатнік, Ленінскі стыпендыят, перадаваў, нібы эстафету, новенькую залікоўку сакратару камсамольскай арганізацыі—для будучага, пакуль што безыменнага, першакурсніка. Нарэшце, яго выступленне заключала канцэрт, прысвечаны 37-му выпуску Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага. У выкананні лаўрэата ўсесаюзнага, міжрэспубліканскага і рэспубліканскага конкурсаў Віктара Скарабагатава прагучалі два оперныя нумары: арыя Раберта з «Іаланты» і песня Кала Бруньона з аднайменнай оперы Кабалеўскага. За кожным нюансам свежага, прыгожага барытону адчувалася не проста прафесіянальная дасведчанасць спевака: адчувалася ўдумлівае акцёрскае ўваходжанне ў вобраз. І ўсё ж — якім будзе ён у спектаклі?

Слухаючы спевы Вольгі Цішынай, што таксама скончыла кансерваторыю з адзнакай і, як Віктар, як іх аднакурснік Генадзь Чэпікаў, накіравана ў Беларускі тэатр оперы і балета, на падобнае пытанне адказаць лягчэй. Бо тыя, каму давялося пабачыць першыя спектаклі «Джардана Бруна», не маглі не адзначыць каларытна выпісаную на мастацкім палатне спектакля фігуру прадажнай і сквапнай кабеціны — удавы кніжнага гандляра. Моцны, багаты, малады голас; выразная міміка, пластыка... Без праграмы лёгка было разгубіцца, перабіраючы ў памяці нашых выканаўцаў мецца-сапранавых партый: не яна... не яна... не яна.... А ў праграмцы ж коратка значылася: «В. Цішына». Дыпламантка ўсесаюзнага, лаўрэат рэспубліканскага конкурсаў, чыё выступленне ўпрыгожыла студэнцкі справаздачны канцэрт студэнтаў на філарманічнай эстрадзе. Ужо раней вядомая па радыёзапісах і музычных тэлекампазіцыях.

Што ж, сярод выпускнікоў кансерваторыі ёсць такія, хто здолеў заявіць аб сабе яшчэ ў гады студэнцкія. У абранай прафесіі, у камсамольскай, прафсаюзнай, навуковай рабоце. Са ста дзевяноста васьмі дыпломаў, уручаных сёлета, восем — у чырвоным пераплёце. Выдатна скончылі ВНУ харавы дырыжор Наталля Каланчына, піяністкі Таццяна Ільіна і Ала Кузняцова, музыказнаўцы Вера Густава і Ніна Лінкоўская (абедзве — у ліку тых, хто атрымаў і пасведчанне аб заканчэнні прапагандысцкага аддзялення факультэта грамадскіх прафесій). Ніна — старшыня студэнцкага навуковага таварыства — на ўрачыстым сходзе была ўзнагароджана Граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР за плённую навуковую дзейнасць. Рэдкі збег знамянальных акалічнасцей: у той жа дзень Ніна Лінкоўская, вытрымаўшы апошні экзамен, была прынята ў аспірантуру.

Народная артыстка СССР дацэнт Тамара Ніжнікава сярод выпускнікоў вакальнага аддзялення.
Фота У. КРУКА.

Для паступлення ў аспірантуру Беларускай, Маскоўскай, Ленінградскай кансерваторый былі рэкамендаваны выпускнікі розных аддзяленняў. Конкурс ёсць конкурс — не ўсім, хто жадае, удаецца адразу бесперашкодна прадоўжыць вучобу па спецыяльнасці. А вось работа па спецыяльнасці гарантавана кожнаму загадзя. Свежымі сіламі папоўняцца педагагічныя і выканаўчыя калектывы рэспублікі. Выкладчыкі, салісты, аркестранты, канцэртмайстры — яны будуць працаваць у вучылішчах і музычных тэатрах, на радыё, тэлебачанні і ў філармоніі. Некаторыя вакалісты размеркаваны ў оперныя тэатры Расійскай Федэрацыі.

...Вось і справіла Беларуская кансерваторыя чарговы ўрачысты акт. Са святочным аркестрам, з гваздзікамі і ружамі, віншаваннямі і поціскамі рук. З апошнімі парадамі на дарогу ад тых, хто застаецца ў гэтых сценах і штогод дае жыццё новым і новым выпускам маладых музыкантаў. З хвалюючымі словамі ўдзячнасці прафесарска-выкладчыцкаму саставу ад тых, хто выходзіць з гэтых сцен і пачынае новы этап сваёй біяграфіі.

Фартэпіннае аддзяленне падрыхтавала сёлета 55 чалавек; 46 — аддзяленне аркестравых і 40 — народных інструментаў. Атрымалі вышэйшую адукацыю 9 вакалістаў, 21 харавік-дырыжор, 25 музыказнаўцаў, 2 кампазітары. У рэспубліцы адчувальны «голад» на музычныя кадры. Амаль дзве сотні спецыялістаў—важкі ўклад у развіццё нашага мастацтва.

Дзяржаўныя камісіі, у складзе якіх былі прадстаўнікі музычных ВНУ краіны, прад'яўлялі да дыпломнікаў высокія патрабаванні. Вынікі экзаменаў паказалі: агульны ўзровень падрыхтаванасці выхаванцаў кансерваторыі вышэйшы, чым у папярэднім годзе. І быў зразумелы непрыхаваны, па-бацькоўску шчыры гонар у прывітальных словах рэктара, народнага артыста БССР У. Алоўнікава — за тое, што такі выпуск адбыўся ў адказны час абмеркавання Праекта новай савецкай Канстытуцыі, у год святкавання вялікага Кастрычніцкага юбілею.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

У ВЯЛІКУЮ ДАРОГУ

Якім быць сёння кіраўніку самадзейнасці? Што павінен умець рабіць культасветнік? Якімі адметнымі якасцямі і рысамі валодаць? Пра гэта думалася, калі я ішла па знаёмаму Рабкораўскаму завулку ў наш Мінскі інстытут культуры. Лісткі календара адлічваюць час. Вось і сёння ўжо быў пазначаны адзін з апошніх дзён чэрвеня, а гэта значыць, што выпускнікі вышэйшай навучальнай установы сталіцы трымаюць свой апошні дзяржаўны экзамен.

Аказваецца, і «сухая тэорыя» можа быць вельмі цікавай, калі аб ёй гаварыць так, як гэта зрабілі студэнты факультэта завочнага навучання аддзялення культасветработы.

...За сталом перад дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй сядзіць засяроджаны малады чалавек. Натуральна, хвалюецца, бо клубазнаўства—гэта ж, бадай, асноўны для клубнікаў прадмет. Прыемна было слухаць адказы Віктара Манкевіча па ўсіх трох пытаннях, што пазначаны ў білеце. Ён гаварыў упэўнена, лагічна, коратка. І экзаменатары выглядалі зусім не строгімі экзаменатарамі, а проста калегамі, якія вялі цікавую таварыскую гутарку. У час адказу Віктар неаднаразова спасылаўся на вопыт клубных устаноў Светлагорска, вельмі цікава расказваў аб тым, якое месца займае сёння мастацкая самадзейнасць у горадзе маладых рабочых, гаварыў аб пэўных праблемах, што яшчэ існуюць у гэтай справе, прыводзіў прыклады з асабістай практыкі. В. Манкевіч—рабочы, артыст народнага тэатра Дома культуры Светлагорскага завода штучнага валакна, лаўрэат І Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных. Апошні экзамен здадзены выдатна. Мабыць, неўзабаве на тэатральнай афішы мы ўбачым прозвішча яшчэ аднаго маладога рэжысёра самадзейнага калектыву...

— Ну, не трэба так хваляванца,— падбадзёрвае член экзаменацыйнай камісіі Эмілія Іванаўна Шумілава студэнтку-выпускніцу Кацярыну Булавіну. — У вас пытанне такое: «Новыя савецкія святы. Методыка іх арганізацыі і правядзення». Так? Ну вось і прыгадайце, калі ласка, тыя ўрачыстасці, якія вы разам са сваімі таварышамі праводзілі.

А Каці, канечне, ёсць пра што расказаць. Яна з першых дзён будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі працуе тут дырэктарам клуба будаўніча-мантажнага цягніка—578, у які ўваходзіць і І Беларускі ўдарны камсамольска-маладзёжны атрад імя Мікалая Кедышкі. Там, на перадавой лініі жыцця, параджаюцца новыя сучасныя савецкія святы і абрады. Пра ўсё гэта і паведаміла Каця Булавіна.

— Раней я працавала мастацкім кіраўніком Гомельскага абласнога Дома настаўніка, — расказала пасля экзамена К. Булавіна.—А потым па камсамольскай пуцёўцы паехала на БАМ. І я лічу, што гэта самы шчаслівы момант майго жыцця. Я вельмі люблю сваю прафесію культасветніка. Цяпер у мяне дыплом спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі. Гэта, вядома, адказна. Я вельмі хачу, каб у нашай Залацінцы з'явілася шмат новых самадзейных калектываў, прынамсі драматычны. Праўда, пэўныя поспехі і традыцыі ў гэтай справе ў нас ужо ёсць. Напрыклад, наш вакальна-інструментальны ансамбль «Спадчына» заняў на фестывальным аглядзе ў Якуцку першае месца.

Нялёгка было вучыцца Кацярыне. Бывала, не мела магчымасці ў час выехаць на сесію ў Мінск: дарога ж няблізкая. Вось і зараз здавала пятнаццаць прадметаў запар. І ўсе — паспяхова. Мара яе здзейснілася: дзяўчына служыць справе, што стала ў яе жыцці галоўнай.

У культурна-асветныя ўстановы рэспублікі — сельскія клубы і палацы культуры, бібліятэкі і дамы народнай творчасці і самадзейнасці неўзабаве прыйдзе новае папаўненне маладых спецыялістаў. Пойдуць у самастойнае працоўнае жыццё выпускнікі семдзесят сёмага года.

— Цікава, колькі маладых спецыялістаў выправіў у шлях сёлета Мінскі інстытут культуры? — звяртаюся да Нічыпара Еўдакімавіча Пашкевіча—рэктара інстытута.

— Дыпломы нашага інстытута атрымалі сёлета 225 студэнтаў са стацыянара і 182 з факультэта завочнага навучання,—расказвае ён.—Мы выпусцілі 46 кіраўнікоў самадзейных тэатральных калектываў, 43—харавікі-дырыжоры і 318 бібліятэкараў-бібліёграфаў. Адзінаццаць з іх—чырвонадыпломнікі. Лічбы, здавалася б, унушальныя. Але ўсё ж мы не змаглі выканаць усе заяўкі на нашых спецыялістаў. Міністэрства культуры БССР прасіла даць у яго распараджэнне 147 бібліятэчных работнікаў і 40 культасветнікаў. Мы ж накіравалі адпаведна 91 і 31 чалавека. Попыт па спецыялістаў з вышэйшай кваліфікацыяй сёння вельмі вялікі. Таму, на жаль, заяўкі Белсаўпрофа мы таксама ў некаторай ступені не задаволілі.

— Нічыпар Еўдакімавіч, а дзе яшчэ будуць працаваць выпускнікі інстытута?

— Калі гаварыць канкрэтна, то ў 27-мі ведамствах рэспублікі. Мы накіравалі нашых студэнтаў на працу ў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і Міністэрства асветы БССР, у Камітэт па тэлебачанню і радыёвяшчанню і Камітэт па кінематаграфіі БССР, у Акадэмію навук БССР, у Міністэрства сельскай гаспадаркі рэспублікі, у Дзяржплан БССР, у Міністэрства аховы здароўя СССР і гэтак далей.

— А геаграфія размеркавання?

— Геаграфія даволі шырокая. Можна сказаць, што ў гэтым годзе мы поўнасцю забяспечылі спецыялістамі дадзенага профілю ўстановы культуры Мінскай вобласці. Шмат выпускнікоў паслалі ў іншыя раёны рэспублікі. Наогул, па абласцях у нас паехала 118 чалавек, у Мінску засталося працаваць 86, а за межы рэспублікі выехала тры спецыялісты.

— А ці многа студэнтаў засталося з так званымі «свабоднымі дыпломамі»?

— Не. Трэба сказаць, што сёлета мы падыходзілі да гэтага пытання некалькі інакш. У мінулым выпускным годзе ў нас з 222 студэнтаў 33 мелі «свабодны дыплом». У гэтым—з 225 ужо 18. Дадамо, што нашы выпускнікі з задавальненнем паехалі ва ўсе куткі рэспублікі. На-

прыклад, Мікалай Яфімаў, які закончыў інстытут па «выдатна», будзе працаваць дырэктарам Дома культуры калгаса імя Дзімітрава Талачынскага раёна. Калгас —вельмі добрая сучасная гаспадарка, дзе дбаюць аб культуры, клапоцяцца аб маладых спецыялістах.

У Маладзечанскі гарадскі Дом культуры атрымала запрашэнне Зінаіда Шпак. Яна будзе там дырэктарам. Многія з выпускнікоў праз месяц стануць загадчыкамі шматлікіх бібліятэк рэспублікі. Адным словам, мы сваімі выхаванцамі задаволены. Вялікага ім поспеху!

Л. КРУШЫНСКАЯ.

ТЭАТР ПАЧЫНАЕЦЦА З ІНСТЫТУТА

У цеснаватым пакоі, дзе разыгрываецца спектакль, загучаў светласумны вальс. Кранаючая, напаўзабытая мелодыя змешваецца з ледзь адчувальным водарам язміну, выклікаючы ў памяці складаны ланцужок глыбокаасабістых, дарагіх асацыяцый... Раптам яркі прамень асвятляе сцэнічную пляцоўку: старое трумо, карункавыя абрусы на сталах, свежыя букеты чэрвеньскіх кветак, зроблены «пад восень» жывапісны заднік, зграбныя постаці сясцёр Прозаравых. Кожная з іх пазнаецца па традыцыйным колеры сукенкі: сінім, чорным, белым. Якімі ж паўстануць яны зараз — новыя паслядоўніцы шматлікіх чэхаўскіх Вольг, Маш, Ірын?..

«Тры сястры» — адзін з дыпломных спектакляў сёлетняга, 28-га выпуску акцёрскага аддзялення Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Мастацкія кіраўнікі курса — народная артыстка РСФСР, прафесар В. Рэдліх, заслужаны артыст БССР А. Мілаванаў, педагог А. Карсакоўскі паставілі са студэнтамі, адпаведна, драму Хелман «Лісічкі», ужо названую п'есу Чэхава, «Гандлярку і паэта» Шамякіна (інсцэніроўка Э. Герасімовіч). Гэта ўсяго толькі інфармацыя аб падагульненні чатырохгадовай студэнцкай вучобы, нейтральная інфармацыя. І яна не выклікае таго двоістага пачуцця, якое магло ўзнікнуць ад больш дэталёвага знаёмства з чарговым акцёрскім выпускам.

Мабыць, і не варта браць у разлік некаторыя знешнія, выпадковыя дэталі гэтага знаёмства. Але ж двоістасць пачуцця магла нарадзіцца ўжо каля рэкламнай афішы: размаляваны кавалак толю на дашчанай «шырме» перад інстытуцкім фасадам адначасова і захапляў студэнцкай дасціпнасцю, і выглядаў вартым жалю на фоне ВНУ, якая рыхтуе мастакоў плаката. Змешаныя ўражанні падмацоўвала і так званая «тэатральная зала»: занадтая камернасць памяшкання стварала, з аднаго боку, асаблівы давер у кантакце акцёраў з гледачом, з другога ж — пазбаўляла дыпломнікаў неабходнага адчування нармальнай сцэны, а ўсіх іншых — элементарнага глядацкага камфорту. Уражвала свежасць, непадабенства трактоўкі вядомых сцэнічных вобразаў маладымі акцёрамі, І ў той жа час здаваліся недаравальнымі сляды вучнёўства ў старанна прадэкламаваных рэпліках, адыграных рухах і жэстах. Кажуць, інстытут выпускае «паўфабрыкаты»; якая «страва» атрымаецца з іх — залежыць ужо ад таго тэатральнага калектыву, куды накіроўваецца выпускнік. Так што прагназаваць творчы лёс нованароджаных акцёраў не возьмецца нават той, хто сачыў за імі ад прыёмных экзаменаў да ўрачыстага выпускнога акту. А вось пра ўплыў на гэты лёс складаных умоў, у якія трапіў курс, падумае і чалавек старонні.

Штогод на аддзяленне прымаецца 20—25 абітурыентаў. Не рабілася выключэнне і для гэтых. Мінуў час, надышоў выпуск. Паглядзіце на склад курса: 11 чалавек. Па розных прычынах «не дацягнулі» да дыплома іх колішнія аднакашнікі. У выніку—галаваломка для педагогаў: падабраць п'есы з улікам колькасці і структуры акцёрскага саставу. Нават аптымальны падбор рэпертуару вымусіў выкарыстоўваць у некаторых ролях студэнтаў малодшых курсаў (а ў «Трох сёстрах» Салёнага і Ферапонта іграў адзін і той жа выпускнік). Не пашанцавала і на пастановачныя ўмовы: выпускнікам не давялося пабачыць чароўнае святло рампы, адчуць хвалюючую прастору няхай бы і невялікай, але сапраўднай сцэны. І вінаваціць за гэта каго-небудзь цяжка: рэканструкцыя старой залы, па прычынах сапраўды аб'ектыўных (прадпрыемстваў па стварэнню тыпавых тэатраў, здаецца, не існуе), вядзецца пакутліва марудна.І вучэбны тэатр, з якім кіраўніцтва інстытута звязвае вялікія спадзяванні, уступіць у строй не раней новага навучальнага года. Такі тэатр з аўтаматызаванай сцэнай, багатым гардэробам, рэквізітам і г. д. — шчасце для будучых акцёраў. У такі тэатр можна будзе запрашаць адразу не менш трох соцень гледачоў. Для такога тэатра абавязкова спатрэбіцца маляўнічая рэклама, якую змогуць забяспечыць будучыя графікі.

Аднак не будзем забягаць наперад: пагаворым пра сённяшніх выпускнікоў, якія ў хуткім часе адчуюць сябе самастойнымі грамадзянамі, членамі прафесійных калектываў, адказнымі за выбар сваёй пазіцыі ў мастацтве і ў жыцці. Іх — адзінаццаць. Акцёрскае майстэрства большасці з іх дзяржаўная камісія ацаніла адзнакай «добра»; адзін з іх атрымаў вышэйшы бал, двое — «здавальняюча». Большасць з іх размеркавана па абласных тэатрах, на чацвярых паступілі заяўкі ад мінскіх калектываў. Магчыма, вынікі былі б іншыя, калі б не ўсё тыя ж складаныя ўмовы, што не дазволілі выхаванцам інстытута максімальна раскрыцца ў дыпломных работах. І, здаецца, менавіта цяпер, у пачатку іх творчага шляху, важна перш за ўсё заўважыць і падтрымаць тое добрае, адметнае,

Вячаслаў Кузьменка (Алесь) і Раіса Цыркун (Вольга) у спектаклі «Гандлярка і паэт».

што ўжо ёсць у маладых акцёрах.

Рая Цыркун — гэта Ірына ў «Трох сёстрах», Зэн у «Лісічках», Вольга ў «Гандлярцы». Розныя гераіні. Але бачыцца ў іх нешта агульнае, бо кожная пад уплывам абставін так ці інакш перажывае працэс духоўнага пастаялення. Гэта «чытаецца» ў ігры Раі. У яе Ірыны часам над непасрэднасцю пачуцця пераважае сказанасць, затое ў Вользе-гандлярцы сканцэнтраваны непадробная шчырасць і адкрытасць тэмпераменту. Жывою думкай напоўнены яе маналог-сумненне, прызнанне Алесю. Алесь у «Гандлярцы» — Вячаслаў Кузьменка, ён жа Вяршынін і Гарацый Гідэнс. У Вячаслава зайздросная сцэнічная знешнасць, уменне трымацца на сцэне. Па ўзросту ён старэйшы за сваіх аднакурснікаў, пэўны жыццёвы вопыт дазваляў яму знайсці пераканальныя рысы ў паводзінах падпалкоўніка Вяршыніна, разбітага цяжкай хваробай Гідэнса.

Змагацца з міжвольнымі «ноткамі маладосці», ужываючыся ў натуру пажылога доктара Чабутыкіна, прыйшлося Ігару Сідорчыку. Нязграбны, вечна п'яненькі чалавек з газетай у кішэні вымаўляе ў трэцяй дзеі свой невялікі маналог з інтанацыяй гранічнага адчаю, болю за пустое і пошлае жыццё.

Калі ўжо гаворка зайшла пра ўзроставыя ролі, нельга не прыгадаць камічнага і вартага жалю Ферапонта. Прыгорблены глухаваты дзядок з падвязанай сківіцай уваходзіць у дом Прозаравых, расказвае хрыплым голасам чарговую неверагодную навіну. І цяжка паверыць, што выканаўца ролі старога вартаўніка Яўген Крыжаноўскі, зусім нядаўна з'яўляўся перад гледачом у абліччы падцягнутага і хмурага штабс-капітана Салёнага. Інсцэніроўка «Гандляркі» яшчэ раз пацвердзіла схільнасць Яўгена да пераўвасаблення: запамінальнай атрымалася ў яго эпізадычная роля мітуслівага падлізы-перакладчыка.

Крыжаноўскі пачне свой самастойны шлях у калектыве купалаўцаў. Па суседству —у тэатры юнага гледача —будуць працаваць Таня Журавель і Мікалай Лявончык. Выйдуць на беларускую сцэну Іра Сачак, Лілія Літвінава, Анатоль Кляшторны...

...У дзень размеркавання яны нагадвалі хутчэй абітурыентаў, чым выпускнікоў: згрудзіліся каля дзвярэй, хвалююцца. Да кожнага, хто выходзіць,—адзінае пытанне: «Ну?». Потым іх курс прадставілі па тэлебачанню. Аўтары назвалі перадачу «На парозе жыцця». Няхай жа маладыя акцёры пераступяць гэты парог упэўненым крокам.

С. МАЛАШ.

«РЭЖЫСЁРЫ ПРАСТОРАВАГА АСЯРОДДЗЯ»

Мастак-канструктар патрэбны на кожным прадпрыемстве. Эстэтыка вытворчасці і эстэтыка быту, арганізацыя гарадскога асяроддзя і гандлёвая рэклама—вось тая сфера дзеяння, дзе можа прыкласці свае ўменне, вопыт, фантазію дызайнер. Шматтонны самазвал і дзіцячая цацка, мэблі і кухонная прылада, посуд і ўзор для дывана становяцца тэмамі распрацовак канструктарскіх бюро і асобных аўтараў.

Шырокі дыяпазон тэм і дыпломных работ студэнтаў-выпускнікоў аддзялення прамысловага мастацтва БТМІ. Абарона дыпломаў маладымі дызайнерамі звычайна збірае вялікую аўдыторыю слухачоў і «балельшчыкаў». Была запоўнена актавая зала і на гэты раз. Студэнты малодшых курсаў дапамагаюць «абаронцам» расставіць планшэты, прымацаваць да дошкі графічныя лісты, прымайстраваць на падстаўках макеты, выкананыя ў матэрыяле.

Да абароны застасцца некалькі мінут. Карыстаемся паўзай і просім расказаць загадчыка кафедры прамысловага мастацтва І. Герасіменку, чым адметны сёлетні выпуск.

— Перш за ўсё тым, — адказвае выкладчык, — што дыпломныя праекты, з якімі мы ўжо азнаёміліся, сведчаць, у сваёй большасці, аб уменні мысліць не толькі тэхнічна, адукавана, але і па-мастацку шырока, вобразна. Шырокі падыход да праблемы, тэарэтычная падрыхтоўка, уменне праектаваць рэч ва ўзаемасувязі з асяроддзем, уменне рэжысіраваць сітуацыю — вось якія задачы сёння ставяцца перад маладым дызайнерам. Таму вы амаль не сустрэнеце канкрэтных, вузка вытворчых тэм, як, скажам, канструяванне асобнай машыны ці нейкай прылады.

Напрыклад, праект «Рабочае месца дыспетчара гарадскога таксі». У ім лакальная задача — стварэнне максімальна зручнага дыспетчарскага пульта — вырашаецца ў спалучэнні з больш шырокай — як арганізаваць рух таксі аптымальна зручна для пасажыраў. Вырашаецца праблема з дапамогай праграміруючай прылады і сістэмы індыкатараў на пульце. Індыкатары пастаянна фіксуюць нумары свабодных машын. Але ў цэлым задача ставіцца больш шырока— як зрэжысіраваць транспартныя сітуацыі на гарадскіх дарогах. Не выпадкова дызайнераў часам называюць рэжысёрамі прасторы.

Аўтар праекта студэнт-выпускнік С. Стрэльскі разам з планшэтамі прадставіў камісіі макет пульта кіравання, у якім прадугледжана зручнае размяшчэнне тэлефона, «абыгран» колер розных яго дэталей.

Дарэчы, на колер, афарбоўку рэчаў члены экзаменацыйнай камісіі звярталі асаблівую ўвагу. Мастак-канструктар павінен быць у першую чаргу мастаком. Таму выключнае значэнне надавалася таксама кампазіцыі, малюнку, колераваму вырашэнню праекта. І большасць дыпламантаў з гэтай задачай справілася.

Вось па дзіва прыгожыя лісты — маляўнічыя, дасціпныя па малюнку. Іх паказвае студэнтка-дыпламантка В. Кісялёва. Тэма яе праекта — «Візуальныя камунікацыі калгаснага рынку ў Мінску». Вялікая прастора для мастакоўскай фантазіі! У гэтай рабоце колер стаў галоўным кампанентам, яе зместам. Крыты рынак, што будуецца ў Мінску на плошчы В. Харужай, стане адным з буйнейшых у Саюзе. Як аформіць яго, каб і пакупніку, і прадаўцу было ў ім зручна арыентавацца? Мастачка вырашае праблему проста, лаканічна і прыгожа. У яе праекце кампазіцыйна рынак падзяляецца на зоны з дапамогай колеру. Мясны аддзел — чырвоны, аддзел гародніны і садавіны — зялёны, малочны — белы, зона кветак — фіялетавая. Кожная зона мае свой лаканічны стылізаваны знак. У мясным аддзеле, напрыклад, арыенцірам паслужаць стылізаваныя адлюстраванні каровы, барана, пеўня. У зоне даро́ў прыроды — стылізаваная рыбка і г. д. Прыгожы, жывапісны плакат пры ўваходзе на рынак пазнаёміць нас з маршрутамі, раскрые значэнне колеравых сімвалаў.

Гэты праект быў надзвычай прыхільна прыняты і гледачэмі, і экзаменацыйнай камісіяй. Члены камісіі павіншавалі выпускніцу са званнем мастака-канструктара і выказалі пажаданне, каб яе дыпломны праект быў выкарыстаны пры афармленні новага рынку.

Выхад у практыку, магчымасць практычнага прымянення дыпломных праектаў — характэрная рыса многіх работ.

Студэнтка А. Арайс, напрыклад, прапанавала набор талерак для прадпрыемстваў грамадскага харчавання са складаным геаметрычным узорам, зручным па тэхналагічнай апрацоўцы і вельмі прыгожым, які яна распрацавала на Мінскім фарфоравым заводзе. А выпускнік інстытута А. Кірылаў прадэманстраваў аблiцовачную плітку для падземных пераходаў, якая, па заключэнню камісіі, можа быць з поспехам выкарыстана і пры будаўніцтве Мінскага метро.

На абароне дыпломаў было шмат праектаў з «дзіцячай» тэматыкай. «Абсталяванне пакояў для гульняў у дзіцячым садзе» В. Леўніна, «Дзіцячая кнігацацка» Л. Смачнікавай, «Аптычны канструктар» В. Катовіча — толькі некаторыя з іх. Гэта, па словах І. Герасіменкі — добрая традыцыя кафедры дызайна. Распрацоўка тэмы, сюжэтна-ролевых гульняў для дзяцей — адна з самых складаных і самых высакародных. Тут дызайнер павінен не толькі «ведаць і ўмець», але і быць... выхаваделем. Цацка ж павінна не толькі забаўляць дзіця, развіваць яго ўяўленне, але і выхоўваць маральна і сацыяльна. Вось праект «Наборы гульняў для дзіцячых садоў» Т. Буравай. Розныя тэмы — марфлот, космас, пошта — розныя наборы са звычайнай паперы. У вялікіх «сшытках» на шчыльных аркушах нанесена пункцірам «выкрайка» розных прадметаў і адзення. Напрыклад, у «пошце» гэта — шапачка, сумка, бланкі для тэлеграм, пасылкі. Дзеці могуць самі выразаць і скласці цацкі з паперы, або — пад кіраўніцтвам выхавацелькі.

А пра гэты праект хочацца сказаць асобна: «Абсталяванне класа для навучання правілам вулічнага руху». Велізарнай важнасці задача вырашаецца студэнткай смела, нечакана і, галоўнае, сур'ёзна.

Як вядома, асноўныя прычыны трагічных здарэнняў з дзецьмі на вуліцы — недастатковае ўменне іх арыентавацца ў прасторы, адсутнасць фізічных навыкаў. Т. Голубева прапанавала рашэнне простае і даступнае для дашкольнікаў і школьнікаў. Усяго толькі і трэба — лёгкі каркас з алюмінію, рознакаляровыя тканіны і сістэма тросаў. Цяпер на маленькай плошчы можна змадэліраваць прастору і нават — сітуацыю на дарозе. Набліжэнне і аддаленне машыны тут абазначаецца ўмоўна — узнящем або апусканнем шторкі ярка-чырвонага колеру (градыцыйны колер небяспекі). Колер, змяненне яго інтэнсіўнасці, яркасці канструіруе сітуацыю. Паводле слоў

(Заканчэнне на стар. 12).

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 11).

старшыні прыёмнай камісіі, прарэктара Ленінградскага мастацка-прамысловага вучылішча імя Мухінай Я. Лазарава, гэтую работу проста неабходна патэнтаваць. Тым больш, што аналагаў ёй ні ў нас, ні за мяжой няма. Шкада толькі, што ў Мінскім упраўленні ДАІ абыякава паставіліся да прапановы Т. Голубевай.

Я. Лазараў адзначыў і праект Ю. Калядзенкі «Афармленне рэкламнай кампаніі коннага спорту (комплекс у Ратамцы)». Яго рэкламны плакат — кентаўр, які сімвалізуе сабою самы дух коннага спорту, выкананы, на думку старэйшых мастакоў, у лепшых класічных традыцыях і ў той жа час на дзіва сучасна.

Уменне творча думаць, прапаноўваць новыя ідэі, канструяваць — рысы асабліва каштоўныя, на думку члена дзяржаўнай камісіі памесніка дырэктара БФУНДІТЭ А. Мельнікава. У якасці прыкладу ён прывёў работу І. Шэверава «Мабільная поліфункцыянальная цацка». Гэтая цацка, што нагадвае ці то веласіпед, ці то самакат, ці то катамаран, мае невычэрпныя магчымасці для стварэння шматлікіх варыянтаў самых розных сюжэтна-ролевых гульняў — прадбачыць іх усе не пад сілу нават самому аўтару.

Арыгінальны падыход да тэмы, дасціпнасць мыслення характэрныя для большасці праектаў, выстаўленых сёлета для абароны. Іх аўтараў ужо чакаюць у Беларускім філіяле Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі, на Мінскім аўтазаводзе, у канструктарскіх бюро. Увесь сёлетні выпуск застаецца працаваць на прадпрыемствах і ў навуковых установах Мінска.

Р. БАКУНОВІЧ.

ПАЧАТАК ШЛЯХУ

Знешняя стрыманасць не можа схаваць хвалявання, натуральнага для кожнага, хто трымае адзін з важнейшых экзаменаў жыцця — экзамен на прафесіянальную сталасць. Не толькі пяць студэнцкіх гадоў, а значна больш, з таго самага моманту, калі нарадзілася мара стаць мастаком, яны ішлі да гэтага ўрачыстага дня абароны дыплома.

Работа Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі ішла пад старшынствам народнага мастака СССР Юрыя Няпрынцава. Шырокае, зацікаўленае, часам гарачае абмеркаванне кожнага дыплома і, вядома, перш за ўсё сам твор давалі адказ на пытанне, — а ці стаў ты мастаком?

...Нечакана, нібы наперакор сталым уяўленням пра манументальнае мастацтва, гучыць назва насценнага роспісу Уладзіміра Зінкевіча — «Раса». У цэнтры кампазіцыі — фігура асветленага сонцам хлопчыка. Ён лёгка бяжыць насустрач жыццю па ранішнім лузе. Але луг гэты — велізарны свет прыроды — паказаны за ўмоўна павялічаных расінках-сферах. У мяккую зялёна-блакітную фактуру буйных траў упісаны сцэны дзіцячага быцця: гарэзлівая група падлеткаў, дзяўчынка есць ягады з куста. Роспіс прызначаны для дзіцячай паліклінікі. І мажорны эмацыянальны яе лад сапраўды лашчыць вока.

Малады мастак паказаў сябе здольным да развіцця лепшых рыс школы беларускага манументальнага жывапісу — мастацтва высокай культуры вобразнага мыслення. Сёлетнія дыпламанты працягваюць выпрацаваныя іх настаўнікамі прынцыпы яркай вобразнай сімволікі. Пра гэта ж гаворыць і роспіс Івана Клімянкі «Мой край Беларусь», дзе кожная фігура мае такую вялікую сэнсавую ёмістасць, што кожны вобраз — салдата, маці, падлетка — арганічна перарастае ў сімвал.

Характэрна, што аўтар абраў тэхніку энкаустыкі, адроджаную беларускімі манументалістамі.

Надзвычай уважліва выпускнікі ставяцца да архітэктурнай сітуацыі, вырашаючы ў адпаведнасці з ёй кампазіцыйна-рытмічныя і коларавыя задачы, што таксама сведчыць пра сур'ёзную прафесіянальную падрыхтаванасць маладых майстроў.

Калі манументалісты фарміруюцца ў рэчышчы сучасных пошукаў і змен, якія адбываюцца ў мастацтве, то выпускнікі аддзялення станковага жывапісу паказалі прыхільнасць да традыцыйнай школы, заснаванай на эцюдна-дакладным узнаўленні рэчаіснасці. Кола іх тэм дастаткова шырокае і прывабнае. Тут палатно аб працы архітэктараў, кампазіцыя, прысвечаная маладым лётчыкам, адлюстраванне старога народнага абраду «Мядзведжыя забавы»—карціна Сяргея Лагуновіча-Чарэнкі, якая выклікала вялікую актыўнасць пры абмеркаванні. Адзначым на прыкладзе гэтага плаката характэрную рысу ў рабоце маладых жывапісцаў: пры дастатковай добрасумленнасці і працавітасці — захапленне пісьмом з натуры. Сапраўды, выпускнікам гэтага аддзялення часам не хапае фантазіі, вастрыні і арыгінальнасці думкі.

У значна большай меры гэтыя якасці ўласцівы творчасці маладых графікаў. Амель у кожнай дыпломнай рабоце тут праяўляецца вядучая роля аўтарскай задумы, распрацаванай на падставе жыццёвых уражанняў або літаратурнага твора. Напоўнены паэтычным і цёплым пачуццём алоўкавы трыпціх Тамары Андрэевай «Дзеці». У серыі насычаных акварэльных аркушаў Валерыя Юркова тэма ўраджаю разглядаецца ў працэсе агульнай працы людзей, звязанай з жыццём прыроды. Адзінствам стылю адзначана серыя аркушаў Юрыя Гаўрыленкі, выкананых па матывах паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Аўтару асабліва блізкі аптымізм, жыццесцвярджальная сіла паэзіі Коласа. Ён унёс свой уклад у распрацоўку даўно ўлюбёнага беларускімі графікамі твора. Радаснай падзеяй дня стала абарона дыпломных работ Валерыем Славуком і Вячаславам Валынцам. Яны пакараюць адданасцю мастацтву, нястомнасцю карпатлівай працы, якая спарадзіла майстэрства, шчырасцю пачуццяў.

Талент вынаходлівага расказчыка, дакладнае валоданне малюнкам, здольнасць да гратэска, афарбаванага пранікнёна цёплым гумарам—усе гэтыя бясцэнныя для мастака якасці вызначылі самабытнасць цыкла ілюстрацый Валерыя Славука да народнай казкі «Удовін сын». Фантастычнае аўтар робіць рэальным, неверагоднае — праўдзівым і пераканаўчым. Змей з сямю галовамі і ўсё яго сямейства — механізаваная нячыстэя сіла на веласіпедзе і пад парасонам — цягнуць сонца з неба, а кошкі з хітрым прыжмурам вачэй абмяркоўваюць на даху дзіўныя навіны — сюжэт, надзвычай прывабны для дзяцей! Гэтыя ілюстрацыі, паказаныя ў адной са школ Мінска, былі прыняты з захапленнем. Але Славука ніяк нельга назваць «дзіцячым» мастаком. У яго рабоце ёсць над чым падумаць і даросламу гледачу. Тонкасць і гуманнасць светаадчування, вастрыня суперажывання робяць цікавы расказ сапраўдным творам мастацтва.

У дачыненні да чатырох трыпціхаў Вячаслава Валынца цяжка сказаць, графіка гэта або жывапіс. Але так або інакш аднадушнай была думка — гэта мастацкі твор. 12 мініяцюрных карцін—

А. Фінскі. «Мастак».

гэта 12 мастацкіх адкрыццяў. Цыкл пад назвай «Поры года» расказвае пра жыццё чалавека, пра шлях, які пачынаецца з веснавога цвіцення, з маладосці і кахання, ідзе праз калізіі радасцей, трывог, душэўных драм, набліжаючыся да старасці — вышэйшай мудрасці быцця, напоўненай светлай памяццю пра тых, каго ўжо няма. Трэба перажыць у сваёй душы лёс многіх людзей, акунуцца ў свет нягучных, звычайна ўтоеных ад чужога вока пачуццяў, каб стварыць такі філасофскі, сур'ёзны твор з востра акрэсленымі характарамі персанажаў.

Смеласць у вырашэнні маштабных тэм, пачуццё манументальнасці, змястоўная напоўненасць пластычнай мовы — гэта агульныя рысы маладых скульптараў — выпускнікоў інстытута. Яны адчуваюцца і ў работах сёлетніх дыпламантаў, як, напрыклад, у кампазіцыі Аляксандра Мятліцкага «Трывожны час». Праз характары У. І. Леніна, Ф. Э. Дзяржынскага і вобраз чырвонагвардзейца, праз рамантычна прыўзняты эмацыянальны лад кампазіцыі скульптару ўдалося перадаць дух рэвалюцыйнага часу.

Адухоўленасцю пластыкі адзначана работа Аляксандра Фінскага «Мастак». Свабодная пастаноўка фігуры юнака, тонка адчутая лепка перадаюць яго натхнёны, паэтычны стан. Вобраз вельмі сучасны, духоўна блізкі сучаснай моладзі. Аўтар падумаў і пра месца сваёй работы, ён хацеў бы яе бачыць у адным з маляўнічых куткоў мінскага батанічнага саду.

Спрэчнай аказалася кампазіцыя Анатоля Кузняцова «Чалавек і прырода». Пластычныя недахопы ў лепцы чалавечай фігуры выклікалі крытычныя заўвагі экзаменацыйнай камісіі. Аўтара папракнулі за тое, што ў кампазіцыі не адчуваецца кантакту паміж чалавекам і прыродай. Аднак аўтар свядома пайшоў па шляху рэзкага супрацьпастаўлення разумнага і жывёльнага пачаткаў. І нават калі гэтую работу нельга лічыць закончанай, актуальнасць і складанасць абранай скульптарам праблемы — сведчанне творчай смеласці пачынаючага скульптара.

Гэтыя рысы характэрныя для большасці сёлетніх выпускнікоў і праяўляюцца яны не толькі ў поспехах, але і ў заканамерных для пачатку шляху праліках.

Э. ПУГАЧОВА.

Ю. Герасіменка. З серыі «Мой кут».

А. Бараздзеннікаў. «Дэкрэт аб міры».

У ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА

Штогод атрад беларускіх прыкладнікоў папаўняецца маладымі мастакамі, у асноўным выпускнікамі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. І натуральна, што абарона дыпломных работ у інстытуце з'яўляецца аглядам «баявога рэзерву» нашага мастацтва, выклікае, як правіла, вялікую цікавасць, прыцягвае да сябе масу гледачоў.

Абарона сёлетняга выпуску на кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, на жаль, не вызначалася асаблівым бляскам і шматграннасцю талентаў, але, тым не менш, парадавала сустрэчай з паасобнымі мастакамі, якія, спадзяёмся, змогуць з часам унесці дастойны ўклад у развіццё беларускага мастацтва.

Сярод найбольш цікавых дыпломных работ, якія звярнулі на сябе ўвагу, па праву хочацца вылучыць работу кераміста Леаніда Рыжкоўскага: набор бытавога посуду з фарфору «Ралі» (кіраўнік—дацэнт В. Гаўрылаў). Смеласць вырашэння, жаданне пераадолець руціннасць, яшчэ часам уласцівую вытворчасці бытавога посуду, імкненне стварыць рэч не толькі зручную, але і прыемную, сучасную і па свайму функцыянальнаму прызначэнню, і па форме,—вось характэрныя асаблівасці работы Рыжкоўскага. Набор маладога мастака, прызначаны для аўтатурыстаў або для маладой сям'і, кампактны, прыгожы той асабліва строгай і дынамічнай прыгажосцю, якая трывала ўвайшла ў наш быт разам з дызайнам.

Прыкметамі сапраўднага таленту адзначана таксама і дыпломная работа Раісы Клімковіч: камплект мастацкіх крышталёвых кубкаў да Алімпіяды-80 (кіраўнік—дацэнт Т. Паражняк). Таксама, як і Рыжкоўскі, Клімковіч паспрабавала адысці ў сваёй рабоце ад звыклых традыцыйных рашэнняў, стварыць рэч сучасную па форме, па свайму вобразнаму гучанню. Вельмі моцны ў рабоце маладой мастачкі асацыятыўны момант. Яна рашуча адмаўляецца ад лабавой, ілюстрацыйнай трактоўкі—гэтага лёгкага шляху ў мастацтве, што, на наш погляд, асабліва каштоўная рыса ў творчасці кожнага пачынаючага мастака, таму што яна з'яўляецца зарукай далейшых актыўных творчых пошукаў.

Сярод астатніх дыпломных работ хацелася б спыніць увагу на камплекце крышталёвых ваз для кветак Эдуарда Станіслаўчыка (кіраўнік—дацэнт Т. Паражняк). Адзін з моцных і прывабных бакоў мастацтва гэтага маладога, але ўжо спрактыкаванага мастака—высокі прафесіянальны ўзровень яго работ (выкананне ціхавыдзіманае без ручной дапрацоўкі), спалучэнне ў адной асобе і мастака і майстра-шкловыдзімальшчыка.

Па-майстэрску выкананы і дыплом кераміста Генадзя Пусева «Гімн вясне» (кіраўнік — дацэнт В. Гаўрылаў). Даволі складаную кампазіцыю з дзевяці прадметаў характарызуе віртуознае майстэрства тачэння на ганчарным крузе, якое, на жаль, для некаторых нашых керамістаў стала ўжо недасягальным, уменне працаваць з аднаўленчымі эмалямі. Аднак хацелася б пажадаць маладому мастаку больш творчага пошуку, палёту фантазіі. У яго работах моцны народны струмень. Мабыць, менавіта гэтую асаблівасць таленту яму і трэба развіваць.

На народных традыцыях паспрабавала пабудаваць сваю дыпломную работу «Вобразы» і выпускніца аддзялення керамікі Таццяна Васюк (кіраўнік—М. Бяляеў). Абапіраючыся па традыцыі старажытных татэмных камянёў, маладая мастачка імкнулася стварыць кампазіцыю з трох манументальных керамічных скульптур, прызначаную для будучага музея камянёў пад адкрытым небам, які мяркуецца адкрыць у нашай рэспубліцы.

Імкненне маладых мастакоў да засвавання народных традыцый, да пераасэнсавання і ўвасаблення іх на сучаснай глебе—тэндэнцыя вельмі каштоўная, якую можна толькі вітаць. Аднак гэты шлях тоіць у сабе нямала цяжкасцей, асабліва калі мастак пачынае сваю творчую біяграфію. І тут ужо адказнасць за маладога майстра кладзецца на педагога, якому неабходна мець асаблівы такт і асаблівую пільнасць, каб накіраваць вучня на правільную дарогу, падказаць яму патрэбнае вырашэнне, інакш цікавая і высакародная ідэя не атрымае належнага ўвасаблення. І тады задума і жаданне нават у здольнага мастака разыдуцца з яе магчымасцямі, —як гэта здарылася з работай Васюк.

Хочацца пажадаць маладым мастакам самастойнай актыўнай творчай дзейнасці на прадпрыемствах, куды ў гэтым годзе накіраваны выпускнікі БДТМІ, — на шклозаводзе «Нёман», на Барысаўскім шклозаводзе, на Івянецкай фабрыцы мастацкай керамікі і вышыўкі і іншых арганізацыях.

В. КАВАЛЕНКА.

ЧАСУ НЕПАДУЛАДНАЕ

Сёння для студэнтаў тэатральнага інстытута яна — прафесар-кансультант. Калі Вера Паўлаўна ўваходзіць да іх у аўдыторыю — заўсёды засяроджаная, падцягнутая, элегантная, — наўрад ці хто-небудзь з маладых людзей думае: пашанцавала!

Але з цягам часу былыя студэнты не раз і не два з душэўным хваляваннем адчуюць: сапраўды, ім пашанцавала — сустрэцца, працаваць, вучыцца ў Веры Паўлаўны Рэдліх. На працягу ўсіх доўгіх гадоў давядзецца ім чэрпаць з таго, што было імі выпрацавана і назапашана разам з гэтым чулым і патрабавальным мастаком. Яна гэта ўмее — абудзіць у выхаванца (і не толькі ў выхаванца) імкненне ведаць як мага больш. Ускалыхнуць у чалавеку прагу да ведаў не менш важна, як перадаць з рук у рукі студэнтам ад педагога проста суму каштоўных ведаў. І ці ж не ва ўменні гэтым рэалізуецца адзін з найважнейшых прынцыпаў яе педагогікі! Калі сённяшняя студэнтка, што ўзрадавала Веру Паўлаўну ў вучэбным спектаклі «Лісічкі», здолее адчуць у сабе неабходнасць ведаць болей, — сама аб тым не здагадваючыся, яна акажацца для свайго педагога ў шэрагу людзей, чые імёны вымаўляюцца з павагаю...

Здавалася б, сёння Вера Паўлаўна Рэдліх, для якой даўно адкрыты ўсе таямніцы ў мастацтве тэатра, магла б, ну, калі і не спачываць на лаўрах, дык, прынамсі, «жыць спакойна». Зусім наадварот!

Яе чакаюць студэнты. Яе слова ловяць вучні, якія самі ўжо маюць ганаровыя званні заслужаных і народных. Да яе звяртаюцца ў хвіліны сумненняў і творчых пакут. Яе запрашаюць падзяліць поспех... І студэнцкі вучэбны спектакль для В. Рэдліх—акт не менш хвалюючы, чым прагон у «сапраўдным» тэатры.

— Я заўсёды захворвала пасля здачы... Здам — і захварэю...

І сёння—такая ж рэакцыя. А праз колькі дзён яна — ізноў бадзёрая, засяроджаная, строгая. І добразычлівая. Уваходзіць у аўдыторыю, нібы на спатканне з юнацтвам.

У яе натуральнай стомленасці няма перанасычанасці жыццём, адлучанасці ад яго, якая ператварае часам і вельмі мудрых людзей у сумных эгаістаў. Яе душа жыве поўна, даступная ўсім радасцям і перажыванням. Але ёсць у Веры Паўлаўне «штосьці», тое самае «штосьці», якое так адрознівае сапраўды таленавітную і змястоўную мастацкую натуру ад пасрэднасці, нейкая адметная ўнутраная гармонія і светлы спакой, якія Вера Паўлаўна літаральна выпраменьвае.

Пра славутую Вольгу Леанардаўну Кніпер-Чэхаву ўсе мемуарысты гавораць, што ў ёй было вясёлае, жыццярадаснае, «апетытнае» жыццялюбства, якое нясло радасць і іншым. Я прыгадваю расказы Веры Паўлаўны пра Вольгу Леанардаўну, пра яе культуру, элегантнасць, інтэлігентнасць і думаю: а гэта ж усё можна (і патрэбна!) аднесці і да самой Веры Паўлаўны. Побач з ёю вам не прыйдзе ў галаву гаварыць пра нязначнае, неістотнае; судакрануўшыся з яе душэўнай гармоніяй, хочаш і жыць лепей, болей, так сказаць, мэтанакіравана, і лепшымі бачыць людзей. Шмат у чым яна маладзейшая, яснейшая, актыўнейшая ў сваіх адносінах да жыцця за многіх нас.

Вядома, вынікі творчасці належаць усім, але сам творчы працэс—справа сугуба інтымная. Ніякія самыя шчырыя адказы мастака на самыя вынаходлівыя пытанні так і не даюць вычарпальнага: як жа, урэшце? Як выспявае задума? Як з мноства намечаных шляхоў да поспеху абіраецца адзіна магчымы?

Назіраю, як Вера Паўлаўна кампануе букет з самых звычайных палявых кветак. Раздумваючы, адвяргаючы, выбіраючы са шматлікіх варыянтаў—адзін... Рэжысура! Ёю яна бывае захоплена цалкам. Гэта ўвогуле адметная яе рыса—найглыбейшая захопленасць тым, чым занятая ў гэты канкрэтны момант. Бо яна пастаянна — у атмасферы актыўнага стаўлення да свету, якое літаральна пульсуе ў ёй то ад дакранання памяці да даўнягадаўняга (Цвятаева! Валошын! Станіслаўскі! Качалаў!), то ад толькі што адкрытага свежага нумара часопіса, то ад роздуму пра самыя звычайныя праяўленні жыццёвай прозы.

Для Веры Паўлаўны існуе паэзія жыцця.

Шкада, што гэты мастак не збірае архіваў! Нават тое нямногае, што захоўвалася, — згінула ў віхурах ваенных падзей, шматлікіх акцёрскіх пераездах. Затое тыя драбніцы, якія ўцалелі, — найкаштоўныя. Беражэ Вера Паўлаўна і ліст драматурга Аляксандры Якаўлеўны Бруштэйн, атрыманы ёю ў Новасібірску ў першую ваенную зіму:

«...Усе мы часта прыязджаем з Масквы на перыферыю, а таксама глядзім у Маскве... перыферыйныя спектаклі. Мы амаль заўсёды хвалім іх,—але з абавязковаю агаворкаю ў думках: «Гэта ж перыферыя!..» Увогуле, мы ставімся да такога перыферыйнага спектакля, як да яешні, прыгатаванай на пікніку, на вуголлях лясного вогнішча: трошкі прыгарэла, соль забыліся дома, а ў яешню трапілі і кавалачкі шалупіння яек, і сажа—але ж гэта не дома! гэта пікнік! гэта перыферыя! Калі б, аднак, нам прапанавалі ўсё жыццё есці толькі такую яешню і глядзець толькі такія спектаклі, мы б скукожыліся і нават запішчалі!..

Гэтага ўсяго баялася я, калі ішла ў Новасібірску глядзець «Гамлета».

І вось «Гамлет» аказаўся... зусім не перыферыйнай радасцю! Ваш «Гамлет»—гэта цэнтральна і сталічна (не ў абывацельскім сэнсе, а—у мастацтве цэнтральна, у тэатры—сталічна!). І ў дасягненнях сваіх, і ў недахопах. І яшчэ таму, што гэта—спектакль вялікай, сапраўднай культуры і цудоўнай рэжысёрскай свабоды, лёгкасці, грацыёзных знаходак і свежасці пачуцця. Сцэна «Мышалоўкі» стаіць для мяне ў шэрагу лепшых пастановак «Гамлета», убачаных мною ў нас і за мяжою. Кароль, які выцірае пальцы аб пурпур царскага адзення, сцэна Гамлета з маці—нават такая дробязь, як партрэты каралёў, што загучалі зусім інакш, калі аказаліся мініяцюрамі на шыйных цэпачках! Усяго не пералічыш, ды я, канечне, усяго не заўважыла ў гэты першы раз, пасля якога пайду на «Гамлета» вашага яшчэ неаднойчы...».

Адкуль жа ўсё гэта? Як яна стала—Рэдліх?

1920 год. Толькі што скончана Другая студыя Маскоўскага мастацкага тэатра. Другую студыю называлі «самай вернаю дачкою Станіслаўскага». У Мілюцінскім завулку, у цесных пакойчыках вучыліся Міхаіл Яншын і Мікалай Хмялёў, Анастасія Зуева і Міхаіл Кедраў, Марк Прудкін і Ала Тарасава—аднакурснікі, сябры, адзінадумцы Веры Рэдліх. Урокі Станіслаўскага, Вахтангава, Мчадзелава. Блізкасць Мастацкага тэатра — тэатра максімалізму ва ўсім: у думках, ідэях, у выразнасці, у артыстычнай тэхніцы, у чалавечай этыцы. Блізкасць старэйшых акцёраў МХАТа, якія свята ставіліся да свайго тэатра, да мастацтва, якія ўмелі пакідаць, як казалі пра іх, ля парога так любімага імі тэатра ўсе асабістыя жыццёвыя клопаты, радасці, сум і... мітуслівасць. Напэўна, менавіта Другая студыя вылепіла з сарамлівай студэнткі строгага да сябе, дапытлівага, неспакойнага мастака.

Студыя і—Час. Час рэвалюцыйных пераўтварэнняў ва ўсім.

Выпускніца Другой студыі Вера Рэдліх паехала ў Томск, каб у Першай Сібірскай драматычнай студыі пачаць сваю артыстычную і педагагічную дзейнасць. Неўзабаве група зліваецца з кастрамічамі, якія прыехалі на гастролі, з тэатрам студыйных пастановак на

чале з Аляксеем Дзмітрыевічам Паповым. Яраслаўль, Кастрама, Іванава-Вазнясенск, Чыта, Харбін і Уладзімір—геаграфія гастроляў тэатра была шырокая. Рэпертуар — паўнацэнны. Ансамбль — сапраўдны. Уражанняў — мноства. Школа мастацтва — самая сур'ёзная.

З найкаштоўнейшым багажом прыйшла ў 1932 годзе ў новасібірскі «Чырвоны факел» Вера Паўлаўна — загадчык педагагічнай і навучальнай часткай тэатра, выкладчык сцэнічнай мовы, а неўзабаве—рэжысёр і мастацкі кіраўнік «Чырвонага факела». Першая самастойная пастаноўка — «Тарцюф» Мальера...

— Гэта быў адчайны спектакль!..—смяецца, прыгадваючы, Вера Паўлаўна.—У ім было ўсё, нават Эльміра выганяла Тарцюфа памялом! Але не было галоўнага—выкрыцця «тарцюфаўшчыны»...

Цяжка сказаць, ці не занадта строгая Вера Паўлаўна да сябе—пачынаючай. Або, сапраўды, як адзначала ў тую пару крытыка, недахопы спектакля вынікалі з... багацця, шчодрасці рэжысёра!..

Непераўзыдзеная псіхалагічная глыбіня, вялікая сіла абагульнення рускай класікі больш за ўсё прыцягвала і прыцягвае Рэдліх-рэжысёра і Рэдліх-педагога. Любоў да рускай літаратуры спадарожнічае ёй заўсёды. У навагоднюю ноч чытае сябрам адзін за адным вершы Пушкіна, Блока. Завучвае новыя вершы Цвятаевай, якія дагэтуль не траплялі ў поле яе зроку. Наогул да Цвятаевай у Веры Паўлаўны стаўленне асаблівае, асабістае: у гады першай сусветнай вайны ў гарачай Феадосіі юныя сёстры Вера і Ліза Рэдліх жылі пад адным дахам з Цвятаевай, яны разам гасцілі ў Кактэбелі ў доме паэта і мастака Максіміліяна Валошына, сябравалі з Маяй Кудашавай—у будучым Марыяй Паўлаўнай Ралан, жонкай Рамэна Ралана.

Шчаслівы лёс—такое кола цудоўных людзей, сяброў і знаёмых! Але, думаецца, менавіта гэта сведчыць красамоўней за ўсё пра тое, што яна сама, яе асоба—неадольна прыцягальная для людзей творчых і яркіх. Рэдкая душэўная гармонія, абаяльнасць, адметная светласць прыцягваюць да Веры Паўлаўны людзей рознага ўзросту, рознага душэўнага і жыццёвага вопыту.

...На сваім фотаздымку Ала Канстанцінаўна Тарасава напісала радкі любові да сяброўкі юнацтва і вернага аднадумца на працягу многіх гадоў сталасці. Словы ўдзячнасці за душэўную і творчую шчодрасць, за талент чалавека і мастака, шчасце судакранання са светам прыгожага чалавека скажуць многія, хто крануўся душою Веры Паўлаўны, — юны выпускнік інстытута, якога яна паважліва называе «калега», і прызнаны мастак...

Нават на першы погляд пералік спектакляў, пастаўленых Рэдліх, — красамоўны: «Гамлет», «Антоній і Клеапатра» Шэкспіра, «Беспасажніца», «Без віны вінаватыя» Астроўскага, «Сяло Сцяпанчыкава» па Дастаеўскаму, «Абрыў» па Ганчарову, «Збеглая» Галсуорсі і яшчэ—«Чайка», «Дзядзя Ваня», «Тры сястры», «Зыкавы», «Апошнія», «Дзеці сонца», «Жывы труп», «Анна Карэніна», «Сірано дэ Бержэрак»... А побач—сучасныя аўтары: Арбузаў, Пагодзін, Салынскі, Ляонаў, Крон, Чапурын, Рамашоў, Каверын, Шамякін... Захапленне класікай не замінае сур'ёзнай, паглыбленай рабоце з сучаснай п'есай. Больш таго: класічны рэпертуар, выхоўваючы тэатр і рэжысёра, быў цудоўнай школай майстэрства, школай пранікнення ў самыя запаветныя глыбіні чалавечага характару.

Для рэжысёра Рэдліх даўно і канчаткова вырашана спрэчка аб прыарытэце рэжысёра або акцёра. Вырашана—на карысць акцёра. Яе спектаклі, пастаўленыя ўладарнай рэжысёрскай рукой, уражваюць глыбінёю вывучэння матэрыялу, своеасаблівасцю трактоўкі, а перш за ўсё—увагай, любоўю да акцёра. Гэта асаблівая, можа быць, самая галоўная рыса рэжысёра Рэдліх. Яна не эксплуатуе акцёрскія індывідуальнасці, не «штампуе» іх. Прыгадаем папулярнага цяпер народнага артыста СССР Яўгена Мацвеева, выдатнага акцёра, выхаванага ёю. Народная артыстка РСФСР Вера Капусціна, вядомая сённяшняму гледачу, пачынаецца з «Чайкі», а яе Ніна Зарэчная разам са спектаклем «Чырвонага факела» ўвайшла ў гісторыю савецкага тэатра. Не меншую ролю адыграла Вера Паўлаўна ў творчым лёсе цудоўнага акцёра, які заўчасна пайшоў з жыцця, — Аляксея Глазырына. Яна літаральна ляпіла яго унікальны талент...

Для яе «сучасны» — сінонім неабходнага сёння тэатру, людзям. Мабыць, таму пасля спектакля славутага рэжысёра, які паставіў класічную п'есу, яна з горыччу зазначыла: «Які старамодны спектакль!..» — хаця ўсялякіх навацый у тым спектаклі было больш чым дастаткова.. Яна з асалодаю аналізуе самыя, здавалася б, далёкія ад яе як ад рэжысёра «класічнай школы» работы, праяўляючы шырокую дасведчанасць і найглыбейшую зацікаўленасць у самых апошніх здабытках. На занятках у інстытуце яна як рэжысёр свядома адступае ў цень—адно-адзінае заклапочвае: паказаць як мага рэльефна маладога акцёра. І яна пераканана, што іменна гэта — задача вучэбнага спектакля.

Яе любоў і беражлівасць у дачыненні да акцёра — бязмежныя. Не любіць Вера Паўлаўна паўтараць спектаклі. Паўтарэнні—лічаныя. «Тры сястры» пасля Новасібірска яна паставіла ў Чэхаславакіі, а «Беспасажніцу» паставіла зноў у Мінску—у Рускім тэатры БССР імя М. Горкага, таму што марыла пра ролю ў гэтым спектаклі Аляксандра Клімава... Яе ўрокі ўзбагацілі індывідуальнасць Р. Янкоўскага, Ю. Сідарава, І. Лакштанавай, І. Ражбы, А. Шах-Парон. Яе выхаванцы—В. Шушкевіч, В. Філатаў і многія іншыя з поспехам працуюць у Рускім тэатры імя Горкага. І ў пошуках цяперашняга кіраўніка рускай трупы ў Мінску Б. Луцэнкі ёсць водгулле «рэдліхаўскага» пошуку.

Акцёры адказваюць ёй любоўю і адданасцю. Калі на Беларускім радыё рыхтаваўся творчы партрэт Веры Паўлаўны Рэдліх, паказаць сцэну з «Дванаццатай гадзіны» Арбузава ўзяліся з энтузіязмам Ільза Лакштанава і Расціслаў Янкоўскі, самастойна аднавілі стары эпізод! І з якім запалам сыгралі!.. У дні работы над гэтай перадачай варта было толькі назваць імя Веры Паўлаўны — і з Масквы дасыталіся беражліва запакаваныя плёнкі са старымі запісамі «Чайкі» і з сённяшнімі добрымі словамі пра Веру Паўлаўну. Трэба было чуць, з якой пяшчотаю гаварылі людзі пра яе, як яны шукалі свежыя, дакладныя, нейкія адметныя словы.

Рэдка прызнаемся мы ў любві і ва ўдзячнасці педагогу, старэйшаму сябру, настаўніку. Няёмка. Можа быць, гэта і справядліва: вымаўленыя словы не здольны выказаць усёй праўды... А як жа выказаць удзячнасць за вернасць, цеплыню, талент, клопаты, нарэшце, — проста за шчасце судакранання? За сваё здзіўленне перад жыццяздольнасцю, мудрасцю і прыгажосцю? За зоркасць і маладосць душы? За здольнасць радавацца чужой удачы і таленту?..

Лілія БРАНДАБОЎСКАЯ.

КЛІМАВІЦКАЙ МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЕ-СЯМІГОДЦЫ

НА ПАСТАЯННУЮ РАБОТУ ПАТРАБУЮЦЦА ВЫКЛАДЧЫК ПА КЛАСУ ЦЫМБАЛ І ВЫКЛАДЧЫК ПА КЛАСУ КЛАРНЕТА,

з нагрузкай 1,5 стаўкі.

Звяртацца па адрасу: 213600 Магілёўская вобласць, г. Клімавічы, РДК, аддзел культуры.

Я — РЭЖЫСЁР НАРОДНАГА ТЭАТРА...

ДЛЯ МНОГІХ самадзейных артыстаў слова «аматаршчына», «дылетантызм» гучаць як абраза. І, наадварот, няма для іх большай пахвалы, чым пачуць пра сваю работу—«гэта прафесіянальна». І ў той жа час сярод прафесіяналаў бывае можна пачуць пагардлівае: «Самадзейная сцэна? Гэта несур'ёзна!».

Нярэдка бывае, што «таленавіты хлопец», якому «пашанцавала» стаць прафесіянальным артыстам, так і не дабіваецца поспеху на сцэне Год за годам выносіць ён падносы ці іграе маленькія эпізоды без усялякай надзеі заняць у тэатры больш прыкметнае становішча.

Але я не ведаю ніводнага выпадку, калі пры такіх абставінах людзі вярталіся б у самадзейны тэатр. Самадзейнасць? Зноў? Барані божа! Ці дрэнныя, ці добрыя, але—прафесіяналы, і яны ніколі не дазволяць сабе зноў «апусціцца» да самадзейнасці.

Можна было б і яшчэ паразважаць на гэтую тэму, але, мне здаецца, і так зразумела, што паміж самадзейным і прафесіянальным мастацтвам існуе, умоўна кажучы, «псіхалагічны бар'ер». А падстаў для гэтага, дальбог, няма!

Узнікнуўшы з нетраў аматарства, прафесіянальны тэатр стаў развівацца па сваіх законах, і гэтыя законы так або інакш пачалі вызначаць галейшыя шляхі развіцця і самадзейнага мастацтва, калі яно сапраўды функцыянірае як мастацтва, а не як чыстае аматарства.

Калі народны тэатр ставіць перад сабою сапраўды мастацкія задачы, ён немінуча выкарыстоўвае ў сваёй практыцы ўсе даступныя яму дасягненні сучаснага прафесіянальнага тэатра і ў рабоце над роллю, і ў пабудове спектакля. Як вядома, аматарства заўсёды несамастойнае, заўсёды засмаванае на перайманні, прычым за ўзор, як правіла, бярэцца самыя зашмальцаваныя штампы прафесіяналаў.

У нашых жа народных тэатрах такама нярэдка можна сустрэцца з перайманнем, але гэтае перайманне зусім іншага роду. Тут шукаюць на прыкладзе ігры лепшых артыстаў-прафесіяналаў новую, найбольш сучасную манеру ігры. Простае ж капіраванне якога-небудзь славутага акцёра лічыцца дрэнным тонам.

Артысты нашага тэатра самыя ўдзячныя чытачы тэатральнай літаратуры. З асаблівай прагнасцю прачытваюцца кнігі, якія носяць чыста тэарэтычны характар. Напрыклад, працы М. Кнебель, Г. Таўстаногава, А. Папова, даследчыя работы беларускіх вучоных-тэатразнаўцаў У Няфёда, А. Сабалеўскага, С. Пятровіча, А. Лабовіча. Існуюць і іншыя крыніцы, з якіх самадзейны тэатр чэрпае прафесіянальныя навыкі: напрыклад, сустрэчы з майстрамі мастацтва, творчыя канферэнцыі.

Аднак самым пастаянным і эфектыўным фактарам, які непасрэдна ўздзейнічае на фарміраванне трупы народнага тэатра, з'яўляецца мастацкі кіраўнік. Ён—той адзіны прафесіянал, з якім самадзейны калектыў сустракаецца кожны дзень.

У цяперашні час кіраўнікоў самадзейных калектываў рыхтуюць у спецыяльных навучальных установах, вышэйшых і сярэдніх. Існуюць таксама і факультэты рэжысёраў народных тэатраў пры тэатральных ВНУ. У нашай рэспубліцы такі факультэт існуе дзесяць гадоў пры Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Ужо зрабіў першы выпуск кіраўнікоў самадзейных тэатральных калектываў Мінскі інстытут культуры. Той сярэдні ўзровень прафесіяналізму, што набыты выпускніком такой спецыялізаванай установы, дазваляе яму кіраваць самадзейным калектывам з пэўным эфектам.

Але ў самадзейнага тэатра застаецца шмат праблем. Адна з іх—павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню спектакляў. Трэба максімальна наблізіць гэты ўзровень да патрабаванняў сучаснага савецкага мастацтва ў цэлым. А для гэтага, на мой погляд, рэжысёр-кіраўнік народнага тэатра павінен быць звязаны перыядычна з работай тэатра прафесіянальнага. Я маю на ўвазе не фармальную сувязь, якая складаецца з, так сказаць, матэрыяльнай дапамогі—перадачы старых касцюмаў, рэквізіту ды яшчэ і рэдкіх наездаў рэжысёраў ці акцёраў, каб «выцягнуць» чарговую работу народнага тэатра, а якая стане сапраўдным супрацоўніцтвам, неабходнай умовай творчай працы.

Адчуваю, што ў чытача ўзнікла пытанне да аўтара: «Вы хочаце, каб рэжысёру народнага тэатра даручалі пастаноўкі спектакляў у прафесіянальным тэатры?».

А чаму не? Чаму рэжысёру народнага тэатра, які атрымаў прафесіянальную адукацыю ў той жа навучальнай установе, у тых жа педагогаў, што і рэжысёр прафесіянальнага, нельга заманаваць і паглыбіць свае веды ў непасрэдным рабоце з прафесіянальнымі акцёрамі? Я лічу, што гэта рабіць проста неабходна.

Ёсць для гэтага дзве асноўныя прычыны. Першая заключаецца ў тым, што самадзейныя артысты, валодаючы нейкім мінімумам прафесіянальнай падрыхтоўкі і здольнасцямі, не маюць школы, гэта значыць у рабоце над роллю не могуць усвядомлена выкарыстоўваць асноўныя законы творчай псіхалогіі. Пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы рэжысёр-выпускнік, як правіла, атрымлівае толькі пачатковае ўяўленне аб гэтых законах. Сур'ёзнае валоданне імі прыходзіць у працэсе работы з прафесіянальнымі акцёрамі. Прафесіянальны акцёрскі склад фарміруе рэжысёра, выхоўвае яго. Самадзейны ж калектыў гэтай функцыі выканаць не можа. Для творчага функцыянірання калектыву аматараў неабходны вопыт рэжысёра, які прайшоў скрозь горан прафесіянальнай сцэны. Такая першая прычына. Другая заключаецца ў тым, што самадзейнаму тэатру яшчэ больш, чым прафесіянальнаму, неабходны не толькі добры рэжысёр-педагог, але і добры рэжысёр-пастаноўшчык. Чаму больш? Ды таму, што пра кепска пастаўлены спектакль у прафесіянальным тэатры звычайна гавораць: «Гэта зусім як у самадзейнасці».

Несправядлівасць падобнага падыходу даказвалася ўжо неаднаразова выдатнымі пастаноўкамі самадзейных калектываў.

Нядаўна мне давялося ехаць у адным купэ з групай артыстаў аднаго абласнога тэатра. Натуральна, гаворка зайшла аб драматычным мастацтве. Гаварылі бурна, тэмпераментна. Калі ж гаворка зайшла пра народныя тэатры, я пачуў:

— Наогул нядрэнна, што вы там нечым займаецеся. Але чаму народныя тэатры бяруцца ставіць тыя ж п'есы, якія пішуць для прафесіянальнага тэатра? У вас павінна быць свая драматургія. І наогул, самадзейнае мастацтва стаіць асобна...

На жаль, гэткія выказванні можна чуць часта. Хочацца прыхільнікам гэтых «тэорый» з усёй рашучасцю сказаць: аматарскім тэатрам патрэбны не «свае» п'есы, зробленыя дамаросным спосабам, а п'есы сапраўдныя, дасканалыя па мастацкаму ўзроўню і глыбіні чалавечых пачуццяў. Толькі на лепшых узорах класічнай і сучаснай драматургіі народны тэатр можа дамагацца добрых вынікаў.

У свой час мела месца так званая «тэорыя двух патокаў», па якой выходзіла, што кожнае з гэтых мастацтваў мае свой шлях, і практычна самадзейнае мастацтва не мае ніякіх адносін да прафесіянальнага.

Але разважанні прыхільнікаў «самабытнасці», якія адмаўлялі неабходнасць вучыцца майстэрству ў прафесіяналаў, — адкінуты. Менавіта ў сувязі з прафесіянальным мастацтвам — аснова творчага росту самадзейных калектываў.

Таксама не магу пагадзіцца і з тымі, хто трымаецца думкі, быццам у народным тэатры павінна быць нейкая «свая» методыка работы рэжысёра з артыстамі. Упэўнены, што не можа існаваць двух разуменняў рэжысуры: адно—для прафесіянальнага тэатра, другое—для самадзейнага. Метад работы можа быць толькі адзін—творчы.

Ці азначае гэта, што самадзейны тэатр не мае сваёй спецыфікі? Спецыфіка ёсць, і трэба зрабіць так, каб яна не ўвайшла ў непрымірымае супярэчанне з асноўнымі псіхалагічнымі заканамернасцямі, якія суправаджаюць творчы працэс.

Зараз мы паспрабуем падрабязна разабрацца ў гэтай спецыфіцы. Гэта важна, бо іншы раз здараецца, што здольны рэжысёр, які так неабходны тэатру, не вытрымлівае і пакідае калектыў. Прычым пакідае з прыкрасцю, з горкім пачуццём у адносінах да самадзейнага мастацтва наогул.

Мы ўжо гаварылі, што самадзейны акцёр не мае школы. Ён іграе проста так, як дазваляюць яму яго прыродныя здольнасці (калі гэтых здольнасцей няма, то ў народным тэатры яму рабіць няма чаго). Ён ніколі не вучыўся валодаць сваім акцёрскім апаратам—дыханнем, голасам, мовай, пластыкай, рытмам. Ён не ведае тэхнікі дыялога. Ён не валодае сакрэтам акцёрскага абаяння, не ведае адчування ўласнай індывідуальнасці і не ўмее «прадаць» сябе найвыгаднейшым чынам, як гэта робяць прафесіяналы. Аматар амаль нічога не ведае ўсур'ёз аб методыцы валодання вобразам, аб прыродзе пераўвасаблення, яго, як правіла, актыўна «цягне» на выпік, на цайгрыш характарнасці, пачуцця, ён не абаронены ад самых агідных уздзеянняў, перайманняў, штампаў. Часта ён не адчувае адценняў, паўтонаў, таго «крышку», з якога і складаецца мастацтва.

Але пры ўсім гэтым у яго ёсць галоўнае—здольнасць. Іншы раз нават талент. Вось гэта павінен умець бачыць рэжысёр, які вырашыў працаваць у самадзейным тэатры. Але тут неабходна адна якасць, якая ва ўмовах прафесіянальнага тэатра быццам бы і не з'яўляецца такой неабходнай для рэжысёра, а іменна—цярплівасць.

Так, рэжысёр народнага тэатра павінен быць цярплівым. Ён павінен навучыцца ўтаймоўваць свае пачуцці, такія натуральныя для кожнага мастака, які хоча як мага хутчэй убачыць ажыццёўленай сваю творчую задуму. Ён не павінен раздражняцца, калі акцёр-аматар прыходзіць на рэпетыцыю недастаткова падрыхтаваны, з нявывучаным тэкстам ролі. Што рабіць? Акцёр, які, акрамя гэтага, яшчэ і інжынер, урач, слесар, настаўнік, прыйшоў са сваёй асноўнай працы, прыйшоў зморан, часта эмацыянальна спустошаны. Гэта—будні самадзейнага тэатра. Іншая справа, што гэта трэба пераадольваць. Не падрыхтаваўшыся належным чынам, акцёр можа фактычна сарваць рэпетыцыю. Ён павінен гэта разумець, яго неабходна пераканаць у гэтым з усёй рашучасцю.

Бывае і такое. Якая-небудзь сцэнка будучага спектакля доўга рэпетыравалася і вось яна, нарэшце, зроблена і ўжо «гучыць», нават уражвае. Яе дзеянне дакладна пабудавана і арганізавана, пастаўлены ўсе неабходныя акцэнты, адобраны прыстасаванні і г. д. Карацей кажучы, сцэна па разліках рэжысёра можа «ісці ў прагон». І рэжысёр са спакойнай душой пераходзіць да наступнай сцэны, упэўнены ў тым, што малюнак папярэдняй зафіксаваны выканаўцамі. Якім жа бывае яго здзіўленне, гнеў і роспач, калі на бліжэйшым прагоне выяўляецца, што сцэна ў акцёраў «не ідзе», яны пра ўсё забыліся. Усё трэба пачынаць спачатку.

Гэта горкія хвіліны для рэжысёра. Нядобрым словам успамінае ён тут і «аматарства», і пракляты «дылетантызм».

— Вось яна, самадзейнасць, — мармыча ён, пасылаючы моўчкі праклёны. — Малпіна праца! Бязглуздзіца!

Сказаўшы так, рэжысёр можа махнуць на ўсё рукою. І тады яму і на самай справе няма чаго рабіць у народным тэатры. Калі ж ён да гэтага тэатра прырос сэрцам, дык, усміхнуўшыся, скажа:

—Добра, ліха з вамі, пачнём усё спачатку!

І, закасаўшы рукавы, прыступіць зноў да чарнавой працы.

Так, акцёры самадзейнага тэатра, як правіла, дрэнна фіксуюць, і рэжысёр павінен быць да гэтага гатовы. Уменне фіксаваць малюнак ролі — адметная ўласцівасць прафесіянала, набытая ў выніку штодзённага трэніга, рэпетыцый, выступленняў у спектаклях — усяго таго, што складае рэжым прафесіянальнага акцёра. У самадзейным тэатры рэпетыцыі бываюць не штодзённа, на вучэбныя заняткі—трэнінг—як правіла, часу не хапае, спектаклі ідуць не так ужо часта. Таму акцёр самадзейнага тэатра толькі ў асобных выпадках валодае здольнасцю надзейна фіксаваць знойдзенае. Звычайна рэжысёр павінен валодаць немалым цярпеннем, каб у выніку шматразовага паўтарэння дабіцца замацавання малюнка мізансцэны, скразнога дзеяння, тэмпа-рытму і г. д. Карацей кажучы, тых элементаў сцэнічнай праўды, на якіх пабудавана творчая задума спектакля.

Рэжысёр сутыкаецца ў народным тэатры з выканаўцамі самага рознага ўзроўню падрыхтоўкі. Іншы ўжо сыграў пятнаццаць—дваццаць роляў, прачытаў мноства кніжак пра тэатр і разумее рэжысёра, што называецца, з паўслова. У Слонімскім народным тэатры гэта, напрыклад, К. Палішчук, А. Клімовіч, Р. Міско, Л. Завацкая, А. Малік, В. Шчарбакоў, А. Цярэнін, П. Куршук, Л. Літвіценка. Па сваёй тэатральнай дасведчанасці яны, наогул, мала ў чым уступаюць прафесіяналам.

Але ёсць і іншыя. У асноўным—пачаткоўцы. Нярэдка гэта людзі здольныя, але ім не хапае агульнай культуры, каб зразумець складаныя псіхалагічныя задачы, якія перад імі ставіць рэжысёр.

Ах, як хочацца іншы раз ускіпець, высмеяць накемлівага выканаўцу. Здзіўляешся, як ён не разумее такіх простых — так здаецца рэжысёру—рэчаў! Напрыклад, не разумее, што такое «другі план», не здольны вылучыць галоўную адзнаку прапанаваных абставін і правільна яе ацаніць, правільна паставіць націск у фразе.

Прасцейшыя рэчы? А як сам рэжысёр іншу да іх разумення? Колькі разоў ён, будучы студэнтам, станавіўся ў тупік перад тымі задачамі і патрабаваннямі, якія выстаўляліся перад ім яго настаўнікамі?

Акцёра самадзейнага тэатра вельмі лёгка пакрыўдзіць. Ён больш ранімы, чым прафесіянал. Для апошняга рэжысёр—гэта перш за ўсё непасрэдны начальнік, ад яго волі, патрабаванняў залежыць поспех агульнай справы, а ў большасці выпадкаў і асабісты творчы лёс акцёра. Прафесіянал многае, вельмі многае гатовы выцерпець ад рэжысёра, гатовы паступіцца і самалюбствам у імя агульнай мэты.

Для аматара работа над роллю звязана перш за ўсё з асалодай. Ён згодны працаваць, шмат працаваць, але гэта праца для яго непарыўна звязана з асалодай, якую дае творчасць. Для яго працэс работы над спектаклем расягнуты звычайна на значна больш тэрмін, чым гэта магчыма ў прафесіянальным тэатры, для яго гэты працэс больш важны, чым мэта. І калі рэжысёр, не разумеючы такога псіхалагічнага фактару, пазбаўляе працу аматара гэтага найважнейшага для яго адчування калі ён дазваляе сабе на рэпетыцыі праяўляць снабізм, пагардлівасць і нецярпімасць у адносінах да няўмеласці акцёра, аматар губляе веру ў сябе, а разам з ёй і цікавасць да самадзейнага тэатра.

Неверлікая аналогія. Ідзе ўрок у маленькай сялянскай школе. У адзіным яе пакоі за партамі сядзяць пучні розных класаў, скажам—ад першага да трэцяга. Настаўнік вядзе агульны ўрок. Кожнаму — сваё заданне, да кожнага свой падыход, апраўдны ўзроўню яго падрыхтоўкі. І ўсё гэта робіць так, каб цікава было ўсім і ўсім было зразумела. Цяжка? Вельмі. Але ж мецаніта на такім прынцыпе будуецца работа рэжысёра народнага тэатра. Гэта накладвае значны адбітак і на прафесіянальныя рысы рэжысёра валкам, як мне здаецца. Рэжысёр становіцца габрэйшы, больш уважлівы да людзей, з якімі робіць агульную справу.

Аб выхаваўчай ролі рэжысёра-кіраўніка творчага калектыву гаворыцца і пішацца нямала. У самадзейным тэатры гэты аспект мае асаблівы сэнс і асаблівы характар. Нельга, мне думаецца, немагчыма ператварыць рэпетыцыю ва ўрок. Праводзіць спецыяльныя навучальныя заняткі яшчэ цяжэй. Чаму аматар ідзе ў народны тэатр? Ён хоча іграць, займацца творчасцю. У гэтым ён знаходзіць велізарную радасць. У самадзейны тэатр ён і прыйшоў, каб мець магчымасць задаволіць духоўную патрэбу здольнага чалавека. Гэта ўсім нам неабходна зразумець. Але ў той жа час неабходна неяк пастаянна вучыць артыста, усебакова ўздзейнічаць на яго асобу. І рабіць гэта трэба тонка, каб не надакучаць сваімі павучаннямі і парадамі.

Асабіста я за дзесяць гадоў працы з адным калектывам засвоіў для сябе адзіны спосаб уздзеяння. Мне здаецца, што рэжысёрская задума спектакля, усебакова і падрабязна распрацаваная граней, адкрывае такую магчымасць. Тры—чатыры месяцы рыхтуецца ў нашым народным тэатры новы спектакль. Увесь гэты час самадзейныя акцёры жывуць думкамі, уяўленнямі, эмоцыямі, звязанымі са светам ідэй персанажаў гэтага спектакля. Творчая задума рэжысёра павінна быць пры гэтым настолькі змястоўнай, каб на кожнай рэпетыцыі адкрываліся ўсё новыя грані драматургічнага твора.

Рэжысёр народнага тэатра часцей за ўсё пачынае сваю, калі можна так сказаць, кар'еру як бы нанава. У дапамогу яму дадзены толькі загадчык пастановачнай часткі (па палажэнню аб народных тэатрах) і... вялікае поле дзейнасці. Так, неабмежаваныя магчымасці дае праца ў народным тэатры. Прыходзячы ў калектыў, каб атрымаць радасць творчасці, новыя веды, навучыцца разумець мастацтва, артысты самадзейнага тэатра вельмі інтэнсіўна ўспрымаюць усё, што робіць іх лепшымі, выхаванымі, прыгожымі.

І ў рабоце з самадзейнымі артыстамі гэта, бадай, самае галоўнае. Тое, што ўзнагароджвае нашу нялёгкую працу.

Мікалай ВАРВАШЭВІЧ,
рэжысёр Слонімскага народнага тэатра, заслужаны работнік культуры БССР.

ВЕРНІСАЖ МАЛАДЫХ

ПАРА ШЧАСЛІВАЯ, ПАРА АДКАЗНАЯ

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ мастацтва рэспублікі вызначаецца шырокім ростам маладых талентаў. Выходзяць на шырокую арэну мастацкага жыцця Беларусі здольныя жывапісцы А. Марачкін, В. Марковец, графікі У. Савіч і М. Селяшчук, скульптары Л. Давідзенка і Г. Гаравая, мастакі габелена Н. Пілюзіна і В. Крывашэева і многія іншыя.

На творчасці аднаго з іх, графіка Уладзіміра Савіча, спынім увагу. Яму ўсяго 25. Нарадзіўся на Лагойшчыне. Пераняўшы матчыну здольнасць ляпіць цацкі, аздабляць узорам сурвэткі і абрусы, ён з дзяцінства пачаў маляваць. Вучыўся ў Рэспубліканскай спецыяльнай школе- інтэрнаце па выяўленчаму мастацтву і музыцы, потым — у Беларускім дзяржаўным тэатральна- мастацкім інстытуце, які скончыў у мінулым годзе.

Дыпломная работа (кіраўнік дацэнт В. Шаранговіч) — мастацкае афармленне класічнага твора беларускай драматургіі «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча — прынесла яму першы вялікі поспех. На Усесаюзнай рэтраспектыўнай мастацкай выстаўцы дыпломных вузаўскіх работ ілюстрацыі У. Савіча былі адзначаны дыпломам Акадэміі мастацтваў СССР.

Менавіта ў гэтых работах, выкананых у класічнай тэхніцы літаграфіі і пэндзлевага малюнка, мастак выяўляе сваю творчую канцэпцыю, якая тоіцца не толькі ў індывідуальнай манеры, у выбары любімых тэм, але і ў адносінах да сучасных графічных сродкаў у афармленні кнігі. (Дарэчы, да «Пінскай шляхты» мастаком было афармлена каля дзесятка кніжак). Мастак не імкнецца ствараць самастойныя графічныя серыі, не імкнецца выказацца на агульную з пісьменнікам тэму (як робяць цяпер многія аўтары), а стварае ілюстрацыі, што ўзнаўляюць асобныя эпізоды літаратурнага твора, настройваюць чытача на адпаведны эмацыянальны лад, раскрываюць багатыя грані характараў, створаных драматургам. Гэтаму служыць і яркі нацыянальны тыпаж, і багаты народны касцюм Палесся, і дакладна знойдзеныя лінія, пляма, колер. Разам усе гэтыя кампаненты ствараюць своеасаблівы рытм, мелодыю малюнка, сугучную творчасці класіка беларускай драматургіі.

Дададзім, што актывізацыя апавядальнасці ў літаграфіях У. Савіча не азначае звароту да сюжэта ў старым значэнні гэтага прыёму. Гэта, можна сказаць, працяг яго жыцця, у якім назапашаны вопыт ягонага настаўніка В. Шаранговіча, а таксама такіх выдатных мастакоў, як А. Кашкурэвіч і А. Паслядовіч. Творчасць Уладзіміра Савіча шмат у чым абумоўлена культурнай спадчынай. Створаныя ім ілюстрацыі да кніг, экслібрысы, станковыя аркушы, прысвечаныя стваральніку нацыянальнага прафесіянальнага тэатра Ігнату Буйніцкаму, сведчаць пра шчырую захопленасць мастака духоўнымі каштоўнасцямі беларускага народа, яго класічнай літаратурай, песенным фальклорам, казкамі, баладамі, народным дэкаратыўным мастацтвам. Не выпадкова мастацкае афармленне альбома графічных работ, прысвечанага 90-годдзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа, было адзначана дыпломам Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю.

Уладзімір Савіч.

Апошняя работа мастака ў кніжнай графіцы — ілюстрацыі да зборніка трох беларускіх народных казак: «Як Іван чарцей перахітрыў», «З рога ўсяго многа», «Прагны багацей» (зборнік рыхтуецца на англійскай мове). Калі параўнаць яе з папярэднім афармленнем беларускіх казак, у прыватнасці — «Разумнай дачкі», то бачыш, як вырас мастак, як скандэнсаваўся яго творчы вопыт. Тут У. Савіч вырашае адразу ўвесь комплекс задач, што стаяць перад мастаком кнігі — ад ілюстрацыі да фармата кніжнага блока і яго ўнутранага макета. Нельга сказаць, што дагэтуль яго не хвалявала праблема цэласнага, комплекснага падыходу да афармлення кнігі, але менавіта ў апошняй рабоце яму ўдалося амаль поўнасцю яе рэалізаваць. Ужо вокладка з выявай галоўнай дзейнай асобы казкі ўводзіць нас у чароўны свет фальклору.

Мастак вельмі арыгінальна, можна сказаць па-філасофску, разважае пра мастацкае вырашэнне вокладкі. «Вокладка, — мяркуе ён, — гэта нешта накшталт вільчака сялянскай хаты, які вабіць не толькі харастовам дэкору, але нясе важную канструктыўную і эмацыянальна-семантычную функцыю, перадае дух народнай архітэктуры. Гэтак жа і вокладка павінна перадаваць унутраную сутнасць літаратурнага твора, настрой, інфармаваць пра змест кнігі, але не абавязкова ў адэкватных вобразах».

Ян і ў ранейшых ілюстрацыях да выданняў беларускага фальклору, у гэтай кнізе У. Савіча выразна чуюцца «вясновыя інтанацыі», непасрэднасць і чысціня казачных персанажаў. Дынамічныя і экспрэсіўныя, з упісанымі выявамі людзей, фантастычных істот, з элементамі сялянскага дойлідства, раслінным узорам, ілюстрацыі раскрываюць вобразна-мастацкі змест кожнай казкі, не парушаючы агульнай структуры зборніка. Яны нагадваюць своеасаблівыя мізансцэны народнага батлеечнага тэатра.

Трэба сказаць і пра ашчаднае стаўленне У. Савіча да колеру. Звычайна гэта карычневы, чорны, цёмна-сіні. Яны ствараюць агульны фон і эмацыянальны настрой дзеяння, а пасля ўжо выяўляюць прадмет і падкрэсліваюць сам малюнак.

Зараз мастак рыхтуе творы да выстаўкі, прысвечанай 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Гэта будуць каляровыя літаграфіі з выявамі дзеячаў беларускай культуры.

Для Уладзіміра Савіча надышоў час, калі вызначаецца ўласная тэма і асабістыя адносіны да свету. Гэта надзвычай складаная, але і шчаслівая пара ў жыцці кожнага мастака.

Міхась РАМАНЮК,
кандыдат мастацтвазнаўства.

Лісты да «Пінскай шляхты» В. Дуніна-Марцінкевіча.

ПАСЛЯ СУСТРЭЧЫ

У плане работы клуба майстроў самадзейнай творчасці горада Барысава намечаны сустрэчы з майстрамі беларускага выяўленчага мастацтва. Нядаўна адбылася другая сустрэча. Група разьбяроў па дрэву сустракалася са скульптарам С. Вакарам. Сяргей Міхайлавіч пазнаёміў самадзейных мастакоў з тэхналогіяй разьбы па дрэву—пачынаючы з нарыхтоўкі дрэва, яго апрацоўкі і заканчваючы падборам інструменту, паказаў на практыцы капіраванне аб'ёмных форм з дапамогай спецыяльнага прыстасавання, расказаў пра свае творчыя планы. Нягледзячы на цеснаватую майстэрню скульптара, у ёй шырока і свабодна творчай думцы. Навокал мноства работ, злепкаў, эскізаў, макетаў, яны запаўняюць памяшканне ад падлогі да столі. Асаблівае ўражанне на нас зрабіў бюст Ф. Э. Дзяржынскага (фрагмент помніка ў г. Дзяржынску), выкананы ў гліне, які ўвасабляе вобраз палымянага рэвалюцыянера, вернага саратніка У. І. Леніна, і партрэт Максіма Багдановіча—адухоўлены, поўны лірызму, абаяльны. Цікава задумана і пастаўлена фігура, яна нібы ў руху,—з якога боку ні паглядзіш, бачыш яе ў новым малюнку, у новай выяве.

Рыхтуючыся да сустрэчы з М. Данцыгам, мы ўважліва пазнаёміліся з творчасцю мастака, запасліся манаграфіяй пра яго творчасць, рэпрадукцыямі яго работ. Нам хацелася пазнаёміцца бліжэй з карпатлівай, часам пакутлівай працай, якая папярэднічае стварэнню твора; гэта эцюды, малюнкі, накіды, якія, як правіла, нідзе не выстаўляюцца, акрамя майстэрні мастака. Гэта інтымны свет, які дае найбольш поўнае ўяўленне пра творчасць аўтара. Ад сустрэчы з мастаком А. Шыбнёвым у памяці засталіся дзесяткі палотнаў, убачаных намі ў майстэрні. У майстэрні Я. Красоўскага нас здзівіла багацце эцюдаў, карцін, накідаў, эскізаў, у якіх кіпела, бурліла, хвалявалася жыццё. Падумалася пра лёс карцін, створаных мастакамі. Лепшыя з іх займаюць сваё месца ў музеях, набываюцца ўстановамі культуры, нават асобнымі аматарамі мастацтва. Але калі карціна ствараецца для таго, каб быць аднойчы паказанай на чарговай выстаўцы, а потым заняць сваё месца ў запасніках музея і на гэтым, па сутнасці, скончыць сваё існаванне, такой рабоце і яе аўтару не пазайздросціш.

Знаёмячыся на выстаўках з творамі Л. Шчамялёва, уяўляеш, што іх аўтар— малады, таленавіты і своеасаблівы мастак. Пры сустрэчы з ім у яго майстэрні мы ўбачылі сталага мужчыну, але адчуванне маладосці і адметнасць таленту не знікла, яно зыходзіла ад яго карцін, яго своеасаблівага бачання свету, адносін да мастацтва, людзей, да выбару тэмы... Яго палітра на дзіва свежая, маляўнічая, святочная, у ёй ёсць нешта тэатральнае. Здаецца, калі б Шчамялёў аформіў спектакль, гэта было б яркае відовішча. Шчамялёва ні з кім не зблытаеш, ён знайшоў сябе, свой почырк, сваю мову ў мастацтве, даступную і зразумелую кожнаму.

І Данцыг, і Шчамялёў прайшлі выдатную школу жывапісу, заснаваную на сацыялістычным рэалізме. Нам давялося ўбачыць усяго толькі па адной студэнцкай рабоце — «Партрэт натуршчыцы», выкананы Данцыгам у адзін прыём, і «Натуршчыка», напісанага Шчамялёвым. Гэтыя работы больш за ўсё расказалі нам пра складаны шлях, які давялося пераадолець мастакам, каб знайсці сябе, свой шлях у мастацтве, сваю творчую індывідуальнасць.

Прыемна адзначыць, што нашы сустрэчы становяцца традыцыйнымі, мастакі адказваюць на многія пытанні, вырашаюць сумненні, стымулююць і накіроўваюць творчасць самадзейных мастакоў, робяць яе больш асэнсаванай, мэтанакіраванай. З іх дапамогаю аматарам мастацтва ўдалося выступіць на гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх выстаўках і паказаць свае работы на заключнай выстаўцы ў Маскве. Лаўрэатамі ўсесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных сталі члены нашага клуба: слесар-наладчык Г. Ганчаронак, маляр П. Казявін, служачы М. Таркін і інш.

С. МІРЗАЯН,
старшыня клуба майстроў самадзейнай творчасці г. Барысава.

ТУДЭМА — СЮДЭМА...

Васіль ХОМЧАНКА

СВЕДКА

ДАЧНЫ ДЭТЭКТЫЎ

Прачнуўшыся раніцай, Барыс Макаравіч з гарышча сваёй дачы ўбачыў побач з лесам кучу смецця. Нейкі шафёр прывёз яе ноччу з горада і зваліў у такой прыгожай мясціне.

Спачатку Барыс Макаравіч абурыўся. А потым зашчымела надзея, што ў той кучы можна знайсці нешта патрэбнае для дачы: дошкі, цэглу, дрот, кавалкі шыферу, бо смецце, як ён разгледзеў, было будаўнічае.

«Вось бы цэглы знайсці, — пажадаў Барыс Макаравіч, — ганак падрамантаваць».

Барыс Макаравіч хуценька злез з гарышча і падаўся да кучы. Яшчэ не дайшоўшы да яе, ён з радасцю ўбачыў, што там сапраўды была цэгла. Недзе штосьці рамантавалі — жылы дом, кантору, ці магазін, — і ўсе адыходы вывезлі сюды. Без доўгага роздуму Барыс Макаравіч, азіраючыся на дачны масіў—ці не бяжыць яшчэ хтонебудзь пажывіцца,—пачаў выбіраць з кучы і адкладваць убок цэглу. Усе цагліны, што ляжалі зверху, ён сабраў. Заставалася дастаць з сярэдзіны кучы. З яе тырчаў канец маснічыны. Барыс Макаравіч узяўся за яго і пацягнуў. Маснічына падалася, смецце з яе асыпалася і...

І Барыс Макаравіч убачыў голую жаночую руку.

Барыс Макаравіч адскочыў, заплюшчыў вочы, расплюшчыў, паміргаў — ці не здалося яму, ці не трызніцца? Не, рука была рэальная, самая сапраўдная жаночая рука, з прыгожымі пальцамі і наманікюранымі пазногцямі.

Усё захаладзела ў сярэдзіне Барыса Макаравіча, млосна зрабілася. Задрыжалі ногі.

Першае, што інстынктыўна прыйшло яму ў галаву — хутчэй адсюль. І ён джгануў у лес. «Хоць бы ніхто не ўбачыў, што я тут быў»,—думаў ён са страхам.

Пакуль Барыс Макаравіч даваў кругаля да сваёй дачы, у галаву лезлі самыя страшныя здагадкі і думкі: жанчыну забілі, укінулі ў кузаў, заваліли гэтым смеццем і прывезлі сюды. Хто яе забіў? Муж-раўнівец ці палюбоўнік? А мо хуліган? Хутчэй за ўсё рабаўнік, бо на руцэ —яна была левая—ні гадзіннікa, ні пярсцёнка. Мо за гэты пярсцёнак і забіў.

Адбегшы ад таго страшнага месца ўжо далекавата, Барыс Макаравіч спыніўся, супакоіў дыханне і пачаў думаць, што ён усё-такі павінен зрабіць. Урэшце, было толькі два варыянты. Першы — ціхенька вярнуцца на дачу і маўчаць. Другі—неадкладна пайсці ў пасёлак і па тэлефоне паведаміць у міліцыю, выканаць, так сказаць, свой грамадзянскі абавязак. Стаць сведкам па гэтай страшнай справе. Ён пачаў ужо схіляцца да гэтага другога варыянту, але, узважыўшы ўсе за і супраць, катэгарычна адмовіўся ад яго і спыніўся на першым: маўчаць.

Вярнуўся ён на дачу не той дарогай, якой выйшаў, а з тыльнага боку, ад суседскіх дач. Дома стараўся не думаць пра ўбачанае. Нават насвіставаў розныя вясёленькія мелодыі, хацеў забыцца і супакоіцца. Але скіраваць ход думак на іншае не змог. Перад вачамі ўпарта стаяла тая жаночая рука. Месца сабе не знаходзіў Барыс Макаравіч. А, можа, сагразуды пайсці і пазваніць у міліцыю? Сябе альбо зусім не называць ці назвацца іншым, выдуманым прозвішчам. Лёгка і проста.

І Барыс Макаравіч, павесялелы, накіраваўся да дзвярэй. Пазвоніць ён зараз, прыедзе міліцыя і няхай разбіраецца. Цікава, з чаго пачнуць следства? Канечне ж, прыедуць следчы, эксперт, праваднік з сабакам. Усё агледзяць вакол, сфатаграфуюць, пусцяць сабаку па слядах... Па слядах? Па чыіх?

Барыс Макаравіч нібы аб штосьці апёкся. Спыніўся, сеў. Па чыіх жа слядах пойдзе сабака? Вядома ж, па слядах таго, хто там быў.

«Дык я ж і быў там! — ледзь не закрычаў Барыс Макаравіч. —Па маіх слядах пойдзе сабака».

Халодны пот выступіў на лобе. Ад страху зноў задрыжалі калені. Што рабіць? Пачаў прыпамінаць дэтэктыўныя фільмы, якія вельмі любіў глядзець. Успомніў, як адзін забойца знішчаў свае сляды. Узрадаваўся, ускочыў, выбег з хаты. Ён рашыў знішчыць такім жа спосабам і свае сляды.

У кладоўцы схапіў бутэлечку карбафосу, пачак тытунёвага пылу—сродкі супраць розных садовых шкоднікаў — і пабег да той кучы смецця. Там рассыпаў вакол тытунёвы пыл, выліў увесь смярдзючы карбафос і вярнуўся на дачу. Супакоіўся: цяпер ніводны сабака не возьме яго след.

Дома ўзлез на гарышча і сеў каля акна. Сядзеў і чакаў, калі хто падыдзе. Прагнуў гэтага прыходу.

А да кучы, як на тое ліха, ніхто не падыходзіў. Усе дачнікі занятыя, усе стаяць на карачках і полюць грады. А каб уведалі, што там ёсць цэгла ды кавалкі шыферу, пабеглі б навыперадкі.

Апоўдні ён злез з гарышча, каб нешта ўкінуць у рот, бо яшчэ нават не снедаў. Калі ж зноў забраўся на сваё седала, то ўбачыў каля кучы трох хлопчыкаў. Двое разварушвалі кучу, трэці браў складзеныя Барысам Макаравічам цагліны і кідаў, цаляючы ў вялікі белы валун, што ляжаў паблізу.

«Нарэшце», — узрадаваўся Барыс Макаравіч і хуценька збег з лесвіцы.

Да кучы хоць і ішоў хутка, але рабіў выгляд чалавека, што выйшаў палюбавацца наваколлем.

Хлопчыкі, як па камандзе, пабеглі насустрач Барысу Макаравічу.

«Спяшаюцца паведаміць пра труп», — ухваліў ён іх намер. А калі яны падбеглі бліжэй, Барыс Макаравіч убачыў, што першы хлопчык нёс тую самую жаночую руку і размахваў ёю, як палкай. Барыс Макаравіч спыніўся ад жаху і разявіў рот.

Хлопчыкі яшчэ наблізіліся, і Барыс Макаравіч раптам разгледзеў, што рука ў сярэдзіне пустая. «Ад манекена,—ледзь не ўскрыкнуў Барыс Макаравіч і сеў на траву. — З магазіна. Гэта ж яго і рамантавалі».

А калі хлопчыкі аддаліліся, Барыс Макаравіч успомніў пра цэглу, якую яны паваскідалі і пабілі, закрычаў услед:

— Басота, бандыты! Я вам пакажу, як раскідваць чужое дабро.

І злосць, сапраўдная, непадробленая злосць апанавала Барыса Макаравіча.

— Ты не змог бы змяніць кашулю?

— Прыдумаў ім такія шахматы для пачынаючых!



— Відаць, тут нейкая памылка. Я сапраўды майстар спорту, але па шахматах.

— Я ж папярэджваў цябе, тата, што шахматы патрабуюць пэўнага разумовага развіцця!

— Як гэта гадзіну чакаеш майго ходу? Зараз жа твой ход!

—... і тады ён пайшоў канём з be на c3, а той сланом з c8 на g4, той зноў з f3 на c5...

Малюнкі Гвідона МІКЛАШЭЎСКАГА.

Часопіс «Польское обозрение».

Георгій ЮРЧАНКА

ЭПІГРАМЫ

Генадзю КЛЯЎКО

Эх, і хто ж набыць спанадзіў
Кніжку новую Генадзя,
Бо ў ёй столькі пацалункаў,
Што няма ад іх ратунку.

Варлену БЕЧЫКУ

Без сучка і без задорыны
Ён прайшоў шляхі паскорана:
Смелым крокам аналітыка
Ад празаіка да крытыка.

Віктару ДАПЛІДУ

Вясна... Вясна... Ды пікне
просінь,
Гурбой ляцяць хрушчы ў сады.
Нячутным крокам прыйдзе
восень.
Ці будуць важкія плады?..

КААРДЫНАТЫ ВЕЧНАСЦІ

ПАРОДЫЯ

Мы ішлі адваротна адзін
аднаму —
насустрач...
. . . . . .
Слухаю внямелы
нечую споведзь сваю.

Алесь РАЗАНАЎ.

Існуе ва мне няіснае
калодзежам перакуленым,
гляджуся ў яго сланечнікам,
як у люстэрка сонечнае,
слухаю вострым позіркам
споведзь сваю чужую,
нема крычу спіною,
уяўляючы ўяўнае.
Бачу слыхам свой крык
і спектральна аналізую,
ідучы па нутры сваім,
быццам расту — расту назад
да парушынкі ў воку.
Маё вока — тваё
і я ў ім нагамі ўгору,
а ты нада мной галосіш
та адарваным гузіку.
Гузік мая рука
цісне ў далонь да хрусту,
доўгія пальцы свае
адваротна распростваючы.
Кожны палец з мяне
высмоктвае мудрую ісціну,
шукае няўцямна,
навобмацак
у глыбачэзным небе
каардынаты вечнасці.

Пятро СУШКО.

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАСКОПКІ

Светлая асоба з чорнай душой.

З характарыстыкі Каіна, напісанай Авелем.

Праекціроўшчыкам лягчэй, чым будаўнікам: ім няма чаго збываць.

Знойдзена пад падмуркам Пізанскай вежы.

Каб злезці з каня, спачатку трэба на яго сесці.

Жарт, запісаны ў Чапаеўскай дывізіі, але ў свой час не абнародаваны.

Калі двое не могуць падзяліць паміж сабой улады, тады прыходзіць трэці і забірае яе.

З запісной кніжкі Цэзара.

Лягчэй перамагчы тыгра, чым самога сябе.

Прымаўка старажытнаўсурыйскіх палаўнічых.

А конь усё ж быў драўляны!

Выкрыкі траянцаў у час пакарэння рымлянамі Трої, запісаныя невядомым аўтарам.

Адкапаў і падрыхтаваў да друку
У. ПРАВАСУД.

ЦЭГЛА І ЯЙКА

На будоўлі ў час снядання
Муляр Клім на рыштаванні
Спрабаваў разбіць яечка.
Як ні стукне аб цагліну—
З той цагліны —
Палавіны
Разляцяцца на бакі.
— Ах вы, каўка, слабакі!
Хоць не лупленае еш,
Бо ўсю цэглу пераб'еш!

Міхась СКРЫПКА.

ГЭТЫ МАЛАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

АБНАДЗЕІЦЬ — ажаніць на Надзеі.
ДАЛЯГЛЯД — празорлівы чалавек.
ІГЛІЦА — швачка.
МАРЫВА — вялікая мара.
ПУСТАЗЕЛЛЕ — апарожненая бутэлька.
ПАКАЗЧЫК — гід.

М. ШКЛЯР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі

Індэкс 63856. АТ 01304

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыемная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33 24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33 24 62, аддзела пісем і масавай работы — 33 22 04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77 65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН, Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН(намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЕД, Віктар ПРАТАСЕНЯ, Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК, Рыгор ШЫРМА.

Адказны сакратар Мікола ГІЛЬ.